«КАЛОСЬСЕ»—беларускі літаратурна-навуковы і грамадзкі часапіс. Выходзіць раз у тры месяцы. Складка ў год—2 зл.
— Асобная кніжка — 50 гр. Заграніцу 3 зл. 20 гр. —
Адрыс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вул. 1—2.
«KAŁOŚSIE» — białoruski literacko - naukowy i społeczny kwartalnik. — Wilno, Zawalna 1—2.
«KALOŚSIE» — blancruthenienne revue trimensuelle litteraire et scientifique. Wilno, Zawalna 1—2. Pologne.

Зьмест кніжкі 3 (16) „Калосься“

Вокладку запраектавала і выканала В. Пракаповічанка

Друкарня ім. Фр. Скарыны, Вільня, вул Завальная 1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ І ГРАМАДЗКІ ЧАСАПІС

Кніжка 3 (16) 1938 г. Год IV

ХВЕДАР ІЛЬЛЯШЭВІЧ

* * *

Многа песьняў згубілі мы ўжо —
ўсё жыцьцё так складалася неяк —
у наш песенны звонкі дажон
вецер цьвету нямала разьвее.

Што-ж? Радзіліся ў час такі мы,
калі поле сьлязьмі ўскаласіла.
Ня зьлічыць нам у роднай зямлі
неаплаканых песьняў-магілаў.

І няведама, колькі яшчэ
абляціць на шляхох белацьвету...
З кожным шагам цяжэй і цяжэй
і ў імгле ледзь віднеюцца мэты.

Але песьню нясем мы адну
у ўраджайную даль Беларусі, —
песьню яснаму, сьветламу дню,
што прыйсьці да нас некалі мусіць.

Нам ня жаль, што раскінулі ўсе
свае сны ў нетры жудаснай гэтай —
мы яшчэ прапяем у расьсвет
аб цьвітучых садох і палетках.

МІХАСЬ ВАСІЛЁК

Разьвітаньне

I

Адзін з сваімі думкамі ляжаў ён у невялічкай, прыкульгнуўшай на пярэдні вугал, адрыне. Пахла сьвежым сенам і тухляцінай старой, падзіраўленай саламянай страхі, затканай сеткамі павучыньня. Думаў аб доме, аб сям'і — старэнькай матулі з яе ўнукамі... Але фабрыка, вось гэнае фабрычнае жыцьцё на вёсцы, у якім апынуўся і ён сам, найбольш праймала яго. Вёска, дзе знаходзілася дыхтавая фабрыка, па народнасьці была выключна беларуская. Былі адзінкі між моладзі на'т даволі сьвядомыя, былі і несьвядомыя. Бачыў Андрэй, за свой кароткі час побыту на службе, як дужа несправядлівасьцяў, надужыцьцяў, эксплёатацыі адбывалася ў фабрыцы над гэтымі працавітымі, загнанымі дзяцьмі вёскі. Хварэў душой за гэткае ненармальнае зьявішча. Трэба было ўзварушыць, узмацаваць веру ў свае сілы, абудзіць сьвядомасьць, каб маглі ўявіць, адчуць — карысьць арганізацыйнага жыцьця, чаго ня было і з чаго карыстаў фабрыкант. Хацелася памагчы. І ён прыкладаў усю сваю маладую энэргію, сваю шчырую душу. Палюбілі яго хутка ўсе, апрача тугіх да сьведамасьці адзінак, верных, цёмных служкаў фабрыканта.

— „Браты, — гаварыў ён ня раз, сваім прыемным голасам, у якім чулася пэўнасьць і нейка вабячая да сябе бязспрэчнасьць, — мы ня знаем добра фабрычнага руху, мы далёкія ад таго сьведамага поступу гарадзкіх работнікаў, якія сяньня салідарна могуць кіраваць сваімі прафэсыянальнымі справамі, даючы гэтым знаць сваім працадаўцам, што з вялікай працоўнай сілай трэба лічыцца, што крыўды больш яна не пацерпіць. Чытайма больш газэтаў — вучэмася, пазнавайма, як вядуць барацьбу за свой дабрабыт перадавыя людзі працы, пільна сочым за кожным сваім шагам, папраўляючы памылкі, адзначаючы здабыткі. Мы зьяўляемся адзінай працоўнай сям'ёй, якая даўно вядзе барацьбу за чорны кавалак хлеба, за цьвёрдае, пэўнае месца на зямлі. Не чакайма, браткі, каб хтосьці прыйшоў ды разжаваўшы ўсё сказаў: ежце, калі ласка. Ёсьць паміж нас сьведамейшыя, здальнейшыя, каторых абавязкам — дапамагаць другім, разьвівацца ўсебакова, разьвівацца культурна. За што мы сяньня працуем? Гэта-ж мізэрная зарабковая плата, не змагла-б нас нават пракарміць, каб мы ня йшлі да працы кожны з сваей лустай чорствага хлеба. У цара бацюшкі мы чорныя рабы, да якіх няма літасьці. Мы кладзём маладыя сілы, каб набіць кішэні гэтага гаспадара фабрыкі"...

II

Замоўклі на вёсцы сьмех і песьні дзяўчат, сьціхлі задорныя пераборы вясковага гармоніка. Месяц паказаўся з-за хмар, каб бліснуўшы сваім голым цеменем — зноў схавацца.

Старому Нупрэю з бярозавай люлькай у зубах здавалася, седзячы пад хатай, што гэта „заскала" — як ён называў месяц, — чагосьці саромліва ўсьміхаецца. Выняў з зубоў люльку, азірнуўся і сплюнуў. Убачыў дзед пад ценьню маладой кучаравай ліпы дзьве постаці — „парачку." — „Бадай вас абнагліла — забарматаў устаючы стары—мне-ж гэта й не да догадзі — цмокае нешта, ды цмокае... Думаў, Янчукоў Хведар сваёй жмудай едзе пасмыкваючы, ажно во... то-ж прыкмеціць з неба гэта лыса морда, скардзіўся дзед на месяц, а я тут пад бокам і... эх старасьць, старасьць"...

За вёскай у балоце моцна закракаў дзікі качур, заглушаючы манатонны жабячы хор. Даядліва зьвягаў тэнарком нечы сабака.

— Ха, ха, ха, — сьціха няслося з пад ліпавай цені.

— Ах, ну з табой, Яначка, заўсёды бяды набярэшся, — казала, — памалей цалуй...

— Нічога, ён таксама быў малады, ды расказваюць, да свае Аўдоцьці ракачка праз падворкі чужыя поўзаў.

— Шкада мне Андрэя, Янка, — выкінуць яго з фабрыкі — задумалі вы гэты, гэты — штрайк...

— Нічога, мы яго пакрыўдзіць не дамо, на зло ён нас ня вучыць, а звольняць яго з фабрыкі, хай звальняюць і нас... Дарагі хлапец. Ты бачыла, як ён сяньня на йгрышчы разьвёў драчуноў? Нейкая, ведаеш, сіла ў яго вачох, у яго натуры, у словах захавана. Здаецца, зайсёды гэткі ціхі, спакойны, а тут раптам калі крыкне: „каго! брат, брата біць — сорам! Бі перш мяне, хай я сваёй кроўю змыю ганьбу"... Задзірака Фомка апусьціў рукі, а яго-ж ніхто яшчэ ня ўнімаў.

— Ведаеш, Янучок, хоць ён і ня зусім прыгожы...

— Вам толькі на першым пляне, каб быў прыгожы — пазнаеш дзявочую натуру...

— Чакай, не перабівай, — хоць ён ня зусім прыгожы, а вабіць нечым да сябе, яму іншыя хлопцы зайздросьцяць. З кожным пажартаваць умее, глупоты ад яго не пачуеш, і што найцікавейшае — ня мае ён ні кала ні двара, як кажуць, а жыве нечым пэўным, моцным, нечым вялікім, непераможным, урачыстым і гэта відаць для яго найдаражэйшае за ўсё Пытаюся раз: скажы, Андрэйка, чым ты так праняты заўсёды? — Ідэяй — кажа. Пытаюся, — што гэта за ідэя? — Гэта, кажа, найдаражэйшая рэч у сьвеце, гэта, кажа, мілейшая нават за каханую дзяўчыну... Нейкі дзіўны, дальпан...

А ты, Янук, ці прамяняў-бы мяне на гэту „ідэю" — га?

— О, не, — мая ты лябёдачка, ты і ёсьць мая найпрыгажэйшая ідэя... Але даволі жартаў, здаецца западае штораз глы-

бей і мне гэта ідэя ў душу... Яго ідэя — праўда вялікая, яго мэты — дабрабыт усіх людзей працы, людзей пакрыўджаных лёсам і царом. Пажывём далей, пазнаеш і ты яго ідэю...

III

Чырвонаю падковаю высоўвалася із-за лесу сонца. З пунсовай на твары радасьцяй лічыла спадак-падарунак ночкі — разсыпаныя па зялёнай кс ўдры брыльянты. На краю невялічкай вёскі, на пышнай бярозе, з расчэсанай на бакі чупрынай — кукавала зязюля. Абуджала поле, абуджала працу. Абудзілі і Андрэя, толькі не зязюля..

Трасьлі сена, дзе ён спаў, падзёртую вопратку. Прыказалі ісьці. Што здарылася, думаў Андрэй, чаго ім трэба. Зьлез з сена, адчыніў наўсьцяж дзьверы гумна. Іскрамі жыцьця і сьмеху цухнула ў твар яму сонца. Засьмяяўся і Андрэй, проста ў вочы гэтаму вялікаму, вабячаму душу цяплінёй сваіх ласк—сьвятлу. Лёгка, бадзёрна ступіў босымі нагамі на траву расістую.

— „Чево сьмеешся“? — запытаўся дзёрскі голас стражніка.

— Не, не зразумець вам — думаў Андрэй, чаго я сьмяюся. Што бачу, што адчуваю я — таго ніколі не адчуць вам.

Раптам сонечны выгляд твару затуманіла хмарай думка. Успомніў старэнькую матулю... Карміў яе сваімі мазалямі. Ужо бачыў яе з раськіданымі ў беспарадку сівымі валасамі, што траплялі пасмамі на разорысты твар. Двое дзетак брата старшага — сіроты жылі разам — карміў усіх ён...

— Андрэйка! куды-ж цябе гэта?

— У госьці, — адказаў жартам. — Бывайце, цётка Ганулля, не спамінайце ліхам, пакуль вярнуся.

Зайшлі ў хату, дзе кватараваўся, каб забраць свае рэчы, якія перш перагледзілі. Вестка аб арышце Андрэя маланкай абляцела вёску. Ля мосту, куды меліся яго вясьці, сабіралася моладзь, каб разьвітацца. Эскорта з двух стражнікаў, а ўперадзе Андрэй, весела ступаючы па жвіраватым пяску босымі нагамі, апускаліся з узгорку да рэчкі. Вінцук Сярмяга выйшаўшы з свае хаты, абапёртай кутом страхі на кучаравую ліпу ды пазіраючай адным вакном як сьляпы жабрак на дарогу, — убачыў Андрэйку, які зачастым заглядаў да яго ў гэту буду на курыных нагах вучыць сына чытаць, што прызнацца яму хутка і добра ўдавалася.

— Андрэйка! — цябе!.. Не дагаварыў, зразумеўшы, куды яго вядуць. Стаяў хвіліну нярухома, толькі відаць было, як мазалістыя, брудныя пальцы, курчава сьціскаліся ў кулакі, пасьля зьняў шапку, ды махнуў ёю ў бок адыходзячага Андрэйкі. На павароце дарогі аглянуўся Андрэй, а ўбачыўшы ўсё яшчэ стырчачага сярод дарогі Вінцуся, застраміўшага вочы ў адну точку,— махнуў весела яму рукой — разумеючы яго думкі.

Ступілі на мост. Моладзь, пераважна фабрычныя хлапцы, штосьці зразу замятусіліся. Чуваць было нейкі дзіўны зглушаны нечы выкрык, пасьля якога, адзін прад другім хлапцы, пакідаючы дзяўчат, выскаквалі наперад, засланяючы дарогу.

Куды гэта цябе, Андрэйка? — пачуўся грубы бас Сёмкі, што лічыўся на фабрыцы пачынальнікам.

— „Што за разгаворы! Ён арыштаваны“.

— За што? — што вам дрэннага зрабіў? — абакраў, забіў каго? — пасыпаліся выкрыкі з натоўпу.

— „Не разгаварваць—даць дарогу“! — зароў іншы стражнік, стукнуўшы ў грудзі першага задзіраку Фомку, якога Андрэй здолеў ужо прывучыць захоўвацца ў кампаніі зусім іначай, як гэта было раней.

Але тут раптам здарылася штосьці нязвычайнае — у Фомкі загаварыў ранейшы гарт. Хвілёвая мітусьня. Э-х-гэ! — вырвалася глуха з Фомчыных пукатых грудзей, нібы ён узьнімаў цяжкі мяшок бульбы...

— Бунтаўшчыкі! — Царбацюш...—ня кончыў стражнік імяні.

Ня кончыў, бо моладзь з зьдзіўленьнем толькі ахнула ўбачыўшы, як стражнікавыя ногі ў цяжкіх падкутых ботах, спружынай прыціснуліся да тылку, пакідаючы за сабой парэнчы мосту. Тут-жа раздаўся ўсплёск вады. Другі стражнік схапіўся за стрэльбу, але ў мамэнт быў абезаружаны, пасьля чаго спрытна сеў на брудны памост, хітра зьмяркаваўшы, што ад зямлі адарваць яго „тлустую хвігуру“ ня так ужо будзе і лёгка, а лёс, які спаткаў яго таварыша, быў зусім не да смаку.

— Што ты зрабіў, Фомка, навошта гэта!

— Даруй, Андрэйка, — адгукнуўся карчасты, сутулы Фомка, усё яшчэ ня могучы ўстрымаць расхваляваных, расхрыстаных грудзей, — даруй, братка, павер — ня мог адмовіць сабе ў гэткай невялічкай прыемнасьці, пакупаць гэтага гада. І нібы перапрашаючым голасам, трохі злагоджваў віну: я яго хацеў толькі спачатку пастрашыць, пасадзіўшы на парэнчы, а ён... відаць, у акрабатах служыў!

— Ха! ха! ха! — панёсься задорны сьмех, глушачы перарываныя пагрозы вынырнуўшага ўжо з вады стражніка.

— Бач, Іванка, як даў нурца, спрытней хіба на'т за цябе. Га?

— Або дзед яго, або ён, у вадалазах напэўна служыў, — зазначыў заўсёды паважны Іванка пад рогат рэшты моладзі.

— Нагавіцы разшпілі, лягчэй плысьці будзе да берагу,— крыкнуў нехта яшчэ.

— Ну, хлопцы, даволі жартаў, хай перасушваецца. Ды пойдзем,— сказаў паважна Андрэй.

Жарты змоўклі.

— Андрэйка, хіба-ж і ты пойдзеш? — Мы цябе ня пусьцім!

— А як-жа-ж наш штрайк будзе? — пасыпаліся пытаньні. Трэба-ж яго да канца давясьці. Мы-ж дзеля гэтага цябе і таго... хочам ня пусьціць...

— Браткі вы мае, радасьць мяне бярэ, што вы становіцеся на тую дарогу, якая вядзе нас і прывядзе да перамогі. Як вясьці штрайк, я вас вучыў, не адступайце ад маіх парадаў — рэшта, пабачыце, усё пойдзе добра, а я — мушу...

І так тут трохі мы накуралесілі, але як тая прыказка кажа „сем бед адзін атвет“. Я напэўна хутка вярнуся, а калі і не вярнуся, хлопцы, дык нічога,— спадзяюся, што найдзецца на маё месца тысяча гэткіх самых яшчэ і лепшых барацьбітоў за нашу волю, за нашу вялікую праўду... Ну, чаго вы насы павесілі, гэтак мы далёка не заедзем. Бадзярней трэба глядзець жыцьцю ў вочы, быць гатовымі спаткаць заўсёды яго неспадзеўкі.

— Во, во, ужо Марыська і сьлязу пусьціла, — азваўся Андрэй — ну, ну, гэта дык зусім з рук вон, а замуж ідучы, чым будзеш плакаць?

— О, яна за свайго Мітрука із сьмехам ды выдзыгам пойдзе — уваткнуў Сьцяпан.

Жарт Андрэя падняў настрой моладзі.

— Ну, дык дай брат, Андрэйка, тваю руку з мазалямі, — азваўся першы Янка, падыйшоўшы разьвітацца. — Не запомнім тваіх слоў — клянёмся гэтым родным убогім палеткам, гэтай камяністай зямліцай, з якой мы зрадніліся кроўю і потам, што тваё зярнё, твая навука і прыклады не прападуць намарна!..

— Праўду Янка сказаў — за ўсіх нас брат сказануў. Мы яго пры аказіі ў дэпутаты ўстрэмім — рэч можа махнуць — дадаў жартаўліва Яўгень.

Моладзь павесялела. Падходзілі, цiснулі руку... І чулася цяпліня, глыбокая, нявымоўная лучнасьць душаў, поўных найлепшых імкненьняў у гэтых маладых істотаў. Усім хацелася ісьці разам з мілым таварышам, ісьці на самыя найгоршыя перашкоды, ня гледзячы на ўсе прыкрасьці, якія маглі-б іх спаткаць.

Дзе наш бас, Сёмка! Песьню давай на разьвітаньне!

— Якую?

— А яго любімую...

Пакаціліся рашучыя, бадзёрныя гукі па зялёнай аксамітнай радзюшцы мурогу:

Разсеялі сон мы, што спалі ад веку
Ўжо знаем, што трэба рабіць,
Што трэба свабоды, зямлі чалавеку,
Што трэба навуку здабыць!..

Цалаваліся з зямлёй, лашчылі яе магутнымі ў сваей прастаце словамі...

Яшчэ раз аглянуўся Андрэй: — „Кружок самаадукацыі“, глядзі Рыгор, каб не падкачаў, — сказаў ён перарываючы песьню. — Вучэмся, мы — пераможам! — былі яго апошнія словы.

М. ВАСІЛЁК

* * *

З міскі поўнага сонца праз край
хтось расплёскаў пунсовую гушчу.
Ў гэты майскі якраз цьветабой
з вішняком вецер ладзіў ігрышча.

У гэту саму пару між лазой
салавей клаў пакосамі трэлі.
— Ля крынічкі спаткаўся ён з ёй,
нібы сонца іх вочы гарэлі.

Як узьнятыя хвалі вады,
калыхаліся грудзі дзявочы —
мо' паверыць, хто быў маладым...
Ён шчасьлівы, ёй радасьць прарочыў...

А у восень... пакінуў палі —
— вецер кудры расчэсваў любоўна.
Была глуш — верасы адцьвілі —
парасло неба шэраю воўнай.

І ня бачыць дзяўчыне красе,
сакаліных вачэй не галубіць...
Можа ветрык калі прынясе, —
да крынічкі той з весткай заблудзіць...

З міскі поўнага сонца праз край
хтось расплёскаў пунсовую гушчу.
Ці вярнуўся хлапец?.. — Ня пытай,—
аб ім песьню мо' вецер насьвішча...

С. ХМАРА

У горадзе

Стужкай шырокай блішчаць
тратуары
ў пытлі-імжыцы дажджу
мокрыя вецер калыша ліхтарні,
лезе трамваю скульсь жук.

Скачуць па куцінах цені таёмныя,
ў сэрца ўпіваецца жаль —
вырвацца-б недзе за дні нашыя
цёмныя,
ў сіняблакітную даль.

Капаем

Капаем —
няўпынна зьвініць
аб камень стальная лапата
і зьзяюць у вочах зьнямогі агні,
далоні —
крывавая лата.

Ці ў дождж,
ці ў пагоду
ўсьцяж рухам адным
пасьпешна мы вернем дзярніну,
нам сонца з сарочак выпарвае дым,
шрамоў
плечы поўныя
сініх.

Капаем бяз слова,
бяз гуку
ў цішы —
лёг цень на галодным абліччы,
рве крык прыганятага:
Гэй, пасьпяшы —
бо зноўжа вам робры палічым!

Капаем,
капаем
праз цэлыя дні —
магілу капаем пракляцьцю.
Гэй, прыйдзе вясна к' нам
на сонцы кані!..
— — — — — — — — —
Капайце-ж, лапаты,
капайце! .

АНАТОЛЬ ІВЭРС

Да жніва

Ты, радзімае поле, скажы,
каласістым павевам вясны
хай ня хіліць аж да мяжы
пазалочаны жытні трасьнік.

Можа песьню араты згубіў
на шнурох — на барознах крывых,
а з ей пеніцца вецер між ніў
ў сонца брызгах — чырвонай крыві.

І заціснуўшы туга жывот
дзяцей просіць цярпець... да жніва...
Галаву перакінуў праз плот
пазалоту вачыма зрываць...

Помніць — летась зьвінелі сярпы —
пераборысты шумны акорд...
А ў далі нібы матавы пыл
па балоце туман-малако.

і напеваў жывых пераліў,
што ня знаюць быльля і мяжы...
Прыдуць трактары ў полымя ніў,
там, дзе некалі колас тужыў.

* * *

Ізноў ліюцца песьні, песьні...
Узварушы запас крыніц,
што яшчэ схаваны пад плесьняй
і ў сэрцы струны закрані.

Дажджэцца лепшае пары
на скамянелым жоўтым твары,
адчуе радасьць і парыў,
можа ня я, а мой таварыш.

Так, чарадою дзён харошых
ня можна долі замяніць.
Дарогай польнаю заросшай
пайшоў-бы ў гушчу камяніц —

у Беласток, або у Вільню
на блеск — прызыўныя агні,
якіх ня зможа вецер пыльны
туманам сінім засланіць.

 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

УЛАДЗІМЕР ЧЭМЕР

Вялікі скарб нашай старасьвеччыны*)

(750 угодкі »Слова аб палку Ігаравым«)

Зьмест паэмы. Як толькі войска ўвайшло ў стэп, пачаліся ў прыродзе розныя зьявы, якія не варожылі нічога добрага палку і паходу Ігараву. Зацьменьне сонца пакрыла раптам у ясны дзень жудаснай цемрай княжскія дружыны. Але і гэтая, добра ведамая народу „злая прыкмета“ ня стрымала Ігара.

„Браты і дружына, сказаў ён, лепш палегчы забітымі, як папасьці ў палон. А таму — сядзем на борздых каней, каб хутчэй паглядзець сіняга Дону“...

Нястрыманае жаданьне „папіць шеломом вады з Дону“, „пераламаць капьё на канцы поля палавецкага“ так „апаліла розум“ Ігару, што ён не зьвярнуў увагі на гэтую перасьцярогу з боку самога Даж-бога, Сонца, якога любімым „сынам“ быў сам... Калі дружына Ігара злучылася з дружынай яго брата Ўсевалада, „Сонца ізноў заступіла яму шлях цемрай“ — пад ноч паўстала навальніца, падняла зьвягу, крык, гоман, сьвіст уся зьвярына на зямлі, — уся прырода загадвала Ігару паслухаць голасу роднае Зямлі... Але, захоплены гордай думкай аб славе, герой сьмела пайшоў наперад...

І вось, яго войска — ўжо „за курганом“ — у зямлі ворага. І варожыя сілы адразу пачынаюць абступаць з усіх бакоў „сілу рускую“... Прырода тутака ўжо неяк не адстрашывае рускае войска ад паходу, але ўжо рыхтуецца да яго хаўтуроў... Ваўкі „рыхтуюць бяду па пячурах; арлы склікаюць зьвярыну на блізкі ўжо банкет на пабоішчы; лісіцы брэшуць на чырвоныя шчыты дружыньнікаў... Але русічы ідуць усьцяж, ідуць наперад, „шукаючы сабе чэсьці, а князём славы“...

Першае спатканьне з полаўцамі кончылася для русічаў бліскучаю перамогаю. Так заўсёды бывае, калі лёс хоча паўней і страшней падрыхтаваць канчальнае паражэньне... Патапталі яны паганыя палкі палавецкія, набралі ўсялякага багацьця — і дзявок прыгожых, і золата, і тканін дарагіх... І столькі было гэтага багацьця-здабычы, што ўсім гэтым „пачалі масты масьціць“, кідаючы золата-тканыя вопраткі на гразкія шляхі, каб па суху лягчэй было ісьці войску...

І вось, ізноў пачаліся грозныя зьявы нябесныя: чорныя хмары з мора бягуць — „хочуць прыкрыць чатыры сонцы“ (4 князёў рускіх), а ў хмарах сінія маланкі, як літарамі, пішуць жудасны прысуд палку Ігараву. Быць грымоце вялікай, ісьці дожджу з Дону вялікага... Там на Каяле — рацэ шмат коп'яў пераламіцца, шмат шабляў пакрушыцца аб шаломы палавецкія — на Каяле—рацэ блізка Дону вялікага... Бо-ж тут ужо ня відаць Рускае Зямлі, але скрозь — чужына варожая... І вось, пачалі спаўняцца ўсе гэтыя перасьцярогі й прароцтвы прыроды і „дзівоў“ славянскае зямлі: з усіх бакоў ідуць полаўцы-ворагі — і ад Дону і ад мора. Аб набліжэньні хмараў-ворагаў гавора ўся прырода: зямля дрыжыць, угінаецца; рэкі пацяклі мутнай вадой; пыл пакрыў усю зямлю; ветры нясуць стрэламі ўсю гэтую навальніцу людзей і стыхіяў на войска Ігара...

Далей у паэме ідзе нязвычайна сільнае і яркае апісаньне бою, якое можа вытрымаць параўнаньне з найлепшымі месцамі гомэравай Іліяды.

У захопленьні бою забываліся князі-героі і аб сваім жыцьці, і аб родным залатым месьце-сталіцы, і аб мілых сэрцу ласках жонак-красунь, пакіненых дома...

Каб ярчэй адзначыць нябывалую веліч гэтай бітвы, аўтар дае кароткі агляд папярэдніх цяжкіх здарэньняў на Рускай Зямлі, выкліканых, пераважна, сваркамі паміж князямі, якія „самі почаху воевати на ся“. Шмат пацярпела Руская Зямля, з прычыны гэных сварак паміж князямі — ад вонкавых ворагаў. Былі часы, калі на ей рэдка пераклікаліся паміж сабой земляробы, але шмат часьцей — вораны ды груганы, дзелячы паміж сабою людзкія трупы... Але-ж такога бою, ды паражэньня, як на Каяле-рацэ, дык яшчэ ня бывала.

„Чорная глеба пад капытамі каней засеена была касьцьмі ды паліта крывёй... Дый жахам-жальбою ўзыйшло гэта насеньне па Рускай Зямлі“...

З двух братоў, Усевалад палёг, а Ігар папаў у палон палавецкі...

„Тут і разлучыліся, на беразе рakі-Каялы, абодва браты...
Тут крывавага віна не хапіла...
Таму і скончылі пір адважныя русічы —
Сватоў (полаўцаў...) напаілі дый самі палеглі —
За Зямлю Рускую...
Хіліцца удол трава з жалю,
А дрэва ад кручыны сагнулася да зямлі...“

Так канчаецца гэты абраз бою, якому папросту няма роўнага па сконцэнтраванай сіле і яркасьці малюнку і па ўзрушаючым нас, ня гледзячы блізу на 8 вякоў гістарычнай адлежнасьці, уладнай сіле сардэчнага жалю...

* * *

Наступны разьдзел паэмы пераносіць нас на Рускую зямлю, нянменш сільна і ярка малюючы тое, зьмяшанае з жалем і жахам, абурэньне, якое ахапіла ўсе яе плямёны і княжствы, калі прыйшла вестка аб тым, як „палавецкая пустыня пакрыла (пахавала) рускую сілу“... Заплакалі „хоті“ (жонкі), што ніколі

*) Глядзі пачатак артыкулу ў кн. ?(15) „Калосься“.

ўжо ні вачыма ні ў мысьлі ня ўбачаць сваіх „мілых ладаў“ (мужаў), ні абяцанага імі золата і серабра — ваеннай здабычы. Застагнаў ад кручыны Кіеў, а Чарнігаў — ад гора. Туга разьлілася па ўсей Русі. Бо-ж — у выніку паражэньня палку Ігарава— полаўцы кінуліся навалай у адчыненую на ўсходзе Рускую Зямлю дый пачалі паліць ды рабаваць адно места па адным, накладаючы на іх дані — „па белцы ад двара“...

І зразумелі тады ўсе на Русі, як страшэнна прыслужыліся ей неразумныя князі, ня гледзячы на ўсю іх асабістую гераічную адвагу і добрую волю—здабыць сабе чэсьць і славу. І ўспомнілі тады, як пераможна адбыўся толькі два гады назад паход проці гэтых самых полаўцаў, арганізаваны самым вял. князем Кіеўскім.

Але — ня толькі ўся Руская зямля адчула паражэньне Рускае сілы на Далёкім Усходзе, на „канцы стэпу палавецкага“, *як сваю бяду ды жалобу,* але, як кажа далей „Слова“, *і ўся тагачасная Эўропа была глыбака ўсхвалявана гэным здарэньнем, адчуўшы, відаць, яго, як грознае і для сябе...* Раўнуючы абодва паходы Сьвятаслава Кіеўскага і Ігара Северскага,

„І немцы, і венедцы (зах. і паўдзен. славяне),
„І грэкі і моравы пяюць славу Сьвятаславу,
„Хаюць князя Ігара“...

Вельмі важная адзнака, якая паказывае на тыя жывыя і пастаянныя адносіны, якія існавалі ўжо ў той час паміж Русьсю ды Заходняй Эўропай.

Далей ідзе, можна сказаць, цэнтральная *ідэолёгічная* частка паэмы. Пясьняр пераносіць нас у палац самога вял. кн. кіеўскага Сьвятаслава. Бацьку Ігара сьніцца вешчы сон жудаснага зьместу. Быццам ляжыць ён на сваім ложку, а яго пояць нейкім сінім віном, зьмяшаным з баявым потам (трудам) дый сыплюць яму на грудзі з пустых палавецкіх калчанаў буйныя і цяжкія пэрлы... І чуе князь, як пачаў з даху заваліваццa яго залатаверхні княжскі палац... І навакол усю ноч каркалі груганы...

На двары вялікага князя ня ведалі аб лёсе яго двух сыноў. Але баяры растлумачылі князю яго сон: гэта знак, што нейкая бяда здарылася з яго „двумя сакаламі“... Іх войска, мабыць, пасечана паганымі, а самі яны ўвязаны ў жалезныя путы... На вялікую бяду паказывалі і жудасныя знакі на небе. І вось, тады князь Кіеўскі *„выраніў залатое слова, з сьлязьмі зьмяшанае“.* У гэтым „залатым слове“ *другога, старэйшага векам, ды старшага становішчам і розумам, героя паэмы,* аўтар яе і выражае галоўную ідэю свайго твору.

„Мае сыны („сыновча“ — точна: „пляменьнікі“, а агульней: „сыны“, як малодшыя), залішне сьпешна пачалі вы варушыць мячамі зямлю палавецкую шукаючы сабе славы, але не падрыхтаваўшы, як сьлед, паходу. Дык і выйшла, што ўся вашая асабістая адвага прапала дарма, — толькі на гора ды бяду ўсяе Зямлі дый на ганьбу маей сівой галаве“... Але-ж — не такі быў гэны, можа, запраўдны герой усяе паэмы, каб абмежыцца толькі дакорамі пацярпеўшым бяду ды сьмерць „сыном“. Зараз-жа зьвяртаецца вялікі князь Кіеўскі з магутным заклікам да ўсіх тагачасных валадароў „Зямлі Рускай — ад Суздаля над Волгай да далёкай на захад Галіччыны, — каб ішлі разам з ім ратаваць усю Рускую Зямлю; разьбіць дарэшты яе ворага, адамсьціцца

„За сьвежую крыўду Рускай Зямлі,
За раны Ігара, адважнага сына Сьвятаслава“.

Аўтар пералічае ўсіх гэтых перадавых валадароў, даючы ім вельмі яркія характэрыстыкі, усхваляючы іх сілу, багацьце, баявую адвагу і патрыятызм — ясна-ж, каб мацней заахвоціць іх да новага паходу. На гэтую адзнаку: *актуальнасьць гэнага заклiку* трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, бо-ж яна дапамагае нам азначыць час напісаньня самае паэмы.

Два вялікія адрыўкі паэмы прысьвечаны Полаччыне, — каб высьвятліць тое, чаму ў шырокім закліку кіеўскага вял. кн. Сьвятаслава да ўсіх князёў Рускае Зямлі ён абмінуў магутных валадароў Полаччыны. Напомнім, на падставе летапісу, Іпатаўскага і інш., аб гістарычных здарэньнях тагачаснага мамэнту, папярэдзіўшых паход Ігара, — у гэнай частцы Рускае Зямлі. Якраз на працягу 10—15 гадоў перад паходам Ігара ішла паміж князямі „Рускае Зямлі“ зацятая крывавая барацьба за кіеўскі пасад. У 1174 годзе Полацкія князі, а з імі разам і князі Смаленскія і князі Тураўскія, і Пінскія і Горадзенскія — пад націскам і павадырствам князя Суздальскага Андрэя — ідуць вялікаю „ратью“ проці сеўшых на кіеўскі пасад Расьціславічаў, каб аддаць яго аднаму з „ольгавічаў“ — Сьвятаславу Усеваладавічу, таму самаму, які іграе такую вялікую ролю ў „Слове.“ Але праз некалькі гадоў — у 1180 г., у барацьбе гэтага вял. кн. кіеўскага з Усеваладам Суздальскім — полацкія князі прымаюць старану Сьвятаслава. „Прыйшлі, кажа Іпат. летапіс, Полацкія князі ў дапамогу Сьвятаславу — і Брачыслаў з Віцебску і брат яго Усеслаў з палачанамі, а з імі былі і лібь і літва.“ Кн. Ізяслаў Васількавіч, аб якім, побач з Усеславам і Брачыславам, кажа тутака „Слова,“ быў хіба-ж таксама князем Полацкім, можа, трэйцім братам абодвух апошніх. Усе гэтыя Полацкія „Усеславічы“— патомкі першага, амаль не легендарнага Усеслава, які ў „Слове“ рысуецца такім чарадзеям, „лютым зьверам“ і валадаром усяе Рускае Зямлі, які з сваей дружынай аблятаў блізка ўсю яе з канца ў канец, усюды прыносячы з сабою жах, кроў, бяду і спусташэньне. Ужо з гэтага ўсяго відаць, што Полаччына стаяла неяк асобна, здалёка ад рэшты Рускае Зямлі. Гэтая асобнасьць павялічвалася яшчэ і тым, што ўжо ў гэныя часы полацкая зямля з княжствамі Горадзенскім, Менскім, Тураўскім, Пінскім і інш. мелі з захаду сваіх ворагаў— саюзьнікаў літоўцаў, і гэтыя, уласныя клапоты ў вельмі значнай меры адрывалі гэных «заходнерускіх,“ ці беларускіх князёў ад супольнага жыцьця з рэштай

Рускае Зямлі. Ведама з летапісу, прыкладам, страшэннае паражэньне нанесенае горадзенскім Усеславічам літоўцамі у 1107 г. А гэта таму, што і тутака, на захадзе, нягорш, як на ўсім далейшым на ўсход славянскім абшары, панавалі міжусобныя войны. Абодва адрыўкі „Слова,“ датычачыя князёў полацкай зямлі, ярка рысуюць вынікі гэткай хатняй вайны і братняй барацьбы для іх бацькаўшчыны. Гэтыя нязвычайна яркія адрыўкі з паэмы дадзены ў папярэднім нумары „Калосься“ у перакладзе Купалы.

І вось, як раз у той мамэнт, калі здарылася гэная страшэнная бяда над князямі чарнігаўскай зямлі, князі полацкай зямлі, „унукі усеслававы,“ далёка „скакнулі ад дзедаўскай славы,“ а часткай паляглі ў зямлю, «прышлёпаныя літоўскімі мячамі“... Але-ж і „слава дзеда Усеслава“ была нейкая сумліўная. Аб гэтым кажа хаця-б знамянітае мейсца ў паэме аб лёсе Меншчыны, да якой гэны слаўны дзед Усеслаў „скакнуў ваўком“... Характэрна, як двойча ацэньвае гэнага найвыдатнейшага князя беларускага абшару старадаўняй Русі аўтар „Слова.“ Ён падчырківае, што гэны ведамы Усеслаў, слаўны ваеннай адвагай і талентам, усюды прыносіў з сабою кроў і сьмерць, паўтараючы „прыпеўку вешчага Баяна,“ сучасьніка Ўсеслава, аб тым, што— „як ні быў той хітры і горазды, але ўсё-ж за гэта суда Божага і ён ня мінуе“...

З гэтага ўсяго відаць, што ўжо ў тыя часы вельмі рэзка зарысаваліся розьніцы і супярэчнасьці паміж цэлымі вялікімі абшарамі, цэлымі групамі „земляў“ Зямлі Рускай, адзінства якой існавала хіба-ж толькі, як ідэя, як ідэолёгія, успадкаваная ад былага адзінства першае княжскае дружыны, якая захапіла ўладу над славянскімі плямёнамі дый якая насіла імя „Русь.“

Наступны разьдзел паэмы—найбольш знамянітае ў ёй мейсца, так званы „плач Яраслаўны,“ які і цяпер яшчэ рве сэрца чытача сваім надзвычайна сільным і шчырым лірызмам.

Канчальны разьдзел паэмы дае апісаньне уцёкаў князя Ігара з палону палавецкага. Ізноў магутны талент песьняра блішчыць тут усімі фарбамі сваей багатае палітры, арганічна зьвязанай з адвечным сьветапаглядам і жыцьця - адчуваньнем славянскай Русі, супольнымі блізу цалком усім яе магутным народным галінам. Увесь абраз уцёкаў Ігара і безнадзейнай пагоні за ім двух ханаў палавецкіх, Гзака і Канчака, напісаны характэрнымі для мастацкай манеры аўтара кароткімі, сільнымі, яркімі „мазкамі,“ робіць вельмі моцнае ўражаньне.

Паслухайце самі:

„Прыснула мора к палуначы...
Ідуць сьмерчы туманамі —
Сам Бог указывае Ігару шлях
На Бацькаўшчыну...
Пагасьлі зоры вячэрнія.
Ігар быццам сьпіць,

Але-ж ён ня сьпіць,
Але думкай мерыць поле
Ад вялікага Дону —
Да Бацькаўшчыны...
У паўночы стаў конь перад Ігарам.
За ракою сьвіснуў прыяцель...
Стукнула зямля, зашумела трава.
Заварушыліся калёсы палавецкія

дый — паскакаў Ігар з палону здабываць сабе волю...

І тутака, як нідзе больш, выявілася асаблівая прыхільнасьць аўтара да любімага свайго героя: столькі шчырага жару сэрца ўкладае ён у сваё апісаньне, як быццам ад яго сілы і яркасьці залежаў сам ратунак яго героя. Дзеля таго пясьняр, робіць цудоўнай самую асобу апошняга. Уцякаючы ад гонячых яго полаўцаў, кн. Ігар перамяняецца ці то ў горнастая, каб перабегчы праз чарот над ракой, ці то ў гогаля, каб пераплыць раку; паезьдзіўшы на борздым кані, ён саскаківае з яго шэрым ваўком, каб хаваючыся ў траве перабегчы праз луг уздоўж Данца, а над ім паляцець сакалом... І рака-Данец радуецца, што можа дапамагчы рускаму князю вызваліцца з палону — на „радасьць Рускае Зямлі,“ а князь у цёплых і харошых словах дзякуе жывой рацэ за помач і мілую ласку. Усьлед за князем рускім ляцяць абодва ханы палавецкія, але з іх пагоні нічога ня вышла. Характэрна, аднак-жа, гутарка іх паміж сабой. Гзак прапануе Канчаку, каб за пабег „сакала“ з палону забіць стрэламі „саколіча,“ гэта значыць — Ігарава сына, Уладзімера, які разам з бацькам папаў у палон. Канчак на гэта адказывае, што лепш, выпусьціўшы з рук сакала, саколіча, „спутаць ды прывязаць дзяўчынаю.“ Мы казалі вышэй, што з ворагамі-полаўцамі князі вялі ня толькі войны, але і мірныя зносіны, ладзячы сувязі гандлёвыя і сямейныя. Князь Уладзімер Ігаравіч быў яшчэ раней, да паходу, сасватаны з дачкой Канчака. Таму Канчак і не хацеў губіць свайго прышлага зяця. Як мы ведаем з летапісу, Уладзімер запраўды ажаніўся з дачкой Канчака, але хутка уцёк з палону, пакінуўшы сваю „хотю“ за Донам... Гэтыя факты маюць вельмі важнае значэньне дзеля ўстанаўленьня даты напісаньня самага твору.

Канчаецца паэма кароткім зваротам, яшчэ раз, да слаўнага папярэдніка-песьняра, Баяна, дый—яркім абразом, як засьвяцілася сонца на Русі, як запяялі дзяўчаты, калі засьвяціліся на яе зямлі ясныя вочы вярнуўшагася князя Ігара. Месты і вёскі павесялелі, а сам Ігар першым чынам паехаў злажыць падзяку сьвятой Багародзіцы Пірагошчай.

Звычаем усіх падобных героічных паэмаў — «Слова“ канчаецца „славай,“ — славай сьпярша старэйшым князём, пасьля малодшым, а пасьля і ўсей дружыне, славай, не зважаючы на ўсе памылкі іх, — за тое, што яны, князі і дружыньнікі, ішлі вайной за хрысьціян ды проці паганых...

Гэтая рыса — успамінаньне аб Божай Мацеры дый аб хрысьціянах, наагул рэдкае ў „Слове," паказывае на ўплывы Царквы. Але, як відаць з усей паэмы, уплывы гэтыя яшчэ былі даволі слабыя. Усё ў паэме дышыць, хутчэй, дахрысьціянскай стыхіяй старадаўняй Русі, уся яна перапоўнена жывымі абразамі народна-паганскага эпосу, багамі і бажкамі адвечнай славянскай натуральнай рэлігіі. Сынамі ці ўнукамі галоўнага бога яе — Дажбога, бога Сонца, называе ў сваей паэме аўтар найслаўнейшых князёў Рускай Зямлі.

Такі гэты цудоўны абломак нашай старадаўняй мінуўшчыны, ацалеўшы запраўды-ж нейкім цудам, каб сьведчыць нам аб тым, якое буйнае жыцьцё кіпела ўжо тады на Русі, як высака стаяла тады культура паэтыцкага слова, якія моцныя і яркія таленты закоўвалі ў гэтае слова бягучае дый уцякаючае ў мінуўшчыну жыцьцё, каб уся яго сіла і краса захавалася навек у гэтым слове на радасьць і навуку патомкам. Трэба, паўтараем, толькі пазнаць і пакахаць гэную сваю мінуўшчыну, каб стаць дастойнымі лепшай, а мо, — слаўнай, роўнай ей — будучыны.

Песьня аб паходзе Ігара*)

(„Слово о пълку Игоровѣ")

Вершаваны пераклад ЯНКІ КУПАЛЫ

Плач Яраслаўны

Пяюць дзіды на Дунаі,
А ў Пуціўлі Яраслаўна
Бязуцешнаю зязюляй
Наракае раным-рана:
„Паляту я ў даль зязюляй
Па Дунаю за дубровы,
Памачу ў рацэ-Каяле
Рукавок я свой бабровы.
І зьляту да князя ў полі,
Дзе у зялёнай лёг пасьцелі,
Ды крывавыя ўтру раны
На яго магутным целе".
Яраслаўна рана плача
У Пуціўлі на сьцяне,
Наракаючы зязюлькай,
Долю горкую кляне:

*) Перадрукоўваем із „Збору твораў" Янкі Купалы, т. IV. Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва. Менск 1928. (Рэд.).

„О, вецер, вятрыска!
Чаму, ўладар, лётам
Сваім гэтак вееш
У вочы сіротам?
„Чаму ты на крыльлях —
І вольны і сьмелы —
На мужніх ваякаў
Мчыш ханскія стрэлы?
Ці-ж веяці мала
Табе пад аблокі —
У гары, ў паднябесьсі
Шырокім, далёкім?
„Або ў сінім моры
Лялеяць, гайдаці
Чаўны з караблямі
Да ціхае гаці?
„Чаму ты, ўладару,
Мне радасьць асіліў, —
Вясёласьць разьвеяў
Па дзікім кавыльлі?"
Яраслаўна рана плача
У Пуціўлі на сьцяне,
Наракаючы зязюлькай,
Долю горкую кляне:
„О, Днепра славуціч!
Ты ў каменных горах
Праз Полаўцаў землі
Дол высек у мора.
„Кабякаву войску
Чаўны Сьвятаслава
Сабой ты лялееў,
Акрылены славай.
„О, мне прылялей-жа,
Ўладару, ў харомы
Саколіка — мужа
З зямлі незнаёмай!
„Каб сьлёзаў я рана
Ў тузе нябывалай
К яму цераз поле
На мора ня слала!"
Яраслаўна рана плача
У Пуціўлі на сьцяне,
Наракаючы зязюлькай,
Долю горкую кляне:
„О, сьветлае сонца!
Трысьветлае! Ўсюды
Цяплом і красою
Ясьнееш, як цуды.

„Чаму-ж, уладару,
Свой промень пякучы
На мужняе войска
Нанесла, ня ждучы?
„На полі бязводным
Ты смагай пагнула
Ім лукі, а тугай
Заткала утулы?!“

С. КАЛІНА

На раздарожжы

Першы зборнік Танкавых твораў *На этапах*, хаця й вызначаўся няштодзеннымі мастацкімі вартасьцямі і выразна выдзяляў аўтара спасярод цэлага раду сучасных яму паэтаў, як індывідуальнасьць значна багатшую й здальнейшую, — не прадстаўляў яшчэ здэцыдаванага й выразна азначанага кірунку. Аўтар, аграніЧваючыся да матываў работніцка-пралетарскіх, перадусім вастрожных, як сьвежага й незацёртага яшчэ ўспаміну асабістых перажываньняў за жалезнымі кратамі, ня мог яшчэ абняць і глыбака пераняцца тымі выразкамі жыцьця, якія найлепш адказвалі-б характару ягонага таленту. Гэтак сама стыль і мова ягоных пачатковых твораў, прадстаўляючыя даволі выдатныя мастацкія асягненьні, вызначаліся ўсё-ж такі аднастайнасьцю і, сказаў-бы нават, свайго роду ўбогасьцю спосабаў артыстычнага выражэньня; роўналежна із затоеным у іх агнём, які толькі сямтам прабіваўся на верх, веіла нейкай панурасьцю і холадам.

Паэт аднак, усьведаміўшы сваю творчую сілу, доўга не задзержываўся на адным і тым самым месцы і ў хуткім адносна часе выплыў на шырокі і найбольш адказуючы характару свайго таленту шлях паэтыцкай творчасьці. Гэтым шляхам была *беларуская сялянская стыхія* ў найшырэйшым значэньні гэтага слова.

Творы, зьмешчаныя ў зборніку *Журавінавы цьвет* і паэма *Нарач* былі ўжо ў адносінах да зборніка „На этапах“ аграмадным крокам наперад і прадстаўлялі ў вялікай меры новы паэтыцкі сьвет, гэтак у галіне тэматыкі сваей, як і з гледзішча асаблівасьцяў артызму, зусім іншы за папярэдні. Поўнымі прыгоршчамі чэрпае паэт творчы матар'ял із народных нетраў, пераТвараючы яго ў высокамастацкія паэтыцкія сымболі, чула й глыбака адклікаецца на розныя праявы народнага жыцьця, захопліваецца із шчырым інтузыязмам, далёкім ад штучнага сэнтымэнталізму і зманерызаваньня, хараством беларускае прыроды. Будуючы сваю творчасьць на сялянскім падкладзе, часта густа зьвяртаецца паэт да народных крыніцаў, чэрпаючы зь іх нятолькі матывы, але й слоўнікавы і стылістычны матар'ял, зь якога патрапляе выткаць нязвычайна містэрныя і чароўна прыгожыя стылёвыя арнамэнты. Асабліва вялікую ўвагу зьвяртае паэт на вобразнасьць і плястычнасьць сваей творчасьці, якія асягівае пры помачы сьмелай і сконкрэтызаванай мэтафорычнасьці паэтыцкага языка. У сувязі з гэтым творы ягоныя прамаўляюць да чытача перадусім сакавітымі й пукатымі абразамі, моцна насычанымі шчырым і глыбокім лірызмам. Пачуцьці ў гэтых творах прабіваюцца выбухова, беспасярэдна із магутнай стыхійнай сілай, альбо выплываюць арганічна із намаляваных абразоў і сытуацыяў.

Гэтае блізкае зрадненьне із сялянскай стыхіяй давала аўтару вялікі запас творчых магчымасьцяў, улівала ў ягоную паэзію многа сьвежасьці й шчырасьці, напасьледак надавала ей арыгінальны беларускі характар. А ўсё гэта вымоўна пераконывала, што Танкавая творчасьць разьвіваецца ў найбольш пажаданым кірунку і што пясьняр, знайшоўшы напасьледак самога сябе, нятолькі ня сойдзе із выбранага шляху, але ў меру дасьпяваньня свайго таленту будзе яшчэ глыбей запушчаць карані ў беларускую сялянскую глебу, ведаючы, што тамака запас творчага матар'ялу зьяўляецца для беларускага паэта нявычарпаны. Нажаль сталася іначай...

У новым зборніку Танкавых твораў *Пад мачтай*, які нідаўна вышаў з друку, сялянскасьць захавалася ўжо ўсяго толькі дзе ня дзе, як прыпадковы рэфлекс нядаўных яшчэ зацікаўленьняў паэта, а на першы плян высоўваюцца *матывы чыста інтэлігенцкія*. Мушу засьцерагчыся, што адносіцца гэта перадусім да часткі лірычнай зборніка, так як лірыка зьяўляецца дасюль аснаўным жанрам Танка. Трэба падчыркнуць, што інтэлігенцкасьць новых лірычных вершаў Танка праявілася ня так выразна ў галіне іх тэматыкі, — хаця і тут відзім значныя зьмены, — як у паэтыцкіх адносінах да яе аўтара і ў характары і якасьці некаторых мастацкіх прыёмаў. Страта ад гэтага ў зборніку відавочная. Талент песьняра выразна расшчэпліваецца і калі ў некаторых творах ясьнее пышным блескам, то ў другіх значна мутнее, трациць сваю сьвежасьць і дасюлешні размах. Перад тым аднак, як задзержымся шырэй над гэтым зьявішчам, зьвернем належную ўвагу на тыя творы ў зборніку, якія ані чуць ня ўступаюць папярэднім, а нават у некаторых галінах прыносяць многа новых, няпрыкмечаных яшчэ дасюль мастацкіх вартасьцяў.

У вартыкуле *На парозе новае эпохі ў беларускай літаратуры* *) я зацеміў, што Танк у сваім творчым разьвіцьці ніколі не задаволіваецца асягнутымі рэзультатамі, хоць-бы былі яны й вельмі

*) „Калосьсе“, 1938, № 1—14.

добрыя, але ўсьцяж шукае новых творчых шляхоў, з поўнаю сьведамасьцю працуе над далейшым дасканаленьнем свайго таленту. Гэтая асаблівасьць Танка зазначылася ў новым зборніку ў цэлай паўніні і ў некаторых прыпадках дала паважныя вынікі, нягледзячы нават на ўспомненую ўжо зьмену паэтыцкае мэтоды. Найлепшым гэтага доказам могуць служыць такія пэрлы Танкавай лірыкі, як *Выраі*, *За шэрым схіляным парканам*, *Паслухайце, вясна ідзе*, *Ёсьць варажбітныя травы* і некаторыя іншыя. Ад згушчанай мэтафорычнасьці і пластыкі абразоў бачым тутака даволі шчасьлівы пераход да больш простай і яснай, але ня менш прэцызыйнай архітэктонікі верша; заместа ўсхваляванай і бурлівай пачуцьцёвасьці, выкрасае эмоцыі больш мяккія і лагодныя, але ня менш шчырыя й глыбокія. Пачуцьцёвая зраўнаважанасьць і мяккасьць тонаў зьяўляюцца так характэрнымі й неспадзяванымі, што ў цэлым зборніку знаходзім усяго адзін адным верш *З паднятай галавой*, які бурлівай дынамікай пачуцьцяў лучыцца з папярэднімі творамі паэта. Гэтаксама і мова гэтых вершаў выдаецца на першы пагляд зусім простай і звычайнай, але калі ўслухацца ў яе дзіўную музыку і прыглядзіцца да яе пачуцьцёвай насычанасьці, то зацемім, з якой стараннасьцю і вычуцьцём дабірае паэт паасобныя словы й выражэньні, зь якой містэрнасьцю й прэцызыяй будуе зь іх паэтыцкія сказы, каб выдабыць зь іх найбольш чару і хараства. Такая мэтода тварэньня шмат у чым прыпамінае творы Багдановіча, які гэтак сама клаў вялікі націск на паэтыцкую вартасьць слова, ужытага ў вершы, за што беларуская крытыка згодна назвала яго „песьняром чыстае красы".

У зборніку знаходзім некалькі іншых вершаў, у якіх прасьціня артызму яшчэ ярчэй кідаецца ў вочы, але роўналежна з гэтым зьяўляюцца яны аднымі із лепшых дзякуючы першаякаснай тэхніцы, сьвежасьці і пластычнасьці прыёмаў і глыбокай жыцьцёвай праўдзе, шчыра выказанай у іх. На першым месцы трэба паставіць верш *Над калыскай*, аснаваны на вельмі спапулярызаваным ува ўсіх літаратурах матыве, які выводзіцца із народных калыханак. У беларускай літаратуры матыў маці над калыскай спатыкаецца даволі часта, запачаткаваны *Калыханкай* Багушэвіча, аднак-жа Танк патрапіў яго так удала адсьвяжыць і ўпаэтызаваць, так блізка яго зьвязаў з актуальным сяньняшнім жыцьцём, што верш ягоны назаўсёды астанецца дасканалым узорам гэтае катэгорыі твораў. Гэтак сама простымі, але глыбокімі сваім актуальным зьместам, зьяўляюцца вершы *Плывуць стругі, плыты, плыты* і *Гудкі і калёс перазвон*. Не адходзяць ад агульнай лініі, хаця зьяўляюцца больш складанымі ў сваей структуры і стылёвай кампазыцыі наступныя вершы: *Павязьлі цягнікі*, *Межы, дзе глянеш ўсё межы*, *Над курганамі*, *Памёр стары лірнік*, *У апалены ветрам марозным асіньнік* і некалькі іншых. Ярка выдзяляецца на фоне цэлага зборніка

чароўна-прыгожы твор, вельмі памыслова скампанаваны й захварбаваны лёгкім гумарам *Дзед і шчупак*.

Усе ўспомненыя вершы прадстаўляюць, побач із іншымі вартасьцямі, высокую ступень паэтыцкай тэхнікі і паказуюць, што пясьняр з гэтага гледзішча ўжо поўнасьцю дасьпеў. Характэрна, што сучасны верш Танка прамаўляе да нас перадусім сваей суцэльнасьцю, а не паасобнымі яго часткамі. Калі ў папярэдніх творах некаторыя абразы існавалі часта самі для сябе, дык цяпер усе элементы твораць між сабой суладную гармонію, патрэбную выключна для заакцэнтаваньня галоўнае думкі ці абраза, намалёванага ў вершы. Зьмест твору зарысоўваецца ясна й пуката і ня губляецца ў гушчарніку пабочных абразоў і стылёвых арнамэнтаў.

Усё вышэйсказанае адносіцца толькі, як ужо ўспаміналася, да часткі вершаў, на чале із пералічанымі, а ў ніякім прыпадку ня можа абняць цэлага зборніка. Многа вершаў зьяўляецца поўным ці частковым запярэчаньнем усіх тых мастацкіх асягненьняў, заўважаных у разгляданых ужо творах. Такія вось вершы, як *Такая белая зіма*, *За пацалункі і за вочы*, *Раніцы сьцежка*, *Яшчэ ў гушчарах сасновых*, *Таму часамі ціхі смутак*, *Я гляджу на дываны*, *Зноў у аркестру скрыпачоў*, *Абапал лес*, *Пад вечар пацяркі густыя* і некаторыя іншыя ў ніякім прыпадку не зьяўляюцца ўжо плодам шчырага натхненьня, але толькі звычайным, хаця й беззаганным з гледзішча тэхнічнага й не пазбаўленага паэтыцкай культуры рамяслом. Дарма ў іх шукаць уласьцівай Танку чароўнай музыкі словаў, багацьця й выразнасьці абразоў, глыбіні і сьвежасьці пачуцьцяў, якія ў іншых творах проста зачароўваюць чытача. Паэтыцкія візіі і ідэі, якія перад гэтым зарысоўваліся заўсёды выразна й пуката, тутака мутнеюць і расплываюцца ў няясных і часта абстракцыйных сымболях. Гэтыя бяссэнсоўныя заганы на фоне сучаснай паэтыцкай творчасьці яшчэ не дыскваліфікуюць зусім успомненых вершаў Танка, але моцна іх дэградуюць і ў ніякім прыпадку не даюць аўтару права так злосна й часамі беспадстаўна высьмейваць усіх іншых сучасных беларускіх паэтаў, як гэта ён часта робіць у сваіх сатырычных вершах. З гэтым трэба лёяльна згадзіцца!

Вяртаючыся ўзноў да тэмы, трэба зацеміць, што нават такія творы, як *Руей*, *З вырваных картак*, *Раніца*, *стук малатка*, *Гаворань*, *кат памёр*, *Шумяць калёсы*, *ноч і зоры*, хаця і зьмяшчаюць у сабе многа ўдалых і высокамастацкіх асаблівасьцяў, не зьяўляюцца аднак належна выдзержанымі ў сваей кампазыцыі ані апрацаваныя артыстычна, як ранейшыя вершы.

У аглядзе Танкавага зборніка, зьмешчаным у *Беларускім Летапісе* (1938, № 2), Атос гаворыць, што быццам толькі цяпер узышоў пясьняр „на ўласны шлях" (!) — такі і назоў і яго рэцэнзіі — бо, паводле рэцэнзэнта, „замест навеенага чужацкімі ўплывамі пераросту драбязовых мэтафораў і віхрыстасьці выяўленчых спосабаў, паэт прыхіляецца ўсё больш выразна да шля-

хотнага супакою — сьвядомага й арганізаванага“. Рэцэнзэнт нажаль забыўся, што гэтая, быццам навееная чужацкімі ўплывамі, „драбязовая“ мэтафорычнасьць зьяўлялася найбольш *арыгінальнай* азнакай Танкавай паэзіі, асновывалася яна на беларускім сялянскім і фольклёрыстычным матар'яле і, будучы аўтарам із вялікім накладам артызму самастойна й сьвядома апрацаваная і функцыянальна зьвязаная із цэласьцю твору, надавала ягонай паэзіі зусім апрычоны й незалежны характар. Якраз у ранейшых творах часта можна было заценіць больш ці менш ўплыў народнае творчасьці так у структуры верша, як і ў паасобных стылістычных фігурах, а ў вершах цяперашніх няма яе й сьледу, хаця Атос чамусьці стараецца бачыць у іх набліжэньне да народнае песьні, яе „простай структуры“ і „нутранай гармоніі“. Цьверджаньне-ж, што ў прыраўнаньні да папярэдніх твораў толькі цяпер паэт узышоў „на ўласны шлях“, магло зрадзіцца адно толькі на падставе тых вершаў Танка, якія мы выдзялілі вышэй у першую частку, тады калі другую частку рэцэнзэнт чамусьці памінуў.

Тымчасам гэтая першая частка вершаў, будучая незалежна ад другой нязвычайна высокім і цікавым артыстычным асягненьнем, не ратуе яшчэ сытуацыі, калі ходзіць аб цэласьць зборніка. Спатыкаемся тут не з паасобнымі заганамі ані з прыпадковымі і незалежнымі ад сябе экспэрымэнтамі, якія ў тэй ці іншай галіне аўтару не ўдаліся, але із зьявішчам сымптоматычным; вершы гэтыя твораць сабой суцэльную групу, вызначаючы гэтым самым апрычоны паэтыцкі кірунак, які, як было гаворана, разьмінаецца з асаблівасьцямі таленту песьняра. З усяго гэтага атрымліваецца ўражаньне, што пясьняр, адарваўшыся ад родных сялянскіх каранёў, пачаў паволі губляць грунт пад нагамі. Ці такое зьявішча зьяўляецца вельмі грозным для будучыні Танкавага таленту, адказаць ня цяжка. Такія індывідуальнасьці, як Танк, абдораныя цьвярозым змыслам самакрытыкі, часамі губляюцца ў лябірынце розных літаратурных зьявішчаў і кірункаў, але, хутка пераканаўшыся аб сваей памылцы, тым цьвярдзей становяцца на ўзноў знойдзеным шляху.

Апрача лірычных вершаў, зьмяшчае ў сабе зборнік невялічкую эпіцкую паэму *Каліноўскі* і вельмі прыгожыя стылізацыі народных казак. Постаць Каліноўскага паяўлялася ўжо даволі часта ў нашай літаратуры. Не беручы пад увагу дробных вершаў, прысьвечаных беларускаму герою, літаратура наша мае адну драму Міровіча *Кастусь Каліноўскі* і тры паэмы—А. Вольнага *Кастусь Каліноўскі,* М. Машары *Сьмерць Кастуся Каліноўскага* і напасьледак паэму Танка. З боку мастацкага апрацаваньня і гістарычнай праўды гэтая апошняя стаіць найвышэй.

Каліноўскі Танка выдзяляецца асабліва дадатна на фоне дасюлешняй эпіцкай творчасьці паэта з гледзішча добра абдуманай і беззаганнай кампазыцыі. Увесь твор складаецца з васьмі кароткіх частак, зь якіх першая ёсьць лірычным уступам, а апошняя многагаворачым і шырака дапаўняючым акцыю паэмы эпілёгам. Такім спосабам вялікі і багаты прасьцяг гістарычных падзеяў, зьвязаных з постацьцю Каліноўскага, замкнуў аўтар у шасьцёх невялічкіх частках, але зрабіў гэта так, што ўсе гэтыя часткі, абыймаючыя зусім адасобленыя, вырваныя із цэласьці, але рэпрэзэнтатыўныя для гэтай апошняй факты і здарэньні, даюць у выніку поўнасьцю закончаную й закругленую паэтыцкую візію нашай мінуўшчыны. Затое ў галіне мастацкага апрацаваньня паасобных дэталяў *Каліноўскі* ня выдзержывае прыраўнаньня ані з *Нараччу*, ані з *Журавінавым цьветам,* ані напасьледак із *Сказам пра Вяля.* Калі гэтыя апошнія былі паэтыцкімі, як у сваей суцэльнасьці, так і ў паасобных частках і фрагмэнтах, то ў *Каліноўскім,* побач із мясцамі, належна апрацаванымі артыстычна, знаходзім і звычайную, зрымаваную толькі прозу, якая зьяўляецца неабходнай усяго толькі дзеля павязаньня паасобных эпізодаў апавяданьня, але сама ў сабе не прадстаўляе нічога паэтыцкага. Лепшыя й больш мастацкія месцы паэмы часта губляюцца ў вартыстычна неўпарадкаваным матар'яле, верш залішне ломіцца і шурпацее дзякуючы частым і незаўсёды патрэбным рытмічным „узрывам“, так што ўвесь *Каліноўскі* робіць уражаньне скарэй за ўсё толькі агульных і сырых начыркаў паэмы, а ня поўнасьцю ўва ўсіх дэталях закончанага з мастацкага боку твору.

Пры гэтым варта высунуць і некаторыя дробныя тэхнічныя заганы, якія адносяцца ў роўнай меры да разгляданай паэмы, як і цэлага зборніка. Перадусім будзе гэта вельмі частае і непажаданае асабліва для Танка, як буйнага й поўнасьцю даспелага таленту, надужываньне *„ў“* (нескладовага), г. зн. ужываньне яго ў тых прыпадках, дзе згодна зь беларускай вымовай быць яно ня можа. Хаця Танк закідае ў адным сваім вершы, што быццам беларуская літаратурная крытыка займаецца лічэньнем пунктаў ды „ахаў“ у творах нашых паэтаў, але калі-б палічыць успомненыя прыпадкі з *„ў“* у Танка, то праца напэўна ня была-б дарэмная! Гэтак сама няпрыемным дысанансам гучаць нярэдкія ў Танкавай мове русыцызмы, як *водцепель, гладзь, мяцель, ніпачом, шастая* гадзіна, маладым *гадам, сьлязам* і некаторыя іншыя.

На асаблівую заслугоўвае ўвагу песьня аб Каліноўскім, стылізаваная на матыў народны. Мо' яшчэ ніколі не ўдалося Танку так добра вычуць харастве народнае песьні і з такой фольклёрыстычнай прасьцінёй і аўтэнтызмам, а адначасна і вельмі артыстычна перадаць яе тыповыя асаблівасьці. Зьяўляецца яна бясспрэчна найлепшай часткай усяе паэмы.

Зборнік заканчываецца аддзелам *Казак,* аб якіх без энтузыязму гаварыць немагчыма. У беларускай літаратуры было ўжо многа спробаў паэтыцкага апрацаваньня народнае паэзіі і некаторыя паэты, як Багдановіч, Бядуля, Ясакар, Трус, Арсеньнева і іншыя асягнулі ў гэтай галіне даволі паважныя рэ-

зультаты. Танк аднак астаўся незраўнаным. Матывы народных казак і песьняў, якія паэт уплятае ў свае творы, тыповыя казачныя выражэньні і наагул форма народнае творчасьці атрымліваюць у ягоным паэтыцкім перетварэньні нейкую асаблівую выразнасьць і дзіўную красу, захоўваючы адначасна свой народны характар. Танкавыя *Казкі,* а таксама блізкі да іх *Сказ пра Вяля* — гэта поўнасьцю арыгінальныя творы, бо з народнае крыніцы бярэ ён толькі паасобныя, часта зусім незалежныя ад сябе матывы і з асаблівым вычуцьцём смаку і меры пераплятае іх з сваімі ўласнымі помысламі. Вынікам такой мэтоды і агульных тэндэнцыяў Танкавай паэзіі мы атрымліваем нятолькі артыстычны твор высокай якасьці, будучы так у сваей фабуле, як і багатай стылёвай арнамэнтыцы прыгожай стылізацыяй народнае творчасьці, але так-жа мастацкі твор арганічна зьвязаны з актуальным жыцьцём.

Чароўнай пэрлай зьяўляецца кароткі ўступ да Казак: *Гэта даўна было.* Сваей паэтыцкасьцю і сьвежым лірызмам перавышае ён падобны ўступ Пушкіна, дадзены да паэмы *Руслан і Людміла,* які пачынаецца ад слоў: *У лукоморья дуб зеленый...* Дзьве першыя казкі *Мухамор* і *Казка пра мядзьведзя,* якія аўтар спэцыяльна прысьвяціў для дзяцей, вызначаюцца асаблівай яснасьцю й прасьцінёй, але разам з гэтым зьяўляюцца далёкімі ад прымітывізму. Затое *Казка пра Музыку* мае даволі разьвітую фабулу, якая лучыць у сябе многа фольклёрыстычных і арыгінальных матываў і зьмяшчае глыбокія народныя сымболі, што можа быць пастаўленай побач із *Сказам пра Вяля.* Усе мастацкія асаблівасьці апрацаваньня народнага матар'ялу ў Танка, аб якіх была мова вышэй, выступаюць у гэтай казцы ў цэлай паўніні. Асабліва цікавым і нявымоўна прыгожым ёсьць тутака паэтыцкае пераданьне пры пасярэдніцтве канкрэтных сымболяў ігры на зачараванай жалейцы. Ды і наагул артыстычнае апрацаваньне цэлага твору, асабліва дзіўная мілагучнасьць мовы, пластычнасьць і канкрэтнасьць стылю, узбагачанага тыповымі казачнымі выражэньнямі, асягіваюць тут нязвычайна высокую ступень. Усё гэта сьведчыць, што ў гэтай галіне — у галіне артыстычнага апрацаваньня народнае творчасьці шмат чаго можым яшчэ спадзявацца ад Танка.

МІХАСЬ МАШАРА

Сум васеньні

На кудрах дня,
у далях сініх
ляжыць туга аж да зары;
аб нейкіх стратах і прычынах
у сэрцы сум загутарыў.

У сонцы выцьвіцелі травы
і адшумелі каласы;
бярозкам стройным для забавы
цярэбіць вецер валасы.

Ні якай зелені,
ні красак, —
ёсьць хварбы шэрыя
і медзь;
і ня шукай прыгожых казак —
вучыся верыць
і цярпець.

Сусьвет плыве дарогай млечнай,
я кожны час цьвярджу сабе;
і будні шэрыя ня вечны
і сум васеньні праміне.

Дзікава, 25.VIII 1938 г.

ХВЁДАР ІЛЬЛЯШЭВІЧ

Расшумеліся ветры...

Расшумеліся ветры на прасторы у полі,
На прасторы у полі, ў цёмным лесе-бары.
Разрываюцца хмары ў безьбярэжжы — прывольлі,
Ў гэтай далі — бязьмежжы балатоў, азярын.
На ўскалошаным полі, на прасторы шырокім
Упаду на зямлю я, упаду проста ніц, —
Паплыву ў хвалях шуму з пад палёў беластоцкіх
Да дняпроўскіх лугоў, аж да слуцкіх пшаніц.
Мо мне вецер раскажа, як у гэтых зарэччах
Рассыпаў нехта сьлёзы і у змрок галасіў.
Мне так часта здаецца у жаўцеючы вечар,
Што каменьне на полі — гэта жнеі бяз сіл.
Распляліся іх косы і апалі прыгожа,
Вецер з рук абамлелых не разьвеяў ім сны,
І яшчэ замірае сьпеў працяжны на пожні
З тых гадоў, калі ў жыце упалі яны.
Мо мне вецер раскажа, як у гэтых зарэччах
Беларуская доля зацьвітала нераз,
Як адлівам пажараў над аўсамі, над грэчкай
Цёмнай ноччу займалася, палымнела зара.
Расшумеліся ветры на прасторы у полі,
На прасторы у полі, ў цёмным лесе-бары.
Зацьвітала нераз беларуская доля
Ў гэтай далі бязьмежнай балатоў, азярын.
Столькі раніцаў мглістых, столькі восеняў шэрых,
Ў нашых песьнях іржавіць жоўталісьцем сухім.
Галасамі вясёлымі з берагу ў бераг
Скалыхнем аж да сіні веснавой небасхіл.
Трэба ў ветру парывах настроіць нам гусьлі,
У жытох яго буйную волю скасіць.
З над палёў, дзе дым сьцелюць Беласток і Супрасьль,
Аж да слуцкіх пшаніцаў калосьсе шуміць.

13.VIII 1938 г.

Прыяцелю

Так раставацца, мой дружа,
Не раставаўся на сьвеце ніхто!
Прыязьні вытканы кужаль
Не падзёр паравозны сьвісток.
Помніцца вечар той сіні...
Вецер вясеньні нам словы размыў —
Ў вулках маленечкіх Вільні
Гаварылі да поўначы мы.
Места, дзе сны адцьвілі нам,
Мачыхай злоснай здалося тады
Хутка так ніклі хвіліны,
Як на станцыі ўсхмараны дым.
Ў хвалях кіпучага сьвету
Ты на чужыне, няведамы, зьнік.
Вольныя, буйныя ветры
Разьвяваюць цяпер мае дні.
Ды і ў далёкіх прасторах —
Як і тады у вакне цягніка —
Прыязьні нашай задорам
Перапоўнена так-жа рука.

Дзень павіс шэрай хусткай

Дзень павіс шэрай хусткай на плоце —
ой, у полі мгляно, мгляно —
ў вёсцы нават ніхто не малоціць —
дождж імжой шалясьціць у вакно.

Дзе ні глянь — адно возера белі,
быццам недзе мой край патануў...
Цяжка так неадрыўна кудзеліць —
выглядаць у тумане вясну.

Можа, хлопцы, ня гэтак вам сумна
у нягскошанай мерці глушы —
часам певень ці конь каля гумнаў
вас, буянаў, да сьлёз рассьмяшыць.

Але мне не да сьмеху сягоньня —
гэты дзень мне ўсё нешта чаўпе —
у барку, у прыборку зялёным
восень тчэ свае кросны цяпер.

Навучыцца-б у вас, мае братцы,
замяніць ды у панцыр кажух!
Толькі сэрца ня хоча суняцца,
а чаму? — я і сам не скажу.

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

АНАТОЛЬ ІВЕРС

Над Шчарай

Заігралі ветры ў полі,
заігралі пераліўна —
і калышуцца таполі
ў небе ласкавым і дзіўным.

І вясёлкай серабрыцца,
паясом ў даліне Шчара,
а з пад вёслаў—пэрлы быццам
пырснулі із казкі чараў.

Між далінаў і між гораў
лезе лодка плаўкім клінам.
На узьмежку нібы мора
шумам пеніцца каліна.

І каціліся з аддальля
песьня — сонца пазалота
і зьлівалася на хвалях
ў гібкім гомане чаротаў.

Берагі: шумяць калосьсяў
схваляваныя палотны,
ў шыр кладзецца зыб пакосаў
асакі й сіты балотнай...

Ў даль па зрэбных каляінах
распаўзьліся дні і ночы —
іх зьбярэ мая Краіна
у вясёлкавы вяночак!

Дзе ні глянь—усё сэрцу блізка:
вёска, лес, вузкі палетак —
Пэўна маці над калыскай
напяяла мне пра гэта

С. ХМАРА

* * *

Сэрца чароўна пяе самагудамі.
Ой, ап'янелы вачыма я восеньню.
З месяцам лаюсь:
Сабака руды ты!
Вылез па што?!
Як цябе мы ня просімо...
Нізка вярбіны над намі схіліліся...
Не! —
Не напіцца мне воч тваіх просіньню.
З плеч быццам дзесяць гадоў адвалілася...
Ой ап'янеў! —
па вясноваму —
восеньню...

С. КАЛІНА

Літаратура ў адносінах да жыцьця

(Глядзі кн. 2(15) „Калосься“).

2.

Літаратура і рэальнае жыцьцё

У папярэднім разьдзеле дайшлі мы да вываду, што літаратура ў найшырэйшым разуменьні зьяўляецца заўсёды адбіцьцём ці візіяй праўдзівага жыцьця, паказанага ў тым ці іншым артыстычным аспэкце. Незалежна ад таго, ці фабула літаратурнага твору ёсьць чыстай выдумкай, ці аснована на праўдзівым выпадку, твор гэты заўсёды адбівае ў сабе нейкі фрагмэнт жыцьця, фізычнага ці псыхічнага, можа разьвіваць у сабе нейкую праблему альбо праводзіць тую ці іншую ідэю, цесна зьвязаную з рэальным жыцьцём, ды напасьледак нават матар'ял для стылістычных асаблівасьцяў і літаратурных сымболяў чэрпае беспасярэдна з акружаючага жыцьця. Такім спосабам літаратурнае мастацтва вырастае беспасярэдна з жыцьця, корміцца ягонымі сокамі, узалежняе кірункі свайго разьвіцьця і свой аснаўны характар ад жыцьцёвых акалічнасьцяў і вымаганьняў.

У сувязі з гэтым заўсёды паўставала і паўстае пытаньне, якое становішча павінна займаць літаратура адносна актуальных патрэбаў жыцьця: ці яе заданьнем ёсьць уплываць на ход жыцьця і надаваць яму той ці іншы кірунак, ці наадварот — мусіць яна поўнасьцю адгарадзіцца ад жыцьцёвых патрэбаў, творачы замкнуты ў сабе мастацкі сьвет? Спасярод розных становішчаў адносна гэтага пытаньня, два зь іх зьяўляюцца сяньня асабліва актуальнымі. Адно зь іх адкідае аўтанамізм літаратуры, дамагаючыся, каб была яна заўсёды на службе жыцьцёвых і грамадзкіх праблемаў і сьцісла падпарадкавалася гэтым апошнім, а другое — ваюе за літаратуру незалежную, „чыстую“, якая мусіць разьвівацца згодна з прынцыпам „мастацтва для мастацтва“. Такім спосабам заданьнем літаратуры паводле першага кірунку зьяўляецца ня толькі заспакайваньне эстэтычных патрэбаў чытача, якія, як ведаем, зьяўляюцца неабходнымі ў духовым жыцьці кожнага чалавека, ад прымітыўнага яго стану аж да высокага культурнага роўня, але так-жа, а нават перадусім — разьвіцьцё і ўзбагачваньне ягоных вартасьцяў маральных, грамадзкіх, этычных і г. д., накіданьне і прышчэпліваньне яму тых альбо іншых жыцьцёвых перакананьняў. Затое апошні кірунак задзержываецца ўсяго толькі на першых вартасьцях, як аснаўных і выключных для кожнага мастацтва, адступаючы другія для іншых галінаў людзкой творчасьці.

© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

Падыходзячы да справы з гледзішча самой істоты літаратурнай творчасьці, якая, як было гаворана, зьяўляецца артыстычнай візіяй запраўднага жыцьця ў цэлай ягонай шырыні, рэч ясная, што аніводная з гэтых спробаў разьвязаньня пастаўленага пытаньня ані чуць ня можа нас задаволіць.

Наўперад трэба засьцерагчыся, што крытыкуючы першае становішча, якое хоча ўважаць літаратуру за аружжа ў грамадзкім жыцьці, не ідэнтыфікуем яго ў ніякім прыпадку з тым станам, які самаўладна пануе сяньня ў Саветах, часткава так-жа ў дзяржавах фашыстаўскіх (Нямеччына, Італія). Літаратурнае мастацтва, будучае тамака точна падпарадкаванае дырэктывам палітычна-партыйным і рэгуляванае паліцыйнымі ворганамі, зьяўляецца патрактаванае ў спосаб найбольш вульгарны і цынічны, які выключае ўсякую рачовую дыскусію на гэтую тэму. Ведаем добра на прыкладзе тых-жа самых сяньняшніх Саветаў, якія рэзультаты прыносіць такая мэтода: літаратурная творчасьць, замест таго, каб вольна й свабодна выражаць творчыя парывы чалавечае думкі, каб тварыць што раз новыя абсалютныя мастацкія цэннасьці, зьніжылася там да ролі актуальнае „агіткі", непрызваітых пашквіляў на розных непажаданых сяньня людзей, або напасьледак — панэгірыкаў і пахвальных гімнаў на чэсьць Сталіна.

Але нават не бяручы пад увагу стану, пануючага ў Саветах, трэба сьцьвердзіць, што імкненьне да падпарадкаваньня літаратуры актуальным жыцьцёвым патрэбам не разьвязвае сытуацыі, калі ўявім сабе, што літаратура, будучая мастацкім выяўленьнем і адбіцьцём жыцьця, мусіць мець усе магчымасьці, каб з жыцьцёвай запраўднасьці чэрпаць свабодна і выбіраць тое, што найбольш адказуе артыстычным мэтам песьняра. З гэтага самага гледзішча ня выдзержуе так-жа крытыкі і другое становішча, якое, высоўваючы прынцып „мастацтва для мастацтва", стараецца поўнасьцю адсэпаравацца ад жыцьцёвых актуальных праблемаў, хочучы, каб літаратура была глухая на ідэі і настроі масы. Паколькі ў жыцьці дадзенага народу ці грамадзянства разьвіваюцца і дасьпяваюць тыя альбо іншыя ідэі і праблемы, гэтым самым могуць яны знаходзіць месца ў літаратуры. Абодвы гэтыя становішчы на наш пагляд вельмі ўпрошчываюць даволі скамплікаванае й багатае пытаньне адносінаў літаратуры да жыцьця, тады, калі шукаючы разьвязкі ягонай мусім узяць пад увагу цэлы рад аснаўных асаблівасьцяў літаратурнага мастацтва.

Ужо з гледзішча на тое, што літаратура зьяўляецца артыстычным выражэньнем запраўднасьці, былі мы змушаныя адкінуць абодвы вышэй пададзеныя становішчы, якія ненатуральна звужалі-б літаратурнае мастацтва і агранічвалі-б яго творчыя магчымасьці. Але ня менш важную ролю гуляюць тутака і індывідуальныя зацікаўленьні і творчыя асаблівасьці аўтара, якія адносяцца ня толькі да спосабу артыстычнага апрацаваньня матар'ялу, але ў няменшай меры і да выбару яго: адныя тэмы могуць адказваць прыродным творчым магчымасьцям аўтара, другія — не. Гэтую цікавую асаблівасьць пастараемся паказаць на прыкладзе творчасьці Янкі Купалы й Максіма Багдановіча.

Усю аграмадную Купалаўскую творчасьць з гледзішча на ейную тэматыку можым падзяліць на дзьве часьці: адна — гэта творы з выразным ідэолёгічным зьместам, у якіх натхнёны пясьняр кідае гарачыя прызывы народу, вешчым голасам заклікае яго прачнуцца і будаваць свой собскі нацыянальны быт, прарочыць яму сонечную будучыню і г. д., другая часьць — гэта лірыка рэфлексыйна-апісальная, прысьвечаная асабістым перажываньням і ўражаньням, праблемам жыцьцёвым, апісаньню беларускае прыроды, любоўным пачуцьцям і г. д. І вось, калі гэтыя апошнія творы, якіх аграмадная большасьць не зьяўляецца з гледзішча артыстычнай іх вышыні нечым нязвычайным на фоне сучаснай літаратурнай творчасьці, а некаторыя зь іх зусім ня розьняцца ад творчасьці іншых „нашаніўскіх" паэтаў і прадстаўляюць сяньня адно толькі вартасьць гістарычную, патолькі творы першае групы зьяўляюцца незраўнанымі з гледзішча іх мастацкага апрацаваньня і сілы сугэстыі, іх артыстычная вартасьць непрамінаючая. Дзеля лепшага ўяўленьня гэтае розьніцы возьмем хоць-бы „Шляхам Жыцьця", зборнік найбольш рэпрэзэнтатыўны побач із „Спадчынай". Не бяручы пад увагу перакладаў, на дзьвесьця тры вершы і дробныя паэмкі, зьмешчаныя ў гэтым зборніку, вызначаюцца няштодзенным мастацкім апрацаваньнем і замыкаюць у сабе вялікую сугэстыўную сілу больш менш толькі наступныя творы: *1. Песьня мая, 2. Маладая Беларусь, 3. Песьня байка, 4. Песьня сонцу, 5. Выйдзі, 6. Песьня званара, 7. Ня ўздыхай, 8. Яшчэ прыдзе вясна, 9. За праўду, 10. Мая думка, 11. Я ад вас далёка, бацькаўскія гоні, 12. Зваяваным, 13. Забраны край, 14. Над Нёмнам, 15. Ужо днее, 16. Роднае слова, 17. Чужым, 18. Прарок, 19. Не пагаснуць зоркі ў небе, 20. Лірнік вясковы, 21. Песьняру Беларусу, 22. Наша песьня, 23. На Куцьцю, 24. Курган, 25. На папасе*).*

Творы гэтыя, якія прадстаўляюць толькі восьмую частку ўсяго зборніка, — а падобныя колькасныя адносіны зацемім і ў іншых зборніках Купалы — зьяўляюцца найбольш улюбленымі і найшырэй знанымі ягонымі творамі, іх заўсёды дэклямуюць на розных імпрэзах, перадрукоўваюць у хрэстаматыях і іншых зборных выданьнях. Пералічаныя вершы й паэмкі, якія, дзякуючы высокай мастацкасьці, магутным і глыбокім пачуцьцям, урачыстаму паднятаму настрою, ня маюць сабе роўных у нашай літаратуры і высоўваюць Купалу на найвялікшага беларускага песьняра, зьяўляюцца якраз аснаванымі выключна на грамадзкім

*) Прапаную кожнаму зрабіць на ўласную руку падобную клясыфікацыю Купалавых твораў з гледзішча на сілу і характар выкліканых імі перажываньняў. Хаця могуць быць некаторыя розьніцы ў прыраўнаньні з маім падзелам, які, ясна-ж, зьяўляецца суб'ектыўны і зроблены адрыўча, аднак у вагульных рысах мусяць яны згаджацца.

матар'яле і вызначаюцца багатым ідэолёгічным зьместам. Усё-ж іншыя творы, калі і прадстаўляюць некаторыя няштодзенныя вартасьці, то аднак далёка не дараўноўваюць пералічаным, а ладная іх частка наагул слабая.

Такім спосабам уся Купалаўская творчасьць вымоўна сьведчыць, што ня ўсякія тэмы могуць удавацца аднаму й таму самаму аўтару і што дзеля гэтага мусіць быць адпаведны іх выбар у залежнасьці ад творчых асаблівасьцяў артысты. А што гэты выбар не заўсёды можа пакрывацца з тэмамі найбольш важнымі і актуальнымі для канкрэтных жыцьцёвых патрэбаў, ня менш вымоўна сьведчыць характар творчасьці М. Багдановіча. На падставе біографічных дадзеных ведаем, што Багдановіч быў ня меншым патрыётам за Купалу, ведаем так-жа, што пісаў ён якраз у тым часе, калі апяваньне нацыянальных і соцыяльных ідэалаў было свайго роду маральным абавязкам кожнага паэта й пісьменьніка, аднак сярод адноснa багатай ягонай літаратурнай спадчыны знаходзім усяго некалькі вершыкаў, якія прысьвяціў беларускім грамадзкім пытаньням. Пры гэтым вершы гэтыя не належаць да найлепшых, а ўвесь чар і краса Багдановічавай паэзіі выступае ў творах, нячулых на жыцьцёвыя патрэбы: у творах прыродаапісальных, у лірыцы суб'ектыўна — псыхолёгічнай, вершах рэфлексыйных.

Прыклады з Багдановіча й Купалы вымоўна пацьвярджаюць, што індывідуальная артыстычная структура песьняра і аснаўны характар і кірункі ягоных творчых зацікаўленьняў зьяўляюцца дэцыдуючымі ў літэратурнай творчасьці, у дадзеным прыпадку— у выбары і прасьцягу тэматыкі твору. Дык калі-б напрыклад з поўнай срогасьцю дамагацца, што літаратура мусіць быць точна падпарадкаваная жыцьцёвым патрэбам і верна служыць ім, то консэквэнтна трэба было-б адкінуць усю творчасьць Багдановіча. І наадварот — ня мог-бы паявіцца ў беларускай літаратуры геній Купалы, калі-б бяскрытычна стаць на становішчы, што літаратурны твор, згодна з прынцыпам „чыстага“ мастацтва ці „мастацтва для мастацтва“, павінен быць глухі на праявы і працэсы актуальнага жыцьця. Дык ясна выплывае з усяго гэтага, што адзінай правільнай дарогай песьняра ёсьць заўсёды йсьці за голасам свайго артыстычнага сумленьня, не аглядаючыся на розныя спакусы і не разьменіваючыся сярод цэлага камплексу зьявішчаў, не заўсёды адказуючых ягоным магчымасьцям, бо ўсё гэта можна вельмі лёгка зьвіхнуць нават вялікі творчы талент. Блага таму аўтару, які, адарваўшыся ад свайго прыроднага караня, пачне ўсяго толькі экспэрымэнтаваць у кірунку, супярэчным з характарам сваей творчасьці, альбо, ганяючыся за папулярнасьцю, стараецца ненатуральна і аднастаронна зьніжацца да роўні ўсіх чытачоў, замест падцягнуць гэтых апошніх да вышыні свайго таленту.

(д. б.)

М. ШКЯЛЁНАК

Тэрыторыя Беларусі і яе дагістарычнае насельніцтва

(Працяг, глядзі № 2(15) „Калосься“)

Яшчэ нядаўна спорным было пытаньне, калі зьявіўся чалавек на тэрыторыі Беларусі. Лічылася агульна прынятай думка, што сьляды чалавека ў Беларусі даходзяць толькі да пазьнейшае пары каменнага пэрыяду — *нэоліту**). І хоць раскопкі на тэрыторыі Беларусі выкрылі шмат месцаў з астачамі жывёлы ледавіковае пары (косьці маманта, паўночнага аленя і інш.), што наводзіла на думку існаваньня і чалавека ў гэтую пару, а ўжо Сементкоўскі казаў, што ў зьбіральнікаў і аматараў старыны Віцебшчыны ён бачыў прылады „бяз ніякіх азнак шліхоўкі“,**) праф. А. Сьпіцын на першым зьездзе дасьледчыкаў беларускае археолёгіі і археографіі ў Менску (17—18. І. 1926 г.) усё-ж заявіў, што існаваньне чалавека на тэрыторыі Беларусі ў пару палеоліту астаецца загадкай.***)

Але посьле гэтай аўторытатыўнае заявы яшчэ ўлетку таго-ж 1926 г. пытаньне гэтае атрымала неспадзеўкі новае асьвятленьне. Сябра гістарычна-археолёгічнае камісіі б. Інстытуту Беларускае Культуры ў Менску К. Палікарповіч натрапіў каля вёскі *Бердыж*, чачэрскага раёну, гомельскае акругі, на стаянку палеолітычнага

---

*) Каменны пэрыяд у жыцьці чалавецтва характарызуецца ужываньнем прыладаў з камяня, рагоў, касьцей і дрэва. Каменнага пэрыяду, як унівэрсальнай на зямлі эпохі з азначаным пачаткам і агульным канцом, не існавала. Розныя плямёны і народы перажывалі ў розную пару гэтую культуру, а яшчэ і сяньня ёсьць народы на гэтай ступені разьвіцьця. Каменны пэрыяд дзеліцца на больш старэйшую пару — палеоліту, калі чалавек выробляў сабе прылады з крэмня, яшмы і іншых цьвёрдых пародаў, бяз ніякае іх шліхоўкі, і пазьнейшую — нэоліту, — калі прылады выробляліся з мякчэйшых пародаў і шліхаваліся з помаччу вады і пяску. Найбольш ужыванымі прыладамі шліхаванымі былі тапары і малаткі (шмат гэткіх знаходкаў на тэрыторыі Беларусі можна бачыць у Беларускім Музэі ў Вільні). Між гэтымі порамі была пара мэзоліту, калі побач із шліхаванымі ужываліся нешліхаваныя прылады.

**) Сементковскій. Бѣлорусскія древности в. І. б. 85.

***) У існаваньні чалавека ў Беларусі у пару палеоліту апрача вышэй успомненых дадзеных, праф. А. Сьпіцына не пераканалі і знаходкі Е. Раманава, якія ён залічыў да палеоліту. Дачка Раманава прыслала ў Акадэмію Навук СССР дзьве пляншэты з гэтымі знаходкамі. Знаходкі апісаны Е. Раманавым у працы „Матеріялы по исторической топографіі Витебской губ. 1898 г.“, б. 18—23.

чалавека. К. Палікарповіч знайшоў у ваколіцы гэтае вёскі сярод касьцей маманта некалькі зробленых чалавекам адшчэпкаў крамня і дзьве ножападобныя прылады, на якіх былі сьляды дробнай штучнай адбіўкі (г. зв. „рэтуш"). „Гэтая апрацоўка крэмняў, сувязь іх з пэўным гэолёгічным пластом (марэнны суглінак), сьляды вагню, прысутнасьць костак розных выкапальных жывёлаў, непарушанасьць усіх пластоў, не выклікае—кажа Палікарповіч—ніякага сумліву, што тут маем астачы палеолітычнае культуры часу вялікага зьледзяненьня". *) Хутка, бо ў 1929 г., была знойдзена другая палеолітычная стаянка у в. *Юравічы* на Прыпяці каля Мозыра, а потым *нова-бабовіцкая*. Трэба лічыць, што і стаянка ў в. *Гамкаве*, смаленскае акругі, ёсьць палеолітычнай. **)

Гэтыя стаянкі маюць вялікую навуковую вартасьць. У сэнсе тэрыторыяльным (прынамся ў гістарычных межах) беларускімі трэба лічыць дзьве раней ад вышменаваных знойдзеныя палеолітычныя стаянкі, паіменна *супонеўскую* каля Бранску і *мезінскую* на Дзясьне, на паўдзён ад г. Ноўгарад-Северскага. Аднак з факту, што на межах Беларусі былі палеолітычныя стаянкі, яшчэ ня можна было рабіць высноваў аб існаваньні ледавіковага чалавека на тэрыторыі Беларусі. Апісаныя знаходкі высьняюць гэтае пытаньне і дазваляюць з усей пэўнасьцю адсунуць пачатак каменнай культуры насельнікаў Беларусі даледавіковай пары.

Палеоліт зьмяніла наступная пара — *нэолітычная*, або шліхаванага камяня. Факт існаваньня чалавека ў Беларусі ў гэтую пару выплывае з папярэдняга і сьцьвярджаецца ўжо шматлікімі знаходкамі гэтай пары. Каменных прыладаў нэоліту знойдзена шмат на тэрыторыі ўсяе Беларусі. Параўнальна дагэтуль найбольш іх аказалася ў *Віцебшчыне, Віленшчыне, Меншчыне, Магілёўшчыне і Полаччыне*, найменш — у *Горадзеншчыне, Слонімшчыне, Ваўкавышчыне, Беласточчыне, Смаленшчыне*. ***) Апрача

---

*) Даклад К. Палікарповіча ў гістарычна-архэолёгічнай Камісіі Інстытуту Беларускае Культуры ў Менску (глядзі Гістарычна-архэолёгічны зборнік № 1 Інст. Белар. Культуры, Менск, 1927, б. 358—360, апрацаваньне З. Даўгялы).

**) Вывучэньнем гэтых стаянак займаліся беларускія архэолёгі Г. Мірчынк, В. Громаў, С. Замятнін, К. Палікарповіч, А. Ляўданскі (глядзі „Запіскі Аддзелу Гуманітарных Навук, кн. II. Працы Археолёгічнае Камісіі, том II. Бел. Акад. Нав. Менск, 1930, дзе зьмешчаны іхнія працы).

***) З гэтага відаць, што нэолітычны чалавек гусьцей жыў на ўсходзе Беларусі. Пярэчыў-бы гэтаму факт, што нэолітычных знаходак адносна мала адкрыта ў Смаленшчыне. Трэба аднак узяць пад увагу, што досьледы Смаленшчыны з гэтага гледзішча пачаліся толькі ў 1924 г. беларускімі архэолёгамі. Гэтак А. Ляўданскі ў 1924 г. знайшоў першую нэоліт. стаянку ў 20 клм. ад Смаленска каля ст. Катынь, а другую ў 1925 г. 24 клм. ад Смаленска недалёка ад вёскі Ніжніх Нямыкараў. У гэтым-жа 1925 г. Н. Савін знайшоў нэоліт. стаянкі ў дарагабужскім павеце, каля Дарагабужу і ўніз па Дняпры ў в. Хатычкі, Бізюкова, Аляксейкава, Бабаедава і на р. Угры пры ўтоку ў яе р. Вароны. Ёсьць сьляды нэолітычных стаянак і каля в.в. Ліцьвінава і Стара-Меншыкава, вяземскага пав. Магчыма дзеля гэтага, што адносная рэдкасьць нэоліт. знаходак у Смаленшчыне аб'ясьняецца спозьненымі досьле-

маладых беларускіх архэолёгаў, нэолітычныя стаянкі ў Беларусі знайшлі, або іх студыявалі, галоўна да вайны, расейскія і польскія архэолёгі, як *А. Сементкоўскі*, графы *Уваравы*, графы *Тышкевічы, Ф. Дабранскі, Татур, Н. Авэнарыус, М. Кусьцінскі, Е. Раманаў, В. Шукевіч, А. Сьпіцын*, і іншыя *). Былі гэта пераважна архэолёгі-аматары, каторыя займаліся галоўна раскопкамі курганоў і ў гэтых працах траплялі на астачы нэолітычных стаянак у Беларусі. З боку адпаведных архэолёгічных расейскіх ці польскіх установ ня было наладжана сыстэматычных і пляновых досьледаў. Архэолёгі-аматары абшар досьледаў выбіралі прыпадкова. Дзе гэтых аматараў ня было, там агулам і ніякае архэолёгічнае працы не вялося, хіба якімсь адумыслова прыехаўшым з „цэнтру" архэолёгам і зь якойсь спэцыяльнай мэтай. **)

Нешматлікія знаходкі не даюць яшчэ магчымасьці пазнаньня жыцьця палеолітычнага чалавека ў Беларусі. Затое адносна

дамі, як дапушчае і А. Ляўданскі, але ня выключаецца думка, што нэолітычны чалавек жыў тут радзей. Тады трэба было-б лічыць, што гэты чалавек найгусьцей жыў у сярэдняй Беларусі (глядзі А. Ляўданскі. Нэолітычныя стаянкі ў Смаленскай губ. Гістарычна-архэолёгічны зборнік Інстытуту Беларускае Культуры № 1. Выданьне І.Б.К. Менск, 1927 г., б. 177—179).

*) Падамо тут найгалаўнейшыя працы гэтых дасьледчыкаў, у якіх можна знайсьці дадзеныя аб нэолітычных знаходках у Беларусі. А. Сементковскій. Бѣлорусскія древности в. I. Спб. 1890 г. А. Уваровъ. Археологія Россіи т. II. Москва 1891 г., б. 39—46, 51—53, 137—138. E. Tyszkiecz. Badania archeologiczne, Wilno, 1850 г. Ф. Добрянскій. Каталогъ предметовъ Музея Древностей, состоящаго при Виленской Публичной Библиотекѣ, Вильна, 1879 г. Татуръ. Очеркъ археологическихъ памятниковъ на пространствѣ Минской губерніи. K. Tyszkiewicz. O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej, Berlin, 1868 г. Н. Авенаріусъ. Замѣтка о раскопках въ Минской губерніи въ 1889 и 1890 годахъ (Труды Виленскаго Оддѣленія Моск. Предвар. Комитета по устройству въ Вильнѣ IX Археологическаго Съѣзда. Вильна, 1893). М. Кустинскій. Докладъ о раскопкахъ въ области Кривичей (Древности, т. IV. Москва. 1874 г.). Е. Романовъ. О раскопкахъ въ Могилевской губерніи (Древности, т. XII. Москва, 1888 г.). Яго-ж. Раскопки въ Могилевской губ., въ 1888 г. (Древности т. XIII. в. I. Москва, 1889 г.), Яго-ж. Археологическія развѣдки въ Могилевской губ., Вильна, 1912 г. Яго-ж. Матеріялы по исторической топографіи Витебской губ., Могилевъ, 1898 г. Яго-ж. Археологическій очеркъ Гомельскаго уѣзда, Вильна, 1910 г. П. Лерхъ. Орудія каменнаго і бронзоваго вѣковъ въ Европѣ (въ Изв. Имп. Арх. Общ. т. IV. Спб. 1863 г.). Глядзі так-жа: Каталогъ Собранія древностей гр. А. С. Уварова, Москва, 1887 г., б. 21 і Каталогъ предметовъ выставки VIII археологическаго съѣзда, Москва, 1890 г.

**) Праўда, у 1869 г. у Вільні паўстаў г. зв. „Сѣверо-Западный Отдѣлъ Импер. Русскаго Географ. Общества", пры якім была створана сэкцыя архэолёгіі, якая магла-б заняцца сыстэматызаваньнем архэолёгічных досьледаў і іх вывучэньнем. Аднак да 1910 г. увесь аддзел разам з сэкцыяй існаваў толькі на паперы. У 1910 г. ён быў узноўлены. Аддзел зьмясьціў некалькі прац архэолёгаў-аматараў, пераважна з курганнай пары, у сваіх „Записках" і плянаваў сыстэматычнае вывучэньне краю з гледзішча яго архэолёгіі, аднак гэтаму перашкодзіла вайна (глядзі „Записки" Сѣв.-зап. отдѣл. Имп. Рус. Геогр. Общ. за 1911—1913 г., выдадзеныя ў Вільні). З гледзішча архэолёгічнага мелі сваё значэньне ладжаныя ў розных гарадох Імпер. Археол. Об-ствам у Маскве штогоднія архэолёгічныя зьезды, на якія прыгатаўляліся даклады аб архэолёгічных здабытках у розных краінах б. Расеі і між іншым у Беларусі.

нэолітычнае пары вучоныя робяць на аснове ўжо дасюлешніх знаходкаў высновы аб жыцьці чалавека ў гэтую пару, прычым некаторыя з іх можна лічыць цьвёрда устаноўленымі навукова. Дасьледчыкі кажуць, што нэолітычны чалавек у Беларусі жыў пераважна на берагох рэк і надта рэдка на берагох вазёр.*) Жыльлём для гэтага чалавека былі зямлянкі, але ня выключана, што ён будаваў адумысныя для гэтага шалашы.

Гэта асабліва пацьвяржаецца знаходкамі беларускіх архэолёгаў за апошние дзесяцігодзьдзе. Сьцены гэткага шалаша рабіліся з гальля, абмазанага глінай, а магчыма і са скуры зьвяроў. Падлога рабілася з бітай гліны, а пасярод яе знаходзілася вогнішча наўперад дзеля прыгатаваньня ежы. Астачы глінянае пасуды паказваюць, што чалавек ёю карыстаўся і ўмеў вырабляць. Пасуда ляпілася з гліны чырвонае, або шэрай, дрэнна апаленай, з дамешкаю пяску або жарствы. Форма пасуды была розная, орнамэнт просты і даволі аднастайны.**) Асядаючы па берагох рэк і вазёр нэолітычны чалавек здабываў у іх для сябе яду — рыбу і асобную ракавіну, г. зв. unio pictorum. Па берагох-жа рэк ён знаходзіў для сябе ў вялікай колькасьці крэмень, служыўшы для вырабу каменных прыладаў.***) У лясох чалавек паляваў на зьвярыну. *Рыбалоўства* і *паляваньне* былі найгалаўнейшымі заняткамі нэолітычнага чалавека ў Беларусі. Хоць насельніцтва каменнага пэрыяду ў Беларусі групавалася па бера-

---

*) На стаянкі на берагох вазёр натрапілі В. Шукевіч у Лідчыне, вазёры Дуба, Мачулы і інш., Е. Раманаў у б. себескім пав. (Глыбочанскае воз.). К. Палікарповіч у б. клінцоўскім пав. (Кажаноўскае воз.). К. Палікарповіч у 1926 г. знайшоў нэолітычную стаянку каля балота Печанеж, касьцюковіцкага раёну ў вадазборы р. Бесядзі (прыток Сажа). Гэты факт пярэчыў-бы ўспомненым высновам, але Палікарповіч тлумачыць, што балота Печанеж у нэолітычную пару было возерам, а з часам замянілася на балота. Апошняя знаходка Палікарповіча (каля балота Печанеж) мае вялікую вагу. Як вядома, у археолёгіі пануе а д н о с н а я хронолёгія. Няма магчымасьці устанавіць а б с а л ю т н ы я даты трываньня нэоліту ў Беларусі. Знаходкі каля Печанежа паводле Палікарповіча могуць спрычыніцца да ўстанаўленьня абсалютнае хронолёгіі, а гэта шляхам дасьледваньня часу паўстаньня тарфяністага балота на месцы возера на аснове арганічных астачаў у тарфянішчах (глядзі К. Палікарповіч—Нэолітычная стаянка каля балота Печанеж на Калінішчыне, Гіст.-арх. зборнік І.Б.К. № 1, Менск 1927 г., бач. 235—240). Тады магчыма было-б азначыць час, калі панаваў нэолітычны пэрыяд у культуры насельнікаў Беларусі. Дагэтуль нэолітычную пару ў Беларусі прыблізна азначаюць не пазьней, як на 1000 гадоў да Нар. Хр. (Аб гэтым глядзі Л. Н і д э р л е. Человѣчество въ доисторическіе времена, переводъ Волкова, Спб. 1898 г., бач. 174, А. С п и ц и н ъ. Обозрѣніе нѣкоторыхъ губерній и областей Россіі въ археологическом отношеніи. у розных месцах, Карскі, Бѣлоруссы кн. І. бач. 30 — 32, які паўтарае прыпушчэньне першых двух). Ёсьць гэта аднак пакуль што толькі гіпотэза.

**) Аб шалашы, як жыльлі чалавека ў пару нэоліту, глядзі працу А. Л я ў д а н с к а г а. Нэолітычныя стаянкі ў Смаленскай губ. (Гіст.-археолёг. Зборнік І.Б.К. № 1, 1927, Менск). Высновы свае аўтар апірае на аснове знаходак стаянкі ў в. Ніжнія-Нямыкары ў Смаленшчыне. З гэтага гледзішча знаходкі ў Ніжніх-Нямыкарах надта вартасныя.

***) У в а р о в ъ о. с. бач. 39 — 41, С е м е н т к о в с к і й, о. с. бач. 80, Л е р х ъ, о. с. бач. 168 і наст. Т а т у р ъ, о. с. бач. 58.

гох рэк і вазёр, аднак, паводле некаторых дасьледчыкаў, яно не вяло аднолькавага спосабу жыцьця. Гэтыя дасьледчыкі, апіраючыся на тым, што каменныя прылады на поўначы Беларусі спатыкаюцца малымі групамі, а на поўдні вялікімі, робяць выснаў, што насельнікі паўночнай Беларусі вялі *вандроўнае* жыцьцё, тады, як на поўдні (ад Дзьвіны) жыло *аселае* насельніцтва.*) Сементкоўскі дапушчае нават, што ўжо ў гэтую пару насельнікі Беларусі вялі гандаль з суседзямі, бо часам трапляюцца прылады з гэткіх пародаў камяня, каторыя не спатыкаюцца ў дадзенай мясцовасьці.**) Нешматлікія знаходкі паказваюць, што каменны чалавек сваіх нябошчыкаў хаваў розна, часам іх паліў, часам закапываў у зямлю, пры гэтым разам з рэчамі нябошчыка.***)

Праф. М. Шчакаціхін кажа, што ўжо ў гэтую пару назіраецца хоць і прымітыўнае, але усё-ж імкненьне да мастацкага апрацаваньня каменных сякераў і вырабаў керамікі. Орнамэнтыка сякераў азначаецца вельмі простымі лінейнымі ўзорамі і ёсьць больш match розностайнай у кераміцы. Тут найпрасьцейшым рысункам ёсьць дзьве раўналежныя лініі па берагу пасудзіны. У далейшым разьвіцьцю гэтыя лініі ламаюцца на кавалкі ды зварочваюцца да сябе наўскос або стоць, творачы вуглы, крыжыкі і г. п. Надта характэрна, што ўжо ў гэтым часе спатыкаецца рысунак „капыцікаў“, якія захаваліся яшчэ і цяпер на сучасных вясковых беларускіх паясох. З часам орнамэнтыка робіцца ўсё больш складанай: зьяўляюцца прасталінейныя геомэтрычныя фігуры (трыкутнікі, ромбы, прастакутнікі) і рысункі крывалінейныя (хвалявыя лініі, колцы, сярпы, паўмесяцы і г. д.)****)

Нэолітычную пару зьмяніла *пара мэталяў*, калі жыхар Беларусі навучыўся ўжываць прылады з мэталяў. Населенасьць Беларусі і ў гэтую пару выплывае ня толькі, як выснаў з папя-

---

*) С е м е н т к о в с к і й о. с. бач. 80, Уваровъ, о. с. бач. 39. Гэтай-жа думкі трымаецца і В. Д а н и л е в и ч ъ. Очеркъ исторіи Полоцкой земли до конца XIV столѣтія, Кіевъ, 1896 г., бач. 40—41.

**) С е м е н т к о в с к і й о. с. б. 81 — 82. Думку гэтую можа пацьвердзіць іншая спасьцярога, паіменна, што напр. у Полаччыне знойдзены месцы з мноствам няскончаных каменных прыладаў, што, паводле некаторых дасьледчыкаў, дае асновы дапушчаць выраб гэтых прыладаў у мэтах гандлю (Глядзі У в а р о в ъ, о. с. бач. 41, Л е р х ъ, о. с. бач. 168 і наст., Т а т у р ъ о. с. бач. 58). Думку гэту паўтарае і В. Данілевіч, о. с. бач. 41.

***) Знаходкі, зь якіх можна было-б рабіць высновы аб хаўтуровых звычаях нэолітычнага чалавека трапляюцца вельмі рэдка. Заслугоўвае на ўвагу знаходка ў в. Зыкаве, б. менскага пав. Тут знайшлі паіменна магілку, складзеную з каменных пліт у форме невялікае скрынкі, а пры нябошчыку аказаліся крамнёвы клін і чатыры гліняных начыньні. Каменныя могілкі знойдзены і ў іншых мясцовасьцях (глядзі В. Данілевіч о. с. б. 41—42).

****) М. Ш ч а к а ц і х і н. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Т. І. Выд. Інст. Белар. Культуры Менск, 1928 г.; глядзі так-жа часапіс „Нёман“ 1932 г., № 3, Вільня. На аснове падобнасьці орнамэнтыкі нэолітычнае пары ў Беларусі з орнамэнтыкай Скандынавіі і Фінляндыі праф. Шчакаціхін робіць вывад, што ўжо ў гэтую пару існавалі сувязі між Скандынавіяй і Беларусьсю.

рэдняга, але пацьвярджаецца і іншымі дадзенымі. Карскі гаворыць, што ў гэтую пару ішоў ажыўлены гандаль па Нёмну і Дняпру янтаром („жывой смалой"), прычым, паводле сьвядоцтва Плінія, гандаль адбываўся гэткім способам, што плямёны жыўшыя на берагох Балтыцкага мора перадавалі тавар суседзям, а тыя далей аж да паўдзённых мароў. Народы, што займаліся гэтым гандлям, ужо зналі мэталы. Пацьвярджаецца гэта шматлікімі знаходкамі па Дзьвіне даўнарымскіх, сыракускіх, афінскіх, македонскіх, фазоскіх і др. грошаў. Прадметаў бронзавага веку знойдзена, аднак, у Беларусі мала (медныя сярпы, кліны, тапары знойдзены, прыкладам, у Меншчыне).*)

Першыя пісьменныя сьвядоцтвы, каторыя гісторыкі адносяць да жыхароў Беларусі, паходзяць ад бацькі гісторыі—Гэродота, жыўшага ў V стаг. да нашай эры. Гэродот, апісваючы насельнікаў Скіфіі, на якой падарожнічаў, кажа, што на поўнач у лясох, дзе ляжыць вялікае возера, жыве вандроўнае племя *Будзінаў*. Ведамыя чэскія гісторыкі Шафарык і Нідэрле лічаць, што Будзіны Гэродота жылі па Прыпяці і верхнім Дняпры. Думку гэтую падтрымліваў і праф. Карскі, які бачыць у Будзінах аўтахтонаў мясцовасьці па Прыпяці, верхнім Дняпры і Бярэзіне.**) Гэткае зьлёкалізаваньне Будзінаў выдаецца правільным, бо возера, каля якога зьмяшчае іх Гэродот, гэта, бязумоўна, цяперашняе палескае балота, быўшае возерам у часы Гэродота.

Гаворачы аб Будзінах, Гэродот кажа, што за адно пакаленьне перад наступам Дарыя *Нэўры*, народ жыўшы на паўн.-захад ад вытокаў Бугу і Днестру за скіфскай мяжой, з прычыны размнажэньня зьмеяў у іхняй зямлі, пакінулі свае сялібы і перайшлі ў зямлю Будзінаў. Браун уважае, што гэтыя нэўры

*) Карскі, о. с. б. 35. Знаходкі чужых грошы гісторыкі тлумачаць гандлёвымі зносінамі з адпаведнымі краямі. Адменнай думкі трымаецца, між іншым, ведамы дасьледчык беларускае Севершчыны Д. Сэмаквасаў. Ён, апіраючыся на сьвядоцтвах Юлія Цэзара і Тацыта, пярэчыць магчымасьці гандлю з Рымам у разгляданую пару. Скарбы рымскіх грошы, што знаходзяць у славянскіх землях, а ў тым ліку і Беларусі, тлумачыць тым, што Славяне, выйшаўшы із сваей дунайскай прарадзімы, прынясьлі з сабой у новыя сялібы нажытыя ў гандлі з Рымам грошы (Д. Самоквасовъ. Сѣверянская земля и Сѣверяне по городищамъ и могиламъ. Москва, 1908 г., бач. 88—91). Думка гэта ёсьць, аднак, мала праўдападобнай. Славяне маглі прынясьці ў новыя сялібы рымскія скарбы, што сьведчыла-б, што яны зналі грошы і іх цанілі. Але чым вытлумачыць тады знаходкі іншых, апрача рымскіх, грошы, як ня гандлям з адпаведнымі краямі? Прарадзіма-ж Славянаў была адна. Ды і Самаквасаў, замыкаючы час высяленьня Славянаў з дунайскай прарадзімы між панаваньнем рымскіх імпэратараў Траяна і Сэптымія Сэвэра нічога не гаворыць, як выясьніць знаходкі ў славянскіх землях рымскіх грошаў ад Сэптымія Сэвэра да ўпадку Рымскае імпэрыі (V ст. па Н. Х.). Тут адзіна магчымым тлумачэньнем будзе дапушчэньне існаваньня гандлёвых зносінаў, усё роўна безпасярэдных ці пасярэдных.

**) Гл. Шафарикъ. Славянскія древности, переводъ Бодянскаго, I т. кн. II, бач. 10—24. L. Niderle. Starověki, б. 112, Карскі, о. с. б. 37—38.

пасяліліся над Прыпяцьцю і Нёманам.*) Карскі думае, што Нэўры спачатку жылі на захад ад цяперашняй тэрыторыі Беларусі, скуль іх выціснулі праўдападобна германскія плямёны (іхнім сымболям была зьмяя). Нэўры падаліся на ўсход і занялі заходнія абшары па верхнему Нёману і часткава па Прыпяці.**)

Трэба зацеміць, што Будзінаў Гэродота ведаюць і іншыя клясычныя пісьменьнікі, як Юры Ганоры, Марцэлін, Этык, Пліні, Мэля. Карскі гавора, што і гэтыя пісьменьнікі зьмяшчаюць Будзінаў над Прыпяцьцю і Дняпром (верхнім). Думку Лаппо-Данілеўскага, што з прычыны супярэчных дадзеных клясычных пісьменьнікаў аб Будзінах немагчыма сказаць аб іх штось канкрэтнае, Карскі лічыць лішне рашучай і неабаснаванай.***) Апрача Гэродота, крыху сьвятла на першае насельніцтва Беларусі кінуў *Пталамэй* у сваей Геаграфіі. Ён успамінае аб *Ставанах*, жыўшых у вярхох Бярэзіны (Borystenes'а), каторыя мелі свае гарады, што дае асновы дапушчаць аселасьць гэтага племені.

Вось і ўсе весткі клясычных пісьменьнікаў, што з большай ці меншай праўдападобнасьцю можна аднесьці да жыхароў Беларусі. Наагул трэба зацеміць, што да Гэродота тэрыторыя Беларусі была няведамай грэцкім і рымскім пісьменьнікам, як і ўсе абшары паўночныя (ад Чорнага мора); аб гэтых абшарах існавалі толькі фантастычныя апавяданьні, ня маючыя ніякага навуковага значэньня****). Толькі Гэродот і Пталамэй пралілі крыху сьвятла на беларускую краіну.

Кім былі гэтыя першабытныя насельнікі Беларусі да зьяўленьня сюды беларускіх плямёнаў і ці магчымай навукова была-б гіпотэза, што беларускія плямёны — гэта аўтохтоны свайго краю? Гісторыкі, каторыя разважалі гэта пытаньне, даюць розныя супярэчныя адказы. Іх можна падзяліць на дзьве групы. Большасьць гісторыкаў выказвае думку, што беларускія плямёны ня былі аўтохтонамі тэй тэрыторыі, на якой засьпеў іх кіеўскі летапісец, што яны прыйшлі ў Беларусь із агульнай славянскай прарадзімы і знайшлі тут чужыя сабе народы. Ізноў-жа частка гісторыкаў скланяецца да думкі, што тэрыторыю Беларусі і сучаснай Літвы ад пачатку займалі нейкія супольныя продкі Славянаў і Балтаў, з якіх пасьля выдзяліліся Славяне — продкі беларускіх плямёнаў — і Балты — продкі цяперашніх літоўцаў, латышоў, прусаў. Разгледзім гэтыя пагляды.

*) Браун. Разысканія въ облости готославянскихъ отношеній. Спб. 1899 г., бач. 82—84.

**) Карскі, о. с. бач. 39—40.

***) А. Лаппо-Данилевскій. Скифскія древности. Замѣтки Отд. русск. и слав. арх. И.Р.А. Общ. т. IV. бач. 354, Карскі, о. с. бач. 37.

****) Гэтак Сапуноў, спыняючыся над гэтымі апавяданьнямі, цалком правільна гатоў бачыць і ў Беларусі „край Кіммэрыянаў, апісываны чорнымі хварбамі ў Адысэі Гомэра і шчасьлівы „край Гіпэрборэйцаў", што жылі ў поўным дастатку колькі ім хацелася, а калі жыцьцё надаядала, кідаліся з высокіх скалістых гораў і ўміралі (Сапуновъ. Рѣка Западная Двина, бач. 1—40).

Гісторыкі першае групы, адказваючы на пытаньне, кім былі насельнікі Беларусі да прыходу сюды беларускіх плямёнаў, не пагаджаюцца з сабой. Погляды іх дзеляцца на дзьве аснаўныя тэорыі (маючыя ў некаторых гісторыкаў свае нязначныя адхілы): *фінскую і балтыцкую*.

Прадстаўнікі *фінскае* тэорыі кажуць, што да прыходу беларусхіх плямёнаў тэрыторыю Беларусі займалі фінскія народы мангольскага паходжаньня. Гэтыя фіны жылі ня толькі ў Беларусі (даходзячы да балтыцкага ўзьбярэжжа), але займалі вялізарныя абшары Эўрапэйскай і Азіяцкай Расеі. Будучы значна нішшымі культурна і слабшымі палітычна ад Славянаў, фінскія плямёны пад напорам апошніх адступалі на поўнач, або лёгка асыміляваліся. Прадстаўнікі гэтай тэорыі лічаць фінамі і Будзінаў Гэродота. *)

Тэорыя фінізму апіраецца на дадзеных архэолёгіі і на дайшоўшай да нас номэнклятуры рэк, вазёр, мясцовасьцяў. Праф. Галубоўскі, адзін з выдатных прадстаўнікоў гэтай тэорыі, абасноўвае яе наступным спосабам. Дадзеныя археолёгіі паказваюць, што ўсходнія Славяне, а ў іх ліку і беларускія плямёны, пры насыпцы курганоў-могілак над сваімі нябошчыкамі апрача зямлі не карысталіся з ніякага іншага матарыялу. На аснове гэтага праф. Галубоўскі кажа, што ўсе могілкі з камянямі, што трапляюцца ў Беларусі, павінны быць аднесены да якога іншага чужога племені, бо яны неславянскія а значыцца і не беларускія. Адказваючы, чые гэта могілкі, Галубоўскі параўноўвае каменныя могілкі ў Беларусі і знойдзеныя ў іх чарапы з ведамымі люцынскімі могілкамі, а апошнія з ашэраданскімі, што знаходзяцца ў зямліЛіваў — народу фінскага паходжаньня. На аснове знойдзенай між могілкамі і чарапамі падобнасьці праф. Галубоўскі і дапушчае, што першымі насельнікамі Беларусі былі фінскія плямёны. Назовы некаторых рэк і вазёр, асабліва што канчаюцца на *ва, га, за, ла, ма, ра, са, ша, энга, анга* ёсьць фінскага паходжаньня і маюць пацьвярджаць правільнасьць вывадаў гэтай тэорыі. **).

У некаторых гісторыкаў тэорыя фінізму мае адхілы. Яны выказваюць пагляд, што тэрыторыя Беларусі была заселена ня толькі фінамі, але часткова вугорскімі плямёнамі. ***)

Тэорыя фінізму ці вугра-фінізму лічыцца ўжо перастарэлай і наагул слаба абаснаванай навукова. Закідаюць ёй прыпісваньне дужа вялікай ролі фінскаму элемэнту ў дагістарычную пару, якой ён ня згуляў, бо ў сапраўднасьці гэта быў элемэнт слабы і не натолькі шматлікі, каб мог займаць гэткія вялізарныя абшары. Археолёгічныя аргумэнты фіністаў слабыя, бо могілкі з камянямі ў Беларусі ня ёсьць ідэнтычнымі з люцынскімі і тым больш ашэраданскімі, а толькі падобныя. Аб значэньні номэнклятуры, як аргумэнту, скажам крыху ніжэй.

Прадстаўнікі другой—*балтыцкай*—тэорыі кажуць, што першабытнымі насельнікамі Беларусі былі балты, а фактычна тая іх галіна, з якой паўсталі літоўскія і латыскія плямёны. Паводле гэтай тэорыі балты займалі дарэччы Дняпра і Прыпяці, скуль іх адсунулі на поўнач беларускія плямёны, рушыўшыя із сваей праславянскай радзімы. К. Буга дае малюнак руху балтаў, што распачаўся пад напорам беларускіх славянаў. Паводле Бугі літоўскія плямёны, уступаючы перад беларускімі, пацiснулі братніх латышоў, сядзеўшых над Балтыцкім морам між Нёманам і Дзьвіной (у цяперашняй Літве) і занялі іхнія сялібы. Ізноў-жа латышы падаліся на поўнач і пацiснулі сядзеўшыя на балтыцкім узьбярэжжы фінскія плямёны — кураў, ліваў. *)

На карысьць гэтай тэорыі перш-на-перш паклікаюцца на назовы рэк, вазёр, мясцовасьцяў у Беларусі. Вядома, што ўва ўсей Беларусі ёсьць шмат назоваў небеларускага а балтыцкага паходжаньня. Як можна начай вытлумачыць гэты факт, як не прабываньнем тут балтыцкіх плямёнаў — кажуць прыхільнікі разгляданай тэорыі. Другім аргумэнтам ёсьць дадзеныя архэолёгіі з курганнай пары. Праф. А. Сьпіцын дапушчае нават, што балты пакінулі ў Беларусі свой асобны пэрыяд курганнай культуры. Астачай гэтага пэрыяду праф. Сьпіцын лічыць і ведамыя курганы каля в. Гнёздава ў Смаленшчыне. Трэцім аргумэнтам ёсьць гістарычныя весткі. З летапісу ведама напр., што каля Смаленску жыло літоўскае племя Голядзь і што яшчэ ў XIII стаг. латышы не займалі цалком цяперашняй сваей тэрыторыі, што мае пацьвярджаць правільнасьць вывадаў К. Бугі адносна пададзенага ім руху балтаў пад напорам беларускіх плямёнаў, а значыцца і правільнасьць балтыцкае тэорыі наагул. Між рэпрэзэнтантамі гэтай тэорыі ёсьць толькі нязгоднасьць адносна часу, калі балты адыйшлі з Беларусі, што адназначна з вырашэньнем пытаньня, калі беларускія плямёны занялі тыя абшары, на якіх іх засьпеў кіеўскі летапісец. Праф. А. Сьпіцын падае як дату гэтага зруху VIII стаг. па Н. Х., а К. Буга дапушчае, што зрух балтаў распачаўся ўжо ў IV стаг. па Н. Х.

Балтыцкая тэорыя выдаецца лепш абаснаванай ад фінскае, аднак і проці яе высоўваюць шмат закідаў.

Найважнейшы аргумэнт гэтай тэорыі — балтыцкія назовы— толькі тады быў-бы моцны—кажа Карскі,—калі-б існавала пэў-

---

*) Глядзі Tomaschek. Kritik der ältesten Nachrichten über den Skythischen Norden, Sitzungsberichte d. K. Akademie d. W. Phil.-Hist. K. B. 117. 3 — 5, Браунъ, о. с. бач. 84.

**) Голубовскій. Исторія Смоленской земли, б. 22—25. В. Даниловичъ, Очеркъ исторіи Полоцкой земли, б. 40 — 42, цалком падтрымлівае аргумэнтацыю Галубоўскага.

***) Европеусъ. Об Угорскомъ народѣ. Тут аўтар паказвае на Вуграў, як насельнікаў Беларусі побач з фінамі. Блізка стаіць да гэтай тэорыі і Н. Надеждинъ. Опытъ исторической географіі русскаго міра, б. 50 — 54. Крытыкуе пагляд Европеуса што да Вуграў В. Данилевичъ, о. с. б. 45.

*) K. Buga. Die Vorgeschichte der aestischen (baltischen) Stämme im Lichte der Ortsnamenforschung, Leipzig, 1924, b. 22 –35.

насьць, што гэтыя назовы далі самі балты, тут жыўшыя. Магло, аднак, быць і так, што плямёны, асеўшыя на дадзенай тэрыторыі, прынясьлі з сабой чужыя назовы з раней займанага краю, нічога супольнага з яго языком ня маючыя і назвалі адпаведна рэкі і вазёры ў новым краю. Магло, ізноўжа, здарыцца так, што прыйшоўшыя плямёны мірна зжываліся з аўтахтонамі і пераняпі ад іх назовы, каторыя аўтахтоны атрымалі ад ранейшых жыхароў, або прынесьлі так-жа з чужыны. Усё гэта стварае няпэўнасьць і камплікацыі здавалася-б у яснай квэстыі, што трэба мець на ўвазе, ня кажучы ўжо аб неабходнасьці высьцерагацца надужываньня назоваў, падганяючы іх пад тэорыю прынятую аўтарам. Кожны назоў трэба лічыць асобным фактам.*) Археолёгічныя дадзеныя яшчэ менш ад назоваў могуць быць аргумэнтам балтыстаў, бо тое, што лічыцца балтыцкім, амаль ня розьніцца ад славянскага. Напасьледак, аргумэнты гістарычныя так-жа не зьяўляюцца пераконваючымі, бо аб племені Голядзі нічога канкрэтна ня ведама і яно ёсьць дагэтуль загадковым. Трудна нават сказаць, ці яно было па паходжаньні балтыцкім, бо назоў яшчэ гэтага не даказвае (прыкладам беларускае племя Северанаў мела неславянскі назоў). Яшчэ менш ёсьць пераконваючым аргумэнт, што латышы нават у XIII стаг. не займалі цяперашніх сялібаў, у чым К. Буга даглядаецца пацьверджаньня правільнасьці азначанага ім зруху балтаў з тэрыторыі Беларусі.

Усе гэтыя засьцярогі трэба мець на ўвазе пры разглядзе балтыцкае тэорыі.

Гісторыкі другой групы кажуць, што беларускія плямёны былі аўтохтонамі сваей тэрыторыі, на якой іх засьпела гісторыя. Гэту тэорыю можна было-б назваць *славяна-беларускай*. Прадстаўніком гэтай тэорыі зьяўляецца ведамы праф. Карскі, а сутнасьць яе паводле Карскага зьмяшчаецца ў наступным. Даўгагаловыя чарапы, паходзячыя яшчэ з нэолітычнае пары, прамаўляюць за тым, што ў Беларусі жыло племя, каторае было прототыпам славян і балтаў. У сучаснасьці даўгагаловасьць наглядаецца із славян найбольш у беларусаў. Гэткім парадкам можна дапусьціць, што насельнікі Беларусі ў нэолітычную пару належалі да індаэўропэйскага племені, магчыма да тэй яго галіны, каторая лягла ў васнову славян, найбольш чыстымі прадстаўнікамі каторых зьяўляюцца беларусы.**) На аснове падобнасьці ў сэнсе антраполёгічным беларусаў і літоўцаў, зь якіх апошнія здаўна (паводле праф. Баццэнбергэра ад 5000 г.) жывуць на

*) Карскі, о. с. б. 40—44. Калі на тэрыторыі Беларусі спатыкаецца шмат назоваў балтыцкага паходжаньня, дык гэта ня можа азначаць, што там, дзе гэтыя назовы ёсьць, жылі балты. Магло здарыцца, што беларускія плямёны зжыўшыся з чужымі назовамі і выходзячы ў новыя мясьціны давалі там балтыцкія назовы рэкам і вазёрам, прынесеныя з сабой. Магчыма гэтым тлумачыцца факт, што шмат рэк і вазёр у Беларусі ў розных кутках яе маюць аднолькавыя назовы.

**) Карскі, о. с. бач. 32—34, Нідэрле, Человѣчество, бач. 597.

цяперашняй сваей тэрыторы, Карскі дапушчае, што і ў нэолітычную пару яны жылі па суседзтву з беларусамі, г. ё. прыблізна ў цяперашніх межах, прычым магчыма, што пасяленьні балтаў спускаліся далей на паўдз.-усход уразаючыся ў тэрыторыю Беларусі.*) Дзеля адсутнасьці прычын да вялікіхператасовак народаў, Карскі дапушчае, што і ў пару мэталяў у Беларусі жылі тыя-ж насельнікі, толькі значна пасунуўшыя наперад сваю культуру. Дадзеныя языка дазваляюць яшчэ больш бачыць у гэтых насельніках славянаў. Ідучы за Шафарыкам і Нідэрле, Карскі рашуча цьвердзіць, што Будзіны і Нэўры Гэродота былі славянамі і толькі не рашаецца прызнаць славянамі Ставанаў Пталамэя.**) На аснове гэтых дадзеных і аналізуючы географічныя назовы рэк, вазёр, мясцовасьцяў у Беларусі, Карскі цьвердзіць, што беларускія плямёны былі аўтохтонамі сваей тэрыторыі і толькі на захадзе і паўн.-захадзе частку яе займалі ў перамежку балты, ды на поўначы дзе-ні-дзе на правых даплывах Дзьвіны жылі некаторыя фінскія плямёны.***)

Тэорыя славяна-балтыцкая выдаецца найбольш праўдападобнай. Пацьвярджаюць яе і досьледы праф. Шчакаціхіна над беларускім мастацтвам. Разглядаючы беларускае мастацтва, Шчакаціхін ужо ад нэолітычнай пары даглядаецца адзінства формаў матэрыяльнае культуры жыхароў Беларусі, яе асобнай сынтэтычнае суцэльнасьці і кансэквэнтнае эволюцыі.****) Гэтыя-ж вывады могуць утрымацца на наш пагляд толькі пры дапушчэньні культурнай эвалюцыі аднаго і таго самага насельніцтва пачынаючы ад нэоліту. Бо калі-б дапусьціць магчымасьць вялікшых рухаў рознародных плёменаў на тэрыторыі Беларусі, дык цяжка было-б гаварыць аб вывадах, да якіх дайшоў Шчакаціхін. Пры вялікшых ператасоўках насельніцтва нагляданіся-б і пераскокі ў яго культуры, якая-б не тварыла эвалюцыйнай цэласьці.

Рэасумуючы нашы разважаньні, напрашваецца выснаў, што *толькі на захадзе і поўначы дагістарычнымі насельнікамі Беларусі былі балты і фіны, што беларускія плямёны і іх продкі былі аўтохтонамі вялікшай часткі сваей тэрыторыі, асабліва паўдзённа-ўсходняе.* Разумеецца, што гэты выснаў зьяўляецца ня больш, як гіпотэзай, бо ані лінгвістыка ані археолёгія, прынамся ў сучасным сваім стане, не даюць магчымасьці замяніць гэтую гіпотэзу на навуковую праўду.

*) Ibidem, бач. 34.
**) Карскі, о. с. бач. 35—38.
***) Ibidem, бач. 47.
****) М. Шчакаціхін, Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва, т. І, Менск, 1928 г.

АД. СТАНКЕВІЧ

З літуанізмаў у беларускай мове

Ведама кожнаму, якую аграмадную, пераважна рашучую, іграе ролю ў адраджэньні і культурным разьвіцьці кожнага народу яго родная мова. Дзеля гэтага праца над чысьцінёй мовы якога народу зьяўляецца працай вялікага значэньня.

Розныя народы, жывучы ў суседстве, адны ад адных часта запазычаюць як паасобныя словы, так і граматычныя звароты. Прычыны гэткіх узаемных уплываў пераважна бываюць: палітычныя, эканамічныя, культурныя і інш.

Беларускі народ ужо аддаўна для сваей мовы рабіў „пазыкі“ з мовы літоўскай, польскай, расейскай. З гэтых двух апошніх запазычае ён і сяньня. Ад літоўцаў сяньня ўжо не пазычае, але даўнейшай языковай пазыкі, зробленай у іх даўней, трымаецца і цяпер, пераважна ўважаючы ўжо яе за сваю ўласнасьць.

Часта ў нас на языковай ніве можна спаткаць наступнае цікавае зьявішча: у Усходняй Беларусі дужа часта беларусы, якія ня знаюць мовы польскай, карыстаюцца польскімі славамі і, затым, што яны выразна розьняцца ад мовы расейскай, прысабечваюць іх на беларускую ўласнасьць. Узноў-жа па гэты бок рыскай граніцы, многія беларусы, якія ня знаюць мовы расейскай, за беларускія прымаюць многія расейскія і словы і нават граматычныя звароты, затым што яны рэзка розьняцца ад мовы польскай. Ясна, што патрэбна тут навуковая праца над ачысткай беларускай мовы і ад русыцызмаў і ад палёнізмаў. У абодвых гэтых кірунках шмат папрацавала ўжо маладая беларуская навука на нашым Усходзе ў першым дзесятку існаваньня БССР. Сяньня-ж, калі там пануе догматычна-дыктатарскі кірунак культуры: нацыянальнай формай і камуністычнай зьместам, праца гэта зьмяніла сваю напружанасьць і свой характар. Сяньня ў БССР, праўда, праца над чысьцінёй беларускай мовы ад палёнізмаў адбываецца, але ад русыцызмаў гэта мова ня толькі не ачышчаецца, але сьведама прыбліжаецца да расейскай мовы, як слоўнікам, так і будовай.

На гэтым баку рыскай граніцы часта можна так-жа пачуць гаворачых беларусаў, якія карыстаюцца літуанізмамі і ў добрай веры уважаюць іх за свае, а свае родныя словы закідваюць, выракаюцца і забываюцца. Навуковай-жа працы над чысьцінёй беларускай мовы на гэтай беларуска-літоўскай ніве бадай ня відацца сусім. Прычынай гэтага — надта нямногая колькасьць беларусаў, знаючых літоўскую мову.

Вось-жа ў гэтай працы маю на мэце ў меру сваіх сіл крыху папоўніць гэту нястачу ў беларускім мовазнаўстве, падаючы цэлы рад літуанізмаў, якія знайшлі сабе ўжо ў даволі шырокіх гушчах беларускага народу права грамадзянства. Праўда, многіх літуанізмаў ужо не заменім славамі беларускімі, але што можна, тое трэба замяніць. Ведама, гэта мая скромная праца ня вычарпае ўсяго прадмету, а толькі яго частку. Пададзеныя тут літуанізмы спатканы мною пераважна ў Ашмянскім павеце, ў валасьцях: Крэўскай, Куцявіцкай, Гальшанскай, Смаргоньскай. Кажу пераважна, бо будуць тут такжа літуанізмы і з іншых мясцоў, а да таго толькі тыя з іх, якія мне такімі выдаваліся.

Апрача назоваў агульных, падаю тут так-жа некаторыя і назовы ўласныя: мест, сёлаў і інш. Але з гэтых падаю сапраўды толькі некаторыя, бо гэтыя патрабавалі-б бадай асобнай монографіі, чаму магла-б служыць кніжка: „Крестьянское землевладѣніе. Виленская губернія“ (Вильна, 1908 г.), у якой вылічаны ўсе вёскі і пасёлкі ўсей быўшай Віленскай губерні.

Агранічыўся я тут такім чынам толькі літуанізмамі слоўнікавымі, не чапаючы такіх-жа ў сынтаксісе, зрабіць чаго, ня будучы моваведам — адумыслоўцам, а толькі аматарам, ня чуюся на сілах.

Надта магчыма, што знойдуцца ў гэтай працы „літуанізмы“, якія такімі ня будуць. Дужа прашу чытачоў, у такіх ці ў сумніўных выпадках, мяне папраўляць і прысылаць свае ўвагі. Зборнік літуанізмаў можа некалі прыдацца пры ўкладаньні сучаснага навуковага слоўніка беларускай мовы. Не забывайма так-жа, што знаньне літуанізмаў можа быць так-жа карысным для знаньня гісторыі Беларусі і Літвы, для знаньня гісторыі беларускай мовы і культуры.

Для гэтых-жа мэтаў добра так-жа было-б прасьлядзіць беларусызмы ў літоўскай мове, якіх, праўда, даўней там было даволі многа, а цяпер дужа мала.

На жаль друкарня ня мае знакаў-акцэнтаў для літоўскіх слоў, дзеля гэтага згары можна спадзявацца, што многія будуць літуанізмы гэныя чытаць няправільна.

Дзеля эканоміі часу літары літуанізмаў, апрача першай, размешчаны бяз увагі на альфабэтычны парадак, трэба ўрэшце памятаць, што ў літоўскіх словах **е=я** і **ė=е**, l перад галоснай цьвёрдай **(а, о, u,)** чытаецца як **л**.

Е. Карскій—Бѣлоруссы I (бач. 25—157), вылічаючы літуанізмы ў беларускай мове, робіць выснаў, што іх (разам з латышызмамі) ёсьць да 36 шырока распаўсюджаных і да 54 рэдкіх, ведамых толькі ў некаторых мясцох. Ніжэй убачым, што літуанізмаў у нашай мове ёсьць куды больш.

* * *

Карыстаўся я, апрацоўваючы і правяраючы гэтыя літуанізмы, між іншым, наступнымі крыніцамі:

В л а д и м и р Д а л ь — Толковый Словарь живого великорусскаго языка, I—IV т. — Спб.—Москва, III изданіе 1903—1909.

В. Д. Г р и н ч е н к о — Словарь Украинскаго языка, I—IV т. Кіев, 1907—1909.

I. Karkowicz — Słownik Języka Polskiego, I—VII t. Warszawa, 1900—1919.
А. Юшкевичъ — Литовскій словарь, I — III т. СПБ 1897—1922 (толькі да К. уключна).
И. Носович — Словарь бѣлорускаго нарѣчія. СПБ 1870.
А. Киркор — Этнографическій взглядъ на Виленскую губ. (Этнографическій Сборнік, Выпускъ III, СПБ, 1858 г., бач. 193 і наступныя).
В. Добровольскій — Смоленскій Этнографическій Сборникъ, т. IV (слоўнік), Москва, 1903.
Е. Карскій — Бѣлоруссы, т. I. Вильна, 1904.
S. Sereiskis — Lietuviškai-rusiškas žodynas. Kaunas, 1933.

А.

Атарыца — палетак; літ. **atarti** — адараць, перааараць, **ataras** — баразна. Атарыца—кусок зямлі, каторы чалавек мае права ўрабляць, але права ўласнасьці на яго ня мае. Слова гэта ўжываецца ў в. Шутавічах, Смаргоньскай воласьці.

Аруд — засек, клець; літ.: **aruadas**.

Ашкіра — слова, якім гамоняць на авец, калі іх куды гоняць; літ.: **atskirti** аддзяліць, адлучыць.

Андарак — нявыразнага крою адзежына, балахон; літ.: **andarokas** — спадніца, ужываецца рэдка.

Атожыла — расток, гучок, пасынак; літ. **atžala.**

Акмінеі — сяліба пад Ашмяной, літ.: **akmuo** — камень; **akmeninis** — каменны.

Ашмяна — літ.: **ašmens (ašmenys)** — вастрыё, лязо.

Авін — прозьвішча ў Крэве; літ.: **avinas** — баран.

Адулаваты — трухлявы, спарахнелы, адулаваты чалавек: слабы, нездаровы; літ.: **dulis** — клубок дыму, пылу; **dulinti** — чуць валачыся, чуць ісьці; абкурываць што парахном; **dulas** — тленны — **dulėti** — тлець.

Б.

Бастуны — чыгуначная станцыя ў Лідзкім пав.; літ.: **bastyti** — падарожнічаць.

Біценяты — сяло ў Крэўскай воласьці; літ.: **bitė** — пчала; **bitinas** — **bitinelis** — пчаліная матка.

Біюцішкі — сяло і двор недалёка ад Барун, Ашмянскага пав.; літ.: **bijotis** — баяцца; **bijus** — страх, баязьнь.

Бартэліха — сяло і лугі ў Валожынскім пав.; літ.: **bartis**— вадзіцца, спрачацца, лаяцца; **bartinas** — годны наганы; **barte, barti** — сільна каго прабіраць, лаяць.

Бryндацца — балтацца; апоркі, ніткі ў адзежы брындаюцца, балтаюцца; забрындацца — замачыць ніжнія канцы верхняй адзежы, калошы парток; па расе хадзіў і начыста забрындаўся; літ.: **brindos** — значэньне тое-ж, што і ў беларусаў.

Бацьвіньне — бурачная націва, лісты, з якіх вараць страву таго-ж самага названьня; літ.: **batvinis, batviniai** — тое-ж самае значэньне.

Брунта — ворчык; літ.: **bruntas, branktas** — палена, якое прывязваюць напр. сьвіні на шыю, каб яна ня бегала і не магла ўлезьці ў шкоду. Валак у коннай вупражы, брусок, на канцы каторага зачапляюцца пастронкі.

Др. Я. СТАНКЕВІЧ

Кажны ці кожны?

Зь невялікімі выняткамі ў беларускім друку ўжываецца цяпер менаванае ў назове артыкулу займя ў хорме *кожны* (з *о*). Ніхто дагэтуль публічна ня выступаў проці хормы з *о* гэтага займені. Дзеля таго здавалася-б, што тут усё ўпарадку. Але ў старой літаратуры беларускай, як і наагул беларускіх памяткаx языковых, звычайнай ё хорма *кажны* (з *а* і *н*), рэдка *кажды* (з *а* і *д*) і надта рэдка *кожды* й *кожны* (з *о*). Пісаны ў мове народнай (а ня літаратурнай) „Аль кітаб“ XVI стаг. звычайна мае хорму *кажны* рэдка *кажды* і ані ня мае хормы *кожны* або *кожды*.

Затое апошняя хорма звычайнай бывае ў памятках, адбіваючых языковыя асаблівасьці ўкраінскія і, значыцца, напісаных Украінцамі. Дык вось памяткі беларускія XIII — XVIII стаг. прынукаюць праверыць хорму *кожны* ў цяперашняй беларускай мове літаратурнай. Дзеля гэтага трэба разгледзіць, як стаіць справа з асобнымі хормамі менаванага займені ў беларускай мове народнай. З гэтай мэтаю я зьвярнуўся да IV тому збораў М. Фэдэроўскага, што выйшаў пад агульным назовам „Lud białoruski“. У ім надрукаваны на 487 бач. прыказкі і іншыя дробныя творы зь вялізарнай бальшыні заходне-беларускіх земляў. Вось як прадстаўляюцца там разгляданыя гэтта хормы:

Сакольскі павет: а) хорма *кажны, кажан* сустрэлася пад нумарамі 1458 і 9502; *кажды:* 4765, 7972, 9728 і 9739. Хорма *кожны* й *кожды* ў Сакольскім павеце ня стрэлася.

Горадзенскі пав.: кажны: 4162 (двойчы). Іншыя хормы гэтага займені ў творах із павету Горадзенскага ня стрэліся.

Ваўкавыскі пав.: а) *кажны:* 412, 414, 516, 1349, 1376, 1605, 2193, 2273, 2364, 2365, 2502, 2581, 2709, 2850, 2870, 2991, 3185, 3191, 3585, 3856, 4009 (двойчы), 4153, 4190, 4590, 4984, 5001, 5021, 5335, 5404, 5495, 5630, 5733, 9882, 6371, 6460 (двойчы), 6461, 6539, 13071, 6695, 6921, 7090, 7129, 7559, 7654, 7788, 7789, 7847, 7870, 7872, 7965, 7972, 7996, 8129, 8284, 8440, 8550, 8591, 8763 (двойчы), 9011, 9318, 9441, 9502, 9662, усяго з Ваўкавыскага пав. хорма

кажны лучыла 66 разоў; b) *каждьі:* 825, 965, 1685, 2871, 5289, 5447, 5918, 6156, 6561, 6582, 6619, 6922, 6923, 13190, 9727, — усяго 15 разоў; с) *кожны:* 1184, 1311, 1458, 1523, 1524, 1962, 3105, 4075, 4136, 5918, 12856, 9727, 9789 — 13 разоў. *Слонімскі пав.:* а) *кажны:* 516 і 4118 — 2 разы. *Наваградзкі пав.: каждьі:* 2086 і 7707. *Лідзкі пав.: кажны*: 2 й 516. *Сьвянцянскі пав.: кажны:* 3426. *Ашмянскі пав.. кожны:* 12791.

Значыцца найменей лучыла прыкладаў хормы *кожны,* крыху болей *каждьі* і надта шмат *кажны.*

Як даведваемся з перадмовы рэдакцыі да IV тому Фэдэроўскага, часьць запісаў зроблена была не самым Фэдэроўскім, але іншымі. І вось „правапіс“ гэны не беспасярэдне ад Фэдэроўскага паходзячых запісаў рэдакцыя зьмяніла, тарнуючы да „правапісу“ беларускай мовы літаратурнай. Вельмі магчыма, што адно дзякуючы гэнай папраўцы маем у выданым томе хорму *кожны.*

Апрача таго паміж сваімі знаёмымі ў Вільні я распытываў, дзе якую хорму менаванага займені кажуць. І вось, што аказалася:

1. *кажны, кажан* і пад. (з *а* і *н*) кажуць: ля Мозыра (ад дыр. Анцукевіча), у Кацёлках ля Пружаны (ад Я. Хвораста), у Шакунох, Пружанскага пав. й вол. побач із *кожны* (ад Жэдзіка), у Падлесьсі ля Ляхавічаў, Баранавіцкага пав., у Друі, Браслаўскага пав. (ад Аўг. Аніські), у Цяцерках, Ёдзкае вол., таго-ж пав. (ад М. Пяцюкевіча), у Пятроўшчыне, Новапагосцкае вол., Брасл. пав., у Дзеравенскай вол., Стаўпецкага пав. (ад Ул. Паўлюкоўскага), ля Волмы, Валожынск. пав., у Дзьвінскім пав., побач із *каждьі*, у Ямонтах, Беліцкае вол., Лідзкага пав.

2. *каждьі:* Сыботнікі, Лідзкага пав., Буда, Вялейск. пав., Слабодка, Брасл. пав., Юшкі, Тургельскае вол., Віленск. пав., Арляняты й Жупраны, Ашмянск. пав., Ініца, Мірскае вол., Стаўп. пав., Шчорсы, Навагр пав., Мядзьведзічы, Баранав. пав.

3. *кожны:* Вялікае Сяло, Пружанскага пав.

У цэнтральнай і ўсходняй Беларусі звычайнай ё хорма *кажны.* Як відаць із адказаў на апытаньнік да зьбіраньня асаблівасьцеў беларускае мовы, хорма *кажны* там ё звычайнай. Яна кажацца паміж іншым у пав. Віцебскім, Аршанскім, Быхаўскім, Ігуменскім і ў шмат якіх іншых.

З вышпрыведзеных прыкладаў відаць, што з аднаго боку стаяць хормы *кажны, каждьі,* а з другога *кожны, каждьі.* У згодзе з гэтым будзе маё цьверджаньне, што самагукі *а* й *о* спачатныя, праслявянскія, бо ня можна знайсьці прычыны іх пазьнейшае зьмены. Затое выясьніць паўстаньне хормаў *кажны* й *кожны* вельмі лёгка: з *каждьі* й *кожды* пад уплывам прыметаў з *н,* як *роўны, посны* і пад., паўстала *каждны, кожны,* з каторых *д* потым шчэзла (як *д* і *т* ў *позны* й *посны* з *поздны* й *постны*).

З вышменаванага такжа відаць, што чыста беларускай і найболей пашыранай хормаю ё *кажны.* Хорма *кожны* ё провінцыяльнай ды вельмі абмежанай, а *каждьі* архаізмам провінцыяльным, а можа яшчэ быць у вадным месцу полёнізмам, у другім— русыцызмам.

Затое хорма *кажны* не магла зьявіцца пад якім чужым уплывам, бо яе няма ў ніякай суседняй мове. Ясна, што ў беларускай літаратурнай мове павінна ўжывацца хорма *кажны, кажан, кажыны* (з *а* і *н*).

Хорма *кожны* ё ў нашай літаратурнай мове ўкраінізмам. Хтось яе пусьціў, а дзеля таго, што яна розьніцца ад хормы расейскай і польскай, а мовы ўкраінскай у нас ня знаюць, дык сталі яе лічыць арыгінальна-беларускай. Гэтак яна абмыльна ўведзена ў нашую мову. Дык цяпер мусіць быць выкінена й заменена хормаю сваёй — *кажны.*

М. ВАСІЛЁК

Выйдзем

Ахінула злая восень
шэрай воўнай неба просінь
і сьцяжыны залацістым
усьцілае
 лістам
 лістам.
Пахіліўшысь над ракою
шэпча лозьнік з асакою —
аб галінку трэць галінай —
шкода песьні салаўінай,
шкода згубленай надзеі;
вецер дзёрзскім ліхадзеем
нішчыць, цешыцца, рагоча,
слотай, зольлю б‘е у вочы...

Прытуліўшыся да тына
плача чырваньню рабіна,
і палетак пусткай голай
прызадумаўся над доляй.
Ды нястоптана надзея —
рунь на ніўках зелянее;
вось зарука нам жывая —
яшчэ сонца гімн заграе,
мы вясну яшчэ увідзім;
што яшчэ мы шчыльна выйдзем
з новай песьняй, верай, сілай;
засяваць шнурок свой мілы
выйдзем з крыўдай набалелай,
выйдзем горда, выйдзем сьмела!

А. БУЖАНСКІ

У абліччы расейскага тэрмідору

Аб пачатку савецкага тэрмідору крычала расейская і сусьветная рэакцыя прыблізна ў тыдзень пасьля кастрычнікавага перавароту. З гледзішча контр-рэвалюцыі замах Фані Каплан на Леніна прыпадаў на разгар тэрмідору, а ціхая сьмерць кандыдата ў маршала Фрунзэ сыгналізавала аб заканчэньні тэрмідорыянскага пэрыяду. Праз доўгія гады, у кожнай дробязі, расейская эміграцыя угледжвала сымптомы самаліквідацыі рэвалюцыі і самапажыраньня яе дзеячоў. „Сіяцельныя" шофэры і кельнэры з парыскіх мюзік-холаў, між сабой ужываўшыя звароту „Ваше превосходительство" і „во вверенной Вам губерніі", пакавалі валізы. Але, на жаль, тэрмідор не надходзіў. Крыху пазьней наступіла эміграцыя Троцкага, паўсталі масавыя чысткі ў партыі, каяньні, працэсы і разстрэлы. Найбліжэйшыя супрацоўнікі Леніна, галоўным чынам староньнікі інтэрнацыянальнага камунізму, былі выкрыты і зьліквідаваныя. Адначасна пайшоў разгром нацыянальных рэспублік. Расейскае вялікадзяржаўніцтва адбірае ад гэтых рэспублік рэшткі культурнай аўтаноміі. Расейская рэакцыя ў партыі падымае галаву і нішчыць у гэтых рэспубліках усё, што прэтэндуе на нацыянальную самабытнасьць. Гэты працэс у Беларусі адбываецца праз даўжэйшы час. Усе прававерныя камуністы, 100%-ыя ленінцы, меўшыя адвагу ў галіне культуры аставацца пры прынцыпе беларускай апрычонасьці, аказаліся „ворагамі народу", „дывэрсантамі" і „шпіёнамі". Сьвядоцтвам рэвалюцыйнай прававеркасьці сталася не адданасьць тэорыі Маркса-Энгельса і заветам Ільліча, а рабская чалабітнасьць Пушкіну, Рымскаму-Корсакову і розным князём зьбіральнікам „зямлі рускай". Самагубства Алеся Чарвякова было апошнім, найбольш яскравым сыгналам С.О.С., да ўсіх думаючых беларусаў аб расейскім гвалце. Тэрмідор прыбраў рэальныя формы.

Сягоньняшні прасьлед беларускай культурнай працы ў Б.С.С.Р. ня ёсьць неспадзеўкай, гэта зусім зразумелая рэч і дзівіцца няма чаго. Гэнае адношаньне да беларускага народу і ягонае культуры мае свае карэньні ў мінулым.

Цэнтральная і Заходняя Беларусь лучыла ў рамкі расейскай імпэрыі: першая ў 1773 г., другая ў 1793 і 1795 гадох.

У гэтую пару, вельмі спрыяючую для Расеі, беларускі народ апынуўся агалочаным ад асьвечаных слаёў. Сапегі, Хадкевічы і tutti quanti былі ўжо тады палякамі (нават ня ў першым пакаленьні). Масква сустрэлася з дэзарыентаваным беларускім селянінам у прыгоне. Прыляпілі яму, калі ён быў праваслаўным ці ўніятам, этыкетку „рускага мужыка", што да каталікоў — дык наагул ня ведалі, як іх закваліфікаваць — ну і справу палічылі за зьліквідаваную. Захапіўшы беларускія землі, Масква павінна была заняць нейкае становішча адносна насельніцтва. І тут даецца заўважыць поўная адсутнасьць творчае думкі, консэквэнцыі, знаёмства краю і якіх-колечы прынцыпаў. У ігнаранцкім адношаньні да беларускага краю з боку расейцаў нельга знайсьці найменшых элемэнтаў прадуманасьці. Ня маючы паняцьця аб беларускім народзе, ані ў галіне ягонай гісторыі, ані этнографіі, ані якой-небудзь іншай, Масква аднэй рукою рабіла спробы нівэляцыі краю ў кірунку русыфікацыі, другой-жа рукою падтрымлівала польскі стан уладаньня. Гэткая была сутнасьць т. зв. расейскай палітыкі ў адношаньні да беларусаў да эпохі панаваньня Аляксандра 1-га.

Калі праглядаем дакумэнты і матар'ялы з эпохі беларускалітоўскай гаспадарсьцьвеннасьці, г. зн. Вялікага Княства Літоўскага, дык мусім зьвярнуць увагу на надта цікавае зьявішча, а іменна—на назовы нашых гарадоў. Гэтыя гістарычныя назовы—зусім ідэнтычныя з сучаснымі, напр. Менск называецца Менскам, Наваградак — Наваградкам і г. д. Расейцы ўзяўшы пад сваю „высокую" руку Беларусь былі ласкавыя ўстанавіць афіцыяльныя назовы гарадоў паводле *польскае номэнклятуры* і гэтак паўсталі Мінск, Новогрудок і іншыя! Расейцы, бязумоўна, гэтым назовам надалі павагу „акадэмічнасьці" і „навуковасьці" і цяпер шмат хто з рускіх людзей з пачуцьцём вышшасьці (а як-жа!) патрапіць насьмяхацца з беларускага назову, хацяж-бы вышменаваных местаў. Гэта адна толькі рыска, адзін гістарычны эпізод, а колькі ёсьць яшчэ іншых нямейш вымоўных, характарызуючых маскоўскае трактаваньне беларушчыны ў мінулым.

У пару Аляксандра І расейцы, сконстатаваўшы поўную немагчымасьць разабрацца ў адносінах у нашым краі, даюць палякам (Чарторыйскі) магчымасьць палёнізаваць Беларусь; іншая рэч, што гэта пасрэдна прысьпешыла (Віленскі ўнівэрсытэт) справу нашага адраджэньня, але факт астаецца фактам і бясэнсоўныя зігзагі расейскай палітыкі не выклікаюць ніякага сумніву.

Расткі беларускага Risorgimento заруне́ўшыя ў 19 стагодзьдзі адбіліся ад зоркага вока ўдумлівага расейскага дасьледчыка, як гарох ад сьценкі. Ён гэтага зьявішча не дагледзіў. Зусім зразумела, што сьведама ці праз ігноранцыю, сфальшаваўшы нашую гісторыю, прысвоіўшы сабе яе лепшыя старонкі, расейская інтэлігенцыя ня здолела зразумець і беларускага адраджэнскага руху сучаснае пары. Пачынаючы ад Іллавайскага, канчаючы паважнымі сьветачамі навукі, пашыралася несянетніца аб адналітасьці „рускай гісторыі", аб трох галінах „рускага народу" з цэнтрам у Маскве і г. д. Гэтак трывала да самай расейскай рэвалюцыі.

Ані Мілюкоў, ані Керэнскі не адыйшлі ад стэрэотыповай палітыкі да нашага народу. Бальшавікі пад уплывам Усебеларускага Кангрэсу і Слуцкага паўстаньня пайшлі на компроміс

з беларускім Адраджэньнем. Стварылі нікаторыя варункі дзеля будаўніцтва беларускай культуры ў рамках савецкай гаспадарсьцьвеннасьці. Трывала гэта, аднак, вельмі кароткі час. Паварот у адношаньні да беларускага народу і яго культуры даканала сталінаўская мафія па інэрцыі. Чым болей адходзілі ад рэвалюцыйных залажэньняў, тым болей станавіліся пад уплыў адвечнага маскоўскага імпэрыялізму, тым больш прымушаны былі разьбіваць усе заваёвы інародцаў. Паход расейскай чорнай сотні процiў беларускага народу трэба думаць хутка ня спыніцца. Усё сьведчыць аб тым, што „лепшыя людзі саюзу паводле ўказаньняў генія чалавецтва“ нанясуць беларусам яшчэ не адзін удар. Кола маскоўскага вялікадзяржаўніцтва разагналася.

„Правда“ ад 11.V с. г. у перадавіцы аб шкодніцтве ў навуцы, зьмяшчаючы шмат хвальбы аб расейскіх навукоўцах у мінулым, Мендэлееву, Лобачэўскім і вынаходцу радіо Папову (чамусьці „гнілой Запад“ патэнту за ім ня прызнаў, а палічыў гэта за заслугу Марконі! А. Б.), мімаходам зазначыла аб засьмечаньні беларускае мовы полёнізмамі і абяцала, што савецкая навука гэтай справай займецца. Можам сабе выабразіць, у якім кірунку пойдзе навуковая помач братняга народу!—Стары шчыры расейскі шовінізм аблудна зьмяніў толькі фразэолёгію. Аказваецца, што „квітнеючая Беларусь“ дастала „шчасьлівае жыцьцё“ выключна дзякуючы братняй дапамозе вялікага расейскага народу. Ужо не пралітарыяту, а проста вялікага расейскага народу! Усё, што беларускі народ здабыў у Б.С.С.Р. — гэта заслуга „павадыра народаў“. А павадыр—гэта сымболь велічы расейскага народу.

Ня праца беларускіх адраджэнцаў прычынілася да тых ці іншых здабыткаў у галіне беларускай культуры ў Саветах, а выключна мудрая палітыка крэмлёўскага апаша Іосіфа Вісарыёнавіча. Тое, што беларуская моладзь вучыцца ў сваёй школе — таксама дзякуючы ўказаньням друга і настаўніка (ён там на восьмым ці дванаццатым зьезьдзе ўказваў аб патрэбах нацыянальнай палітыкі). Культура беларуская — літаратура, мастацтва і г. д.,—таксама пачатак свой бяруць ня ў сівой мінуўшчыне, як думаюць „нацдэмаўскія агенты фашызму“, але ад нейкага там дакладу павадыра на пленуме Р.К.П.Б. Самаістнасьць беларускай культуры — гэта вылазка нацыяналістаў, падасланых германскай гестапо ці іншымі разьведкамі. Ізноў-жа ўсё расейскае ў Беларусі ёсьць сьвятое і нятыкальнае. Няма ўжо барацьбы з вялікадзяржаўным нацыяналізмам, вядзецца яна толькі з мясцовым нацыяналізмам.

Гэтак кончылася легенда аб будаваньні беларускага дому на Усходзе. Адабраць усё адразу і адкрыта ад інародцаў Маскве ня зусім зручна, калі ўзяць пад увагу, што маладое пакаленьне ў Беларусі вырасла ў нацыянальнай школе, прывыкла да тэатру, газэты і кніжкі ў роднай мове, — яна адбірае ўсе здабычы подступам і агіднымі мэтодамі. Інэрцыя расейскага захопніцтва спыніцца на паўдарозе ня можа; пасьля перадышкі маскоўскі імпэрыялізм ня хоча сьцярпець беларускай апрычонасьці, ён мусіць беларуса перарабіць на расейскі лад, падстрыгчы пад скобку а la ізвозчык.

Маскоўская палітыка, ідучы на ўступкі пасьля спробы будаваньня незалежнасьці Беларусі Усебеларускім Кангрэсам, актам 25.III. 1918 г., і пасьля слуцкага паўстаньня, не прадбачыла дынамізму беларускай стыхіі — гэта з аднаго боку, а з другога — ў разгары рэвалюцыйнага змаганьня вялікарускі нацыяналізм быў значна аслаблены інтэрнацыянальнымі прынцыпамі марксызму. У Крэмлі думалі, што з беларусамі ня будзе вялікага клопату, дазволяць ім папяяць часам беларускую песьню, на сцэне выступіць у нацыянальнай вопратцы—і на гэтым скончыцца. Але беларускае адраджэньне, прайшоўшы свой галоўны этап разьвіцьця яшчэ да ўтварэньня Б. С. С. Р. і змусіўшы Расею да ўступак, на гэтым спыніцца не магло. Шматмільённы народ, расселены на караванным шляху Эўропы, пачаўшы з нетраў сваіх выдабываць сілы, ня мог згадзіцца з роляй дадатковага кола ў гіганцкай расейскай машыне. Сам захацеў стацца гігантам, пачуў у сабе волю да магутнасьці. Расейскім ліквідатарам рэвалюцыі, стануўшым на шлях вялікадзяржаўніцтва, неабходна было павясьці з гэтым барацьбу. І павялі яе з чатырох канцоў. Першы адрэзак фронту — гэта ўпадабленьне беларускай мовы да расейскай, заціраньне ўсіх яе асаблівасьцяў у фонэтыцы і морфолёгіі і падцягваньне ўсяго да вымогаў расейскай граматыкі. Другі адрэзак—гэта выключэньне значнай часьці беларускіх зямель ад сфэры ўплываў Менску, стварэньне заходняй вобласьці, на каторую-б беларусізацыя не магла пашырыцца, трэці — гэта русыфікацыя пры дапамозе беларускага слова і друку, уліваньне расейскага зьместу ў беларускую форму, урэшце чацьвертым — будзе ўзмацненьне расейшчыны ў Б.С.С.Р. — расейскіх школаў, друку і г. д.

Упадабленьне нашай мовы да расейскай вядзецца здаўна і на гэтым не канец, трэба чакаць новых рэформаў, на што паказуе артыкул у маскоўскай „Правде“, аб каторым ужо была гутарка. Адносна беларускіх абшараў, не ўвайшоўшых у склад Б. С. С. Р., дык усё паказвае на шчырыя намеры Масквы адгарадзіць іх ад рэшты Беларусі назаўсёды і дашчэнту зрусыфікаваць. У траўні сёлета менскае радыё падаючы аб гастролях дзяржаўнага жыдоўскага тэатру падчыркнула, што гэты тэатр спаткаўся з вельмі прыхільным прыймом нават у такіх „аддаленых“ ад Беларусі асяродках, як Смаленск! У канкрэтным выпадку менскі спікер, бязумоўна паводле ўказаньняў (тамака без „указаньняў“ нішто не адбываецца), сугэруе слухачом, што беларускі Смаленск знаходзіцца амаль што ня ў цэнтры Расеі! Іншых прыкладаў у дадзеным прадмеце можна прывесьці шмат.

Што да русыфікацыі пры дапамозе беларускага слова, можна сьмела сказаць, што лёзунг — нацыянальная формай, сацыялістычная зьместам — у практыцы ёсьць роўназначным з прынцыпам: беларуская формаю — расейская зьместам.

Трэба помніць, што Б. С. С. Р., цалком ізоляваная ад праніканьня ўсякіх флюідаў з Заходу, аддана на ласку Масквы, каторая корміць яе выключна прадуктамі сваей культуры. Пісьменьнікі найлепшыя якія? — расейскія; музыка найбольш здаровая — бязсумліўна расейская; лепшага тэатру за расейскі таксама нямашака, ну і ўся сучасная навука ёсьць вытварам расейскага духу. Пушкін — гэта шэф культуры ў Беларусі. Нават павязалі яго неяк з беларушчынай, далібог! Падчас апошніх пушкінаўскіх урачыстасьцяў савецкія беларускія паэты прымушаны былі тварыць вершы, на актуальныя тэмы. У адным з гэткіх вершаў, нажаль цяпер не прыпамінаю якога аўторамэнту, гаварылася, што едучы ў ссылку праз Беларусь Пушкін меў нейкі кантакт з беларускімі дзяўчатамі, здаецца, даволі фрывольнага характару, і гэта мела вялізарны ўплыў на ягоную любоў да нашага краю!

На гэтым, аднак, не канец. Пашыраецца сетка школаў расейскіх, засяг расейскай прэсы, тэатру. Узмацняецца пазыцыя расейскай (зрусыфікаванай) інтэлігенцыі. Зрусыфікаваныя беларусы залічаны да расейскага народу і квэстыянаваць іх нацыянальнай прыналежнасьці немагчыма. Гэта фашызм. Усім ведама, што шмат зрусыфікаванай беларускай інтэлігенцыі, тымчасам, адраджэнскага руху не зразумела, была лішне адарваная ад народных гушчаў і атручана ядам расейскай цывілізацыі. Яд бязьмежнай разухабістай маскоўшчыны як lues закараніўся ў крыві гэтых тоже — бѣлоруссов, зрабіўшы іх варожымі да справы адраджэньня свайго народу. Тамы Талстога і Дастаеўскага таўшчынёй сваіх пераплётаў, з паліцаў бібліятэк, як зьмяінымі вачыма ўраклі гэтых людзей. Натуральная рэч, што доступ да беларускай літаратуры і знаёмства з беларускай гісторыяй зрабілі-б магчымым для гэтых уроеных маскоўцаў паварот да свайго народу. Нажаль, об'ектыўныя варункі ў Б.С.С.Р. гэтаму працэсу ня спрыяюць. Замест царскага Іловайскага, праф. Шастакоў тэрорызуе беларускую думку. Паводле савецкай навукі беларусы зьяўляюцца нейкім надзвычайным дадаткам, тады, як запраўды гістарычным народам былі, ёсьць і будуць толькі расейцы. Літоўскі пэрыяд беларускай гісторыі савецкая навука пераварачвае дагары нагамі, тушуючы ягоны блеск. Савецкая навука маўчыць аб буйным росквіце і дамінуючым становішчы беларускай культуры ў Вялікім Княстве Літоўскім, аб эпохатворчых памятніках беларускага права — ў тую пару, калі ў Расеі юрыдычныя ўзаемаадносіны паміж царом і тагачаснаю элітай-баярствам былі ўнармаваны формулай: „Худой пёс Васька ноги твои Государевы лижет!”

Цікава, што чым далей Саветы ўглыбляюцца ў стадыю тэрмідору, тым болей расейшчына паказвае беларусам свае ашчыраныя зубы. Разгром у Б.С.С.Р. акадэміі навук, літаратуры і беларускіх элемэнтаў у партыі завяршае апошні этап расейска-беларускіх узаемаадносін. Білянс ня цікавы для беларусаў, і думаем, што ня вельмі карысны для стараны расейскай. Найгоршым у кампляксе гэтых адносін ёсьць немагчымасьць дыскусыі. Савецкая Расея на подступах да тэрмідору псыхічна да якой-колечы коляборацыі з беларусамі не падрыхтавана. Тыя, што прыйдуць пасьля тэрмідору, — яшчэ менш. Сучасная расейская эміграцыя, каторая ніякай ролі, на наш пагляд, у Расеі не адыграе, сваім адношаньнем да Беларусі істотна ад бальшавікоў не адрозьніваецца. За малымі выняткамі. Выняткам гэтым быў нябошчык Савінкаў і із сучасных дзеячоў Віктар Чарноў. Болей нікога няма. Нават эўразійцы, каторыя нешта зразумелі, — зразумелі, што галоўная місія Расеі ў Азіі, — да зразуменьня неабходнасьці супрацоўніцтва з беларусамі на прынцыпе прызнаньня беларускай культурнай самаістнасьці і палітычнай незалежнасьці не дарасьлі.

Думаем, што пасьля тэрмідору Расея перажыве вельмі цяжкую фазу свайго гістарычнага разьвіцьця. Сустрэча расейскага імпэрыялізму з імкненьнямі нацыянальных рэспублік і труднасьці на Далёкім Усходзе могуць аказацца для Масквы болей як прыкрымі. З расейскага боку могуць узьнікнуць спробы ў кірунку расейска-беларускага зьбліжэньня. Ці для беларусаў будзе гэта тады актуальным, трудна згадаць. Глянуўшы на карту — адно толькі кідаецца ў вочы, што Расея можа быць магутнай дзяржавай з цэнтрам цяжасьці ў Азіі, пры забясьпечаньні спакойных адносінаў на Захадзе, альбо можа пераварыцца ў вялікае княства Маскоўскае! Беларускі-ж народ пойдзе наперад, натуральным шляхам адраджаючайся нацыі, наперад да перамогі.

Язэп Драздовіч

(Да 50-годзьдзя нарадзін мастака)

Сёлета мінула 50 год ад нарадзін беларускага мастака Язэпа Драздовіча. Адзначаючы гэты юбілей, падамо тут кароткія весткі з жыцьця і дзейнасьці на народнай ніве гэтага прадстаўніка нашага старэйшага пакаленьня.

Радзіўся наш юбіляр 1-га кастрычніка 1888 г. у засьценку Пунькі, Дзісьненскага пав. Астаўшыся па сьмерці бацькі Нарцыза двухлетнім сіратой, маленькі Язэп гадаваўся пад апекай маткі і чатырох старэйшых братоў—у гаспадарцы, спачатку на ўласнай зямлі, пазьней — на арэндах у розных мясцох Дзісьненшчыны (засьц. Стадолішча, Стануліва, Кміты, Чаронка, двор Александрыя).

Матка мастака—Юзэфа—была сьведамай беларускай. Надзвычайна любіла беларускую народную творчасьць, умела напамяць многа беларускіх казак, баек, легэнд і нязьлічаную колькасьць народных прыказак. Ведала сапраўднае імя роднага краю і народу яшчэ перад 1906 г. Ад яе атрымалі дзеці, у тым ліку і Язэп, беларускую нацыянальную сьведамасьць. І калі ў 1906 г. апынуўся Язэп у Вільні і спаткаўся з прадаўцом газэты „Беларуская Доля", то адразу купіў яе і быў вельмі рад, што пабачыў беларускі друк.

Ад дзяцінства адчуваў Язэп ахвоту да рысункаў. Ужо 5-летнім мальцам аднаму з братоў папсуў шавецкую бяросту, наколываючы ды выціскаючы на ёй шылам розныя рысункі, тоесамае рабіў і на лучыне, на растучых маладзенькіх бярозках.

Ад 1906 да 1910 г. вучыцца Язэп у віленскай школе мастацтва праф. Трутнёва і мастака Рыбакова. У гэтым часе ён знаходзіцца ў кантакце з беларусамі і памагае ў іхняй культурнай працы; між іншым, памагаў ён арганізаваць першую беларускую вечарыну ў Вільні (люты 1910 г.) і зрабіў для яе кіоск для прадажы праграмак — „Грыб мухамор" — ягоная першая для беларусаў дэкоратыўная праца, а для Беларускага календара на 1910 г. выканаў вокладку — першы ягоны рысунак у беларускім друку.

У 1910 — 1912 г. г. знаходзіцца Драздовіч у Саратаве, у мэдыцынскай фэльчэрскай школе, а ад 1912 г. да 1914 г. у горадзе Вольску (на Волзе, Саратаўскай губ.), як ваенна-мэдыцынскі фэльчар; адгэтуль выслаў на адрас рэдакцыі „Нашай Нівы" ў Вільню на выстаўку калекцыю сымбалічных абразоў, якія няведама, гдзе падзеліся. Падчас вайны (1914—1917 г.г.) знаходзіцца ў характары ваенна-мэдыцынскага фэльчэра ў арміі (Пятроўск, Дзісна, Віцебск, Гарадок і інш.), а ў 1917—1919 г. г.— гаспадара на арэндзе ў роднай Дзісьненшчыне (Гэрманавічы); побач з гэтым арганізуе тут і зьяўляецца кіраўніком вялікае коопэратывы „Беларус", пры якой адначасна вядзе культурна-асьветную беларускую дзейнасьць (бібліотэка, аматарскі тэатр і г. д.); коопэратыва, з увагі на ваенныя падзеі, праіснавала толькі тры гады. У 1919 –1920 г. г. працуе ў Менску, як мастак і настаўнік: у беларускай коэдукацыйнай гімназіі і жаночай прогімназіі — настаўнікам рысунку, у літаратурных выдавецтвах — ілюстратарам, у Т-ве Беларускага мастацтва — мастаком дэкоратарам. Ад 1920 да 1924 г. г., апынуўся ізноў у Дзісьненшчыне на гаспадарцы, а ў 1924—1925 г. г. працуе настаўнікам рысунку ў Глыбокім у польскай пачаткавай школе. Ад Беларускага Навуковага Т-ва ў Вільні ў 1926 г. дастае Драздовіч камандзіроўку і едзе на Палесьсе, гдзе зьбірае этнографічны матарыял і дае яго зарысоўкі, у рэзультаце чаго Беларускі музэй атрымлівае ад яго многа альбомаў. У 1926 — 1927 г. г., знаходзячыся то ў Вільні, то ў Радашкавічах закладае пры мясцовых беларускіх гімназіях мастацкія майстроўні і арганізуе тры мастацкія выстаўкі: у Радашкавічах, у Вільні і ў Наваградку. Ад 1927 да 1930 г. г. працуе настаўнікам у Наваградзкай Беларускай Гімназіі і зьбірае памяткі беларускай старасьвеччыны; у гэтым часе выяжджае ў Трокі, Меднікі, Крэва, Гальшаны, Ліду і выконвае там з натуры рысункі замчышчаў (Гедыміна, Кейстута); таксама ў гэтым часе ўтрымлівае культурную сувязь і корэспондэнцыйны кантакт з прафэсарам Браніславам Эпімах-Шыпілам і Беларускай Акадэміяй Навук у Менску (у Менск высылае матарыялы—слоўнікавыя, з дзераўлянае архітэктуры, народнай вопраткі і г. д.). Ад 1930 г. Драздовіч праз некалькі год астаецца безработным, і ад 1935 г. працуе ў Дзісьненшчыне, як вандроўны народны мастак, зарабляючы сабе на кусок хлеба.

Язэп Драздовіч, апроч мастацкай і пэдагогічнай, працаваў і на літаратурнай ніве

Замілаваны ў беларускай старасьвеччыне, добры патрыёт, шчыры і ахвярны працаўнік на ніве адраджэньня роднай культуры, заўсёды дасьціпны і ў гумары, чалавек з добрымі асабістымі якасьцямі, скончыў наш мастак 50 год свайго працавітага жыцьця. — Радасна вітаем яго з гэтымі ўгодкамі. Многія леты!

Я. Ш.

Язэп Драздовіч — вэтэран беларускага сучаснага мастацтва ў нашым краю. Ён будучы сьведамым беларусам заклікаў моладзь, працуючую ў галіне малярства, каб ня чуралася свайго народу, сваей вёскі, і ў працы сваей каб брала тэмы з нашага народнага жыцьця. І бязумоўна меў на моладзь уплыў.

Найбольш мастак працаваў у графіцы. Вялікую мастацкую вартасьць маюць ягоныя рысункі, выкананыя тушам, пераважна з натуры.

Графіка Драздовіча мае таксама вялікую вартасьць этнографічную. Як-жа сумленна зарысоўваў ён вясковую хату з яе старасьвецкай, дзераўлянай архітэктурай, старасьвецкія званіцы, панадворкі, вароты, прыдарожныя крыжы, нашыя сьвятыні, каторых што год то менш на нашай зямлі —гінуць яны ад старасьці і ад пажараў. А колькі зарысаваў ён замчышчаў, авеяных легэндарным чарам глыбокай старыны. Шмат зроблена мастаком зарысовак гаспадарчых і хатніх прыладаў, як сохі, бароны, пасуда, народная вопратка і г. д. Нічога ня мінула вока мастака, што мела вартасьць мастацкую і этнографічную.

Драздовіч сабраў багаты матарыял для працаў над гісторыяй нашага будаўніцтва.

Ня чужая галіна яму і разьба: працаваў у дрэве, як плоскаразьба партрэтаў, так і ў разьбе дэкоратыўнай — аздобныя кіі, гэрбы, скрыначкі, папяросьніцы і г. д.

Драздовіч запалены зьбіральнік забыткаў у галіне архэолёгіі. Шмат сабраў па замчышчах старых прадметаў, у постаці печных кахляў, старой пасуды і мэталёвых рэчаў. Калекцыю з гэ-

тай галіны ягонай працы можна аглядаць у Беларускім Музэі ім. Івана Луцкевіча ў Вільні. Там-жа знаходзяцца і багатыя альбомы графікі мастака.

Драздовіч нараніцы свайго жыцьця студ'яваў малярства, але ня выявіў сябе канкрэтна ў гэтай галіне. Колер і форма не скрысталізаваліся ў мастака; яго цікавіла сымболіка, як тэма, але ня сымфонія хварб.

Адраджэнскі рух выдаў нам Драздовіча. Мастак наш побач з нашымі паэтамі будзіў у беларускім народзе пачуцьцё эстэтыкі і любові да роднага краю, да беларускай старасьвеччыны.

Паміма цяжкіх і неадпаведных абставін жыцьця нашага народу, сям'я працуючых у галіне мастацтва памнажаецца. Як-жа вялікая заслуга ў гэтым Язэпа Драздовіча, нашага першага сейбіта ў галіне новага беларускага мастацтва.

П. Сергіевіч

Кнігапіс

Ks. Ad. Stankievič. **BOŽAJE SŁOVA na niadzieli i śviaty.** Львоў — Вільня, 1938 г., фармат 8⁰. Бач. 372+2 нлб. **LEKCYI i EVANELII na niadzieli i śviaty.** Львоў — Вільня, 1938 г., фармат 8⁰. Бачын 195+1 нлб.

Хоць Кс. Адам Станкевіч, шырока ведамы і заслужаны для свайго народу беларускі культурны і грамадзка-палітычны дзеяч, напісаў і выдаў нямала прац з гісторыі беларускае культуры і беларускае палітычна-грамадзкае думкі, а так-жа хоць працуе на беларускай душпастырскай ніве ў самой толькі Вільні каля 20-ці гадоў, аднак толькі сёлета паказаліся ў сьвет ягоныя працы з галіны пастаральнай. Улетку выданыя ім з гэтай галіны дзьве кніжкі „Božaje Słova" і „Lekcyi i Evanelii" ў білянсе творчай дзейнасьці аўтара бясспрэчна займаюць найбольш паважныя пазыцыі і зьяўляюцца ў сваім родзе адзінымі сярод навачаснага беларускага рэлігійнага друку, як паводле свайго абыйма, так і спосабу і якасьці апрацоўкі.

Першая кніжка, апроч адносных лекцыяў і эванэліяў на нядзелі і сьвяты, зьмяшчае цэнны прадукт арыгінальнай працы аўтара-красамоўцы — кароценькія, але глыбокія і зьмястоўныя прамовы. Кніжка мае два разьдзелы: I. *нядзеляшняе* і II. *сьвяточнае*, пры гэтым уложана так, што ў першым з іх на 50 нядзель кожная мае па аднэй лекцыі, эванэліі і прамове, а ў другім—на 44 сьвяточныя дні кожны мае таксама па аднэй лекцыі, эванэліі і прамове.

Лекцыі і эванэліі ў харошым перакладзе на беларускую мову, а прамовы, як сказана вышэй, зьяўляюцца арыгінальнымі—ёсьць пладом ягонай творчае думкі, красамоўства і эрудыцыі. Іменна дзякуючы гэтым прамовам, кніжка зьяўляецца такой вартаснай. Аўтар, будучы далёкім ад „сухога" камэнтаваньня хрысьціянскага вучэньня, беручы яго за падставу і ў аспэкце гэтага вучэньня, навязываючы да практычнага жыцьця, разважае розныя праблемы рэлігійна-этычнага, часта філёзофічнага і соцыолёгічнага характару. Прамовы гэтыя зьяўляюцца свайго роду хрысьціянскай соцыолёгіяй узгадаваньня, у якой заакцэнтаваныя інтарэсы і патрэбы беларускае душы.

Віленскія Беларусы — учасьнікі набажэнстваў у касьцеле сьв. Мікалая — знаюць дасканальную форму, глыбіню і актуальнасьць зьместу прамоваў, сказаных Кс. Адамам Станкевічам у гэнай сьвятыні. Кароценькія прамовы—навукі, — надрукаваныя ў кніжцы, — такія-ж у сваім фармальным і сэнсавым выглядзе, іменна ясныя, простыя, глыбокія, жывыя, красамоўныя, цікавыя і часта непазбаўленыя тэмпэрамэнту; даюць яны агульныя асновы хрысьціянскага вучэньня.

У разьдзеле „Сьвяточнае", нікаторыя прамовы прысьвечаны і сьвятым, што жылі і працавалі ў Беларусі. Знаходзім тут і прамову, прысьвечаную беларускай сьвятой — унучцы слаўнага беларускага полацкага князя Усеслава Чарадзея — Апосталцы і Прасьветніцы Беларусі, Сьвятой Афрасіньні (Прузыне) Полацкай.

Другая кніжка — „Lekcyi i Evanelii" — гэта асобнае выданьне кніжкі першай без прамоваў.

Абедзьве кніжкі спраўляюць гонар, як для самога аўтара, так і для беларускага друкаванага слова. Надрукаваны кніжкі лацінкай і прызначаны для каталікоў Беларусаў, хоць і для Беларусаў праваслаўных зьяўляюцца яны карысныя, як з гледзішча пазнаньня асноў хрысьціянства, яго інстытутаў, так і з гледзішча ўзгадаваньня сябе ў духу хрысьціянскай рэлігіі.

Кніжкі выданы хораша, чыста, на добрай паперы. Адна ўемнасьць: з прычыны карэктарскага недагляду асталося ў іх нямала друкарскіх памылак, пры гэтым нікаторыя з іх вельмі ўжо відавочныя.

Кніжкі павінны знайсьціся ў бібліотэцы кожнага беларуса, як дзеля пазнаньня асноў хрысьціянскага сьветапагляду, практычнага — публічнага і хатняга ўжытку, — так дзеля рэпрэзэнтатыўнае іх ролі, як беларускага друку.

Я. Ш.

Józef Mackiewicz. **БУНТ РОЙСТАЎ.** Вільня, 1938 г., фармат 8⁰ бач. XVI+215+3 нлб.

Гэты рэпортаж з экскурсыі па нашым краі дае цэлы сьцяг трафных спасьцярогаў. Кніжка мае, здаецца, сваей задачай зьвярнуць увагу на рознастайныя аномаліі ў краіне ройстаў (ройсты — балота, дрыгва паросшая лесам) і гэтым запабегчы іх шкодным наступствам.

Аўтар — чалавек з тэмпэрамэнтам, ён умее алярмаваць. І вось ён алярмуе аб пашырэньні сэктаў, аб паўпэрызацыі бе-

ларускай вёскі, аб „спэцыфічных“ адносінах да аўтохтоннага насельніцтва... і г. д. без канца.

У сваёй кнізе зварачвае ўвагу на „радасную творчасьць“, на гучныя блефы, як напр. на справу будаваньня порту ў Друі, праз каторы меўся быць накіраваны па Дзьвіне экспорт лесу з нашага краю.

У яркіх штрыхах падчырківае палажэньне мясцовага элемэнту і верхаводзячую ролю прыбыўшага. Гэта ён робіць так сакавіта ў разьдзеле пад назовам *Мястэчка*, што цяжка сабе адмовіць у прыемнасьці прывесьці ўрывак у беларускім перакладзе:

„....... 6-ы, 7-ы, 8-ы і 9-ы гэта паны з выдатна нерэгіянальнымі прозьвішчамі. Асаднік, сакратар валасьці, войт і камандант паліцыі.—Яны гэта, гэныя людзі, гэныя ўрадаўцы на марных пэнсыях, заваленыя работай заўсёды, аднак, гатовы пакінуць і пастарунак паліцыі і службовыя гадзіны на пошце і незадаволіць сялян, якія лезуць з дурнымі прашэньнямі ў валасьць, яны заўсёды ахвяруюць свой дарагі час ўрадаваньня дзеля дабра Польшчы, калі трэба дамагацца калёніяў, выслаць тэлеграму ў Лігу Народаў, паказаць кулак у кірунку Гданска, калі трэба прыняць ваяводу, ці даць дастойную Вазёраў (назоў мястэчка А. Б.) адправу чэхам на Шлёнску. Аб усім думаюць, аб усім памятаюць, трымаючы руку на пульсе актуальных заданьняў. Яны стануць на дэфілядзе, яны ўтвораць шпалеры, іх нагародзяць ордэнам, бо-ж яны адказваюць за грамадзкасьць ня толькі 3-х тысяч жыхароў мястэчка, але таксама многіх тысяч з ваколічных вёсак. Бо што-ж тыя могуць думаць і адчуваць? Дурныя хамы. І таму П.А.Т., калі паўстане патрэба, падасьць вестку аб настроях насельніцтва, іх жаданьнях і мэтах паводле сьветлых указаньняў усьвядомленых палякоў — войта, сакратара, пшодовніка і асадніка.........“

Вельмі маляўнічы ўрывак! Падобных кавалкаў, характарызуючых „радасную творчасьць“ у краіне ройстаў ёсьць шмат і таму кніжка Я. Мацкевіча, як дакумэнт часу, зьяўляецца вельмі цэннай. Кнігу ўпрыгожвае вокладка з малюнкам беларускага селяніна ў даволі цікавай пазыцыі: нізка схіліўшы галаву, босы, у падзёртай сярмязе, цярэбячы ў руках шапку стаіць перад кімсьці... Погляд упёрты ў зямлю.

Мільгаюць у вачох абразкі з перачытыванай некалі „Хаты Дзядзькі Тома“, толькі тамака на тварах не граў адбівалася нейкае пачуцьцё жыцьця і надзея...

Які-б ня браць разьдзел кнігі, усюды ў аўтара спатыкаецца сэнтымэнт да краіны „ройстаў“ (рэпортаж тэрыторыяльна ахапляе прастор ад Дзьвіны да Палесься ўключна), душа ягоная баліць ад усяго, што ён бачыў і чуў.

На жаль, пішучы аб кнізе п. Мацкевіча, нельга ня спыніцца над тым, аб чым ён прамаўчаў (ці-ж бы тэндэнцыйна?). Ні разу не заікнуўся нават п. Мацкевіч аб праявах беларускага нацыянальнага жыцьця. Гэтага ён не дагледзіў. Ці-ж-бы ліквідацыя

амаль усіх беларускіх арганізацыяў адняла ў яго ахвоту да шырэйшых спасьцярогаў і выснаваў? Пры ягонай пільнасьці і здольнасьці да обсэрвацыі, дзіўным выдаецца падобная каротказрочнасьць.

Мала таго, не заўважыўшы беларускай праблемы ў нашым краі, ён у разьдзеле „Рыншток і школа ў Валожыне“ падчырківае наяўнасьць нейкай расейскай эгзотыкі; выцягвае з архіву астаткі расейшчыны, ахінае іх нават аўрэолам і маніцца падмяніць гэтым пякучую беларускую квэстыю. Ці гэта тлумачыцца клясавай прыналежнасьцю аўтара, ці якімі іншымі мамэнтамі, судзіць ня будзем. Даволі таго, што знаходзіцца ён у кругу перажыткаў і опэруе катэгорыямі мінулага веку. Аб беларускім адраджэньні ён, здаецца, ня чуў, тым болей аб сучаснай беларускай літаратуры — іначай, пішучы аб бунце Нарачы не закончыў-бы пытаньнем: „ці легенда рыбацкіх пакаленьняў не ўвянчае яго ляўрам эпасу“; лёгка было-б яму, прэтэндуючаму на эрудыта і прысьвячаючаму кнігу „дачцэ Галюне дзеля пазнаньня роднага краю“, даведацца, што эпос аб нарачанскіх падзеях ужо паўстаў і аўтарам яго зьяўляецца перадавы беларускі паэт М. Танк.

Шкода, што абшарніцкія конвэнансы перашкодзілі пану Я. Мацкевічу даць шырэйшае насьвятленьне Бунту Ройстаў; яны да нікаторай меры абнізіўшы вартасьць кнігі паставілі яе на роўні рэпортажаў з заморскіх краінаў (думаем, што гэта не ляжала ў інтэнцыі аўтара) тыпу Фідлера *Рыбы сьпяваюць у Укагалі.*

А. Б—скі.

Хроніка

— 950-лецьце хрысьціянства ў Беларусі. Сёлета прыпадаюць 950-ыя ўгодкі прыняцьця хрысьціянства ў Беларусі. У чэсьць гэтага юбілею, 2-га кастрычніка, у касьцеле сьв. Мікалая ў Вільні адбылося ўрачыстае багаслужэньне, адпраўленае ў усходнім абрадзе маладым беларускім сьвяшчэньнікам а. Міхасём Маскалікам.

Аб значэньні хрысьціянства для Беларусі, для культуры і поступу чалавецтва гаварыў у сваей глыбока прадуманай пропаведзі ведамы красамоўца і беларускі культурнік а. Адам Станкевіч. Канчаючы прыгожую пропаведзь, прамоўца зьвярнуўся да а. Маскаліка—сёлета пасьвячанага ў Мюнхене — і адзначыў цяжар, ахвярнасьць, патрэбу і значэньне ягонай сьвятарскай працы для свайго беларускага народу.

Па багаслужэньні сказаў кароценькую прамову а. М. Маскалік, заклікаючы прысутных беларусаў да культурнай, на асновах хрысьціянскіх, працы для свайго народу.

Урачыстасьць закончылася адсьпяваньнем беларускага рэлігійнага гімну „Божа, што калісь народы наасобкі падзяліў”.

Заўважваем, што пропаведзь а. А. Станкевіча надрукавана асобнай брашурай.

— У сувязі з высяленьнем беларускіх айцоў Марыянаў з Друі, у летку пакінуў Вільню беларускі паэт і пісьменьнік Вінцук Адважны (марыянін а. Я. Гэрмановіч). Прабывае ён цяпер у Белянах пад Варшавай.

— Утрыманьне Беларускага Му-

зэю ў Вільні, пасьля адмовы дзяржаўных уладаў даваць на гэтую мэту субсыдыі, ад некалькі месяцаў сталася справай ахвярнасьці беларускага грамадзянства. Некалькі дзесяткаў Беларусаў, пераважна з Вільні, ападаткаваліся і даюць (перасылаюць) Музэю месячныя складкі. Заклікаем усё беларускае грамадзянства аднесьціся да справы Беларускага Музэю ў Вільні пазытыўна — і падтрымаць яго матарыяльна і маральна. Складкі можна перасылаць праз рэдакцыі беларускіх часапісаў у Вільні, у тым ліку і нашага часапісу, з азначэньнем: „на Музэй", а так-жа на адрас: Chrześcjański Bank Spółdzielczy na Antokolu, — Wilno, ul. Mickiewicza 1. (На купоне адзначыць: na rachunek Białoruskiego T-wa Naukowego).

— Ад пачатку году да канца месяца кастрычніка адведала Беларускі Музэй да 5 тысяч асоб. Зацікаўленьне Музэям усьцяж узрастае.

— У Беларускім Навуковым Т-ве адбыліся цікавыя рэфэраты: 12-га жніўня маладога ўкраінскага гісторыка праф. Т. Каструбы — на тэму „Аб паходжаньні беларускага народу", а 16-га кастрычніка д-ра Янкі Станкевіча—на тэму „Гісторыя беларускага языка".

— Рэгент Беларускага Хору ў Вільні, гр. Рыгор Шырма, будучы падчас мінулых канікулаў на паўдні Пружанскага пав. (беларуска-украінскі этнографічны рубеж) запісаў больш 40 беларускіх народных мэлёдыяў і тэкстаў, у тым ліку каля 10 калядак і шчадровак. Некаторыя песьні выражаюць асаблівасьці беларускай паганскай старасьвеччыны

— Гарманізацыі беларускіх народных песень. У папярэднім нумары „Калосься" мы падалі беларускія народныя песьні, згарманізаваныя слаўнымі ўкраінскімі кампазытарамі Александрам Кошыцам і М. Гайворонськім і прысланыя імі з Н.-Ёрку, месца прабываньня кампазытараў, Беларускаму Хору грам. Р. Шырмы ў Вільні. Нядаўна грам. Р. Шырма атрымаў ад гэтых кампазытараў новыя песьні: ад кампазытара М. О. Гайворонськага пяць: „Лявоніха", „Ой гукнула сыраежка" (жніво), „Ой, у полі дзьве птушачкі" (ракруцкая), „Як пайшоў Мікола" (валачобная), „Ой, ляцелі ды два галубочкі" (валачобная), ад кампазытара А. Кошыца дзьве песьні: „Прасьвятая Марыя" (народная калядка) і „Прыляцелі гусі".

Віленскі кампазытар праф. К. Галкоўскі згарманізаваў наступныя бел. народн. песьні: „А ў полі дуб, дуб", „Мур, мураваны", „Беларускую польку" і песьню—арыю „Ой плылі гусёлкі".

— Міхал Забэйда-Суміцкі, слаўны беларускі сьпявак, даволі часта выступае ў варшаўскім радыёфоне. У верасьні месяцы выступаў 15-га, 17-га і 21-га. Першыя дзьве аўдыцыі трансляваліся на Амэрыку. 17-га і 21-га сьпяваў так-жа дзьве беларускія народныя песьні: „Купалёнка" і „Кукавала Зязюлька". Цяпер сьпявак адбывае артыстычнае турнэ па гарадох у Польшчы.

— Дырэктар адзінай беларускае сярэдняе школы — беларускае філіі польскае дзяржаўнае гімназіі ім. Міцкевіча ў Вільні — гр. Мікалай Анцукевіч у пачатку верасьня пазбаўлены становішча і перанесены ў Ломжу на становішча вучыцеля ў польскай гімназіі.

Гэтую зьмену беларускае грамадзянства спаткала з вялікім жалем, бо дырэктар Анцукевіч быў на сваім месцы і шчыра працаваў для дабра школы.

— Максім Танк піша новую вялікую эпічную паэму. Ужо некалькі частак напісаў. Фрагмэнты сваей новай паэмы чытаў аўтар на „Інаугурацыйным вечары" Беларускага Студэнцкага Саюзу ў Вільні 22-га кастрычніка.

— Літоўскі літаратурна-мастацкі часапіс „Piuvis" („Перакрой") выданы ўлетку сёлета, амаль цалком прысьвечаны справам беларускага літаратурнага і выяўленчага мастацтва. Зьмешчаны ў ім інфармацыйны артыкул беларуса В. Тумаша аб беларускай літаратуры ў Польшчы, пераклады на літоўскую мову вершаў Танка, Машары, Васілька, Ільляшэвіча, Арсеньневай, фатаграфіі Арсеньневай, Машары, Танка, Васілька, дзьве рэпродукцыі беларускага мастака П. Сергіевіча, кароткі артыкул аб беларускім выяўленчым мастацтве пяра літоўскага мастака Дрэмы і інш., інфармацыйныя, матарыялы. Пераклады на літоўскую мову беларускіх паэтаў зрабілі віленскія літоўскія літаратары— Ганна Міцюте, Язэп Кекштас, Альбін Жукаўскас і інш.

— Асьветнае Т-ва Беларусаў у Варшаве па летніх канікулах ажывіла дзейнасьць. Амаль кожную суботу арганізуе таварыскія вечарыны з рэфэратамі, дэклямацыямі, скокамі (пад гукі беларускіх цымбалаў і гармоніка).

— З дзейнасьці Беларускага Цэнтру ў Літве. Ад кіраўнікоў аднэй з беларускіх арганізацыяў у Літве — Беларускага Цэнтру,—якога сядзіба знаходзіцца ў Каўнасе, атрымалі мы кароткія інфармацыі аб дзейнасьці гэтай арганізацыі.

Дзейнасьць Беларускага Цэнтру ў Літве за сьнежань месяц 1937 г. і першае паўгодзьдзе 1938 г. прадстаўляецца наступна:

9.XII. 1937 г. Цэнтр наладзіў публічны даклад на тэму „Рэлігійнае пытаньне ў прадваеннай Расеі на тэрыторыі Беларусі". Даклад чытаў гр. М. Дзямідаў.

30.XII. 1937 г. адбыўся агульны сход сяброў Цэнтру для перавыбараў яго ўраду. У новы Урад Цэнтру на 1938 г. выбраны: інж. К. Душэўскі—старшыня, В. Барысовіч — сэкрэтар, І. Сіротка — скарбнік, М. Спірыдовіч і Я. Ясінскі —сябры. Сходам пастаноўлена памагчымасьці часьцей рабіць публічныя выступленьні Цэнтру ў форме лекцый, канцэртаў, спэктакляў, вечарын і гэтак далей.

16.II. 1938 г. у памешканьні Цэнтру ў Каўнасе, прасп. Вітаўта № 8, адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне 20-х угодкаў незалежнасьці Літоўскай рэспублікі. Інж. К. Душэўскі прачытаў даклад на тэму „Сучасная Літва". Другая часьць праграмы сьвяткаваньня складалася з дэклямацыі і сьпеваў. Гр. гр. Б. Мотуз і З. Лівшыц артыстычна дэклямавалі творы літоўскіх і беларускіх паэтаў, а хор прыгожа выканаў некалькі беларускіх народных песень. Асаблівага адабрэньня заслугоўваюць солёвыя выступленьні гр. А. Матачовай і гр. А. Вуса.

Цэнтр наладзіў урачыстую акадэмію з нагоды 130-х угодкаў ад дня нарадзін беларускага пісьменьніка—В. Д. Марцінкевіча. Праграма складалася з двух дакладаў: інж. К. Душэўскага ў літоўскай мове на тэму „Жыцьцё і творчасьць В. Д. Марцінкевіча" і вучыцеля М. Дзямідава ў беларускай мове — на тэму „Значэньне Д. Марцінкевіча ў беларускім нацыянальным адраджэньні". У другой часьці праграмы салістка Альшэўская выканала „Ave Maria" і „Малітву", артыст З. Лівшыц прадэклямаваў выбр. мейсцы з „Гапона" і салісты гр. А. Матачова і гр. А. Кароль выканалі дуэт з „Пінскае шляхты".

Акадэмія сабрала поўную залю паважнай публікі. Праграма выканана ўрачыста і прыгожа.

25.III. 1938 г. у памешканьні Цэнтру адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне 20-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. Інж. К. Душэўскі прачытаў даклад на тэму „Роля беларускай інтэлігенцыі ў асяганьні незалежнасьці свайго народу". Пасьля дакладу выкананы хорам і солё беларускія народныя песьні і прадэклямаваны вершы вызваленчага зьместу. Акадэмія была закончана беларускім вызваленчым гімнам. Затым адбылася сяброўская вячэра ўчасьнікаў сьвяткаваньня.

5.V. 1938 г. Цэнтр наладзіў спэктакль у чэсьць 55 угодкаў жыцьця беларускага пісьменьніка, драматурга і артыста Фр. Аляховіча. Перад спэктаклям інж. К. Душэўскі сваім уступным словам схарактарызаваў жыцьцё і творчасьць юбіляра. Была прадстаўлена камэдыя юбіляра „Шчасьлівы муж". У п'есе прынялі ўчасьце найлепшыя ў Літве беларускія сцэнічныя сілы: Е. Душэўская, А. Матачова, В. Радзюкова, К. Тамкевічанка, Сакольская, Я. Ямант, З. Лівшыц, Флек, Б Мотуз і А. Плескачэўскі. Рэжысура Я. Яманта. П'еса адыграна дужа добра.

Спэктакль быў надта многалюдны. Апроч беларусаў, многа было літоўцаў.

Ад імя Цэнтру чытаюцца лекцыі ў Дзяржаўным Радыёфоне і ладзяцца даклады ў літоўскіх арганізацыях.

Цэнтр ніякімі субсыдыямі ад Літоўскага Ураду не карыстаецца і вядзе працу выключна коштам са

маахвярнасьці сваіх сяброў і прыяцеляў.

Цэнтр зарганізаваў новы беларускі народны ўнівэрсытэт.

Цэнтр мае свой ілюстраваны часапіс „Асяродак", якога вышлі ўжо 2 нумары.

— Беларускія паэты Янка Купала, Якуб Колас, Зьмітрок Бядуля, К. Крапіва, П. Броўка, П. Глебка, А. Куляшоў, М. Клімковіч пераклалі на беларускую мову збор выдатных твораў слаўнага ўкраінскага паэта Тараса Шэўчэнкі—„Кабзар". Янка Купала пераклаў паэмы „Тапаля", „Тарасава ноч", „Кацярына", „Заварожаныя", „Каўказ", „Гайдамакі", камэдыю „Сон" і інш.; Якуб Колас — шаснаццаць твораў, з якіх найбольш буйныя — „Мар'яна чараўніца", „Утопленка", „Фамілія", „Сава", „Гэрэтык", „Нявольнік" і інш.; Пятрусь Броўка—паэмы „Маскалева крыніца", „Пятрусь", „Юрадзівы", і інш.; З. Бядуля — паэму „Асіна" і чарод дробных вершаў. Чарод твораў пераклалі П. Глебка, А. Куляшоў, М. Клімковіч.

У наступным годзе прыпадаюць 125 угодкі ад дня нарадзін Шэўчэнкі. Вось-жа да гэтага юбілею перакладзеныя творы вялікага ўкраінскага паэта маюць быць надрукаваны. Апроч успомненага „Кабзара", маюць выйсьці надрукаваныя паасобныя творы Шэўчэнкі.

— Дом народнай творчасьці БССР арганізуе другую ўсебеларускую выстаўку народнай творчасьці. Ужо сабрана для выстаўкі больш 500 экспонатаў — вышыўкі, ткацтва, разьбы на дрэве, малюнкаў, жывапісі, скульптуры. Сярод экспонатаў найбольш работ лепшых ткачых і вышывальніц Б.С.С.Р.

— Беларускі сав. кампазытар Чуркін закончыў сюіту на беларускія тэмы для сымфанічнага аркестру. Ім-жа зроблена аркестроўка опэры Буглая „Радзіма кліча" для аркестра мастацкай самадзейнасьці. Кампазытар цяпер працуе над опэрай самадзейнасьці „Коксагыз" паводле лібрэта белар. сав. маладых паэтаў Жаўрука і Ушакова.

— Дзяржаўная фільгармонія БССР ад самага пачатку арганізацыі ня мае свайго ўласнага памешканьня. З гэтай прычыны ня можа яна нармальна працаваць, а сёлета ў нармальным часе пачаць канцэртнага сэзону на 1938-39 г.

— У Менску налічваецца каля 50 драматычных гурткоў. Але бяда ў тым, што дзейнасьць іх тармозіць амаль поўная адсутнасьць адпаведнага рэпэртуару, няма напр. зусім п'ес аднаактовых, скетчаў, інсцэніровак, літаратурных мантажаў; таксама тармозіць яе дзейнасьць нястача рэквізытаў, у першую чаргу касьцюмаў — нацыянальных і інш.

— 17-га кастрычніка Беларускі Дзяржаўны Тэатр опэры і балету опэрай Рымскага Карсакова „Царская нявеста" пачаў свой асеньне-зімовы сэзон.

У бліжэйшым часе тэатрам будуць паказаны: балет „Лебядзінае возера" кампазытара Чайкоўскага і опэры: „Русалка" Даргамыжскага, „Чыо-чыо-сан" і „Тоска" Пучыні, „Рыгалето" Вэрдзі і „Марная прасьцярога" Гертэля.

— Бабруйскі заатэхнікум сёлета скончылі 58 чалавек. Усе яны накіраваны камісарыятам Соўгасаў СССР на работу ў саўгасы на Сібіры, Паволжы, Украіны і ў Сярэдняй Азіі. Як-бы ў Беларусі для іх ня было месца!

— У Віцебскім Дзяржаўным Тэатры нядаўна ставілася навейшая п'еса Якуба Коласа „Вайна". Савецкая крытыка спаткала спэктакль розна: адны з крытыкаў яго зганілі, першым чынам бачучы ў п'есе ідэйна-мастацкія недахопы, іншыя далі добрую ацэну і сьцвердзілі, што выйшаў „паэтычны, хвалюючы"

Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч і мгр. Я. Шутовіч.
Рэдактар-выдавец: мгр. Ян Шутовіч.

Прысланыя кніжкі, часапісы і інш. друкі

Ateneum Wileńskie, XIII, сшыток 1. Вільня 1938
Józef Mackiewicz, Bunt Rojstów. Вільня 1938.
Juozas Kėkštas, Toks gyvenimas. Вільня 1938.
R. Mackevičius, Dvidešimt metu, 1918—1938. Вільня 1938.
Беларускі Летапіс, № № 2-3, Вільня 1938.
Złučeńnie № № 7-8, 9, 10. Варшава 1938.
Vienkartinis, Вільня 1938.
Lietuviškas Baras, № № 7, 9. Вільня 1938.
Рідна мова, ч. ч. 4—10. Варшава 1938.
Богословія, кн. 2 — 3. Львоў 1938.
Українська книга, VI—VII. Львоў 1938.
Летопис Матице српска, № 6. Новы сад 1938.
Hrvatska Revija, № № 6—10. Загрэб 1938.
Prąd, IX (t. 36). Люблін 1938.
Sprawy narodowościowe, № 1—2. Варшава 1938.
Sygnały, № № 43—55. Львоў 1938.
Kamena, № 9—10 (49—50). Хэлм Люблінскі 1938.
Oriens, № № 4, 5. Варшава 1938.
Wschód-orient, XI, № 2. Варшава 1938.
Polityka, № № 7 — 25. Варшава 1938.
Kuźnica, № № 12—20. Катовіцы 1938.
Droga pracy, № № 5—7. Крэмянец 1938.
Pax, № № 5, 6, 7, 8. Вільня 1938.
Slavia, XV, № № 3, 4. Прага 1938.
Katolik, č. č. 7—13. Прага 1938
Der Christliche Orient, № 2. Мюнхен 1839.

Ад Рэдакцыі:

Працяг паэмы „Кастусь Каліноўскі" Максіма Танка (глядзі пачатак яе ў № 1(14) „Калосься") ў „Калосьсі" друкавацца ня будзе, дзеля таго, што цалком паэма надрукавана ў зборніку Максіма Танка „*Пад Мачтай*", які выйшаў з друку ўлетку сёлета.